№ 40 (398) 29 кастрычніка 2004

www.nn.by

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я   Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Э Т А

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Праз фортку

Як рабуюць палітыкаў.

старонка 5

## Францсуаза Саган

Дзень добры, смутак.

старонка 14

## Выбары ва Ўкраіне

Юшчанка супраць Януковіча. Тэма нумару.

старонкі 8–9



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Лукашэнка не ўратаваў Хусэйна

Супрацоўніцтва рэжыму Лукашэнкі з Садамам Хусэйнам даўно было прадметам абмеркаваньня. Апублікаваны амэрыканскім урадам даклад апісвае супрацоўніцтва Багдаду й Менску па закупцы вайсковага абсталяваньня й тэхналёгій. Сцьвярджаецца, што з парушэньнем санкцыяў ААН беларускія прадпрыемствы мелі мноства кантрактаў па продажы Багдаду абсталяваньня па ракетным навядзеньні і кантролі, проціпаветранай абароне й тэхналёгіям вядзеньня электроннай вайны, а атрыманыя грошы разьмяркоўваліся між беларускімі кіраўнікамі.

Даклад быў падрыхтаваны спэцыяльным дарадцам ЦРУ ў справе ірацкай зброі масавага зьнішчэньня. Ён канстатуе адсутнасьць такой зброі, але адначасова дэталёва фіксуе вайсковыя кантакты Хусэйна. Як сьведчаць захопленыя міжнароднай кааліцыяй у Іраку дакумэнты, аб'ём нелегальнага вайсковага гандлю паміж Беларусьсю ды Іракам быў значны. Беларускі ўрад атрымаў ад Іраку каля 114 мільёнаў даляраў у якасьці аплаты. Ці не адтуль ішлі галоўныя паступленьні ў гэтак званы «прэзыдэнцкі фонд», зь якога праплачваюцца прапагандысцкія кампаніі і рэпрэсіўны апарат? Страты дзяржаўнага бюджэту ў выніку магчымых цяпер міжнародных санкцый супраць Беларусі могуць быць несувымерна большымі. І цяпер для такіх санкцый ёсьць усе падставы. Больш за тое, хто паверыць сёньня, што Лукашэнка не дапамагае вайсковым праграмам Ірану? Спробы афіцыйных асобаў з МЗС і вайскова-прамысловага камітэту зьняпраўдзіць амэрыканскую інфармацыю выглядаюць непераканаўча, як спроба адцягнуць час.

Працяг на старонцы 2.

## Сон дэмакратыі: парадаксальная фаза

Усе заганы, пашыраныя ва ўладнай вэртыкалі, — прага ўлады, хцівасьць, фанабэрыя, амаралізм — усё гэта лёгка пераліваецца ў асяродзьдзе апазыцыі. Віталь Тарас, **старонка 10.**

## Ордэн Скарыны для Прымакова

Па тым, якім чынам вырашыць Лукашэнка павіншаваць патрыярха расейскай палітыкі, можна будзе меркаваць пра цяперашні стан адносін Менску з Крамлём. **Старонка 4.**

## Дык падпісвайся

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага жыцьця на 16 старонках. Атрымлівай газэту сваёй душы штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Цана падпіскі на месяц — 2700 рублёў на поштах або 1500 рублёў на шапікі «Белсаюздруку» ў Менску.

Д З Е   В А Р Т А   Б Ы Ц Ь



## Народны помнік Быкаву

2 лістапада а 17-й гадзіне на Ўсходніх могілках адбудзецца адкрыцьцё помніка Васілю Быкаву. Калі ласка, вазьміце сьвечку ці ліхтарык. На могілках адбудзецца таксама збор сродкаў на помнік. Пакуль яшчэ не хапае 1 млн 200 тыс. рублёў, каб кампэнсаваць затраты на дастаўку і ўстаноўку.

# За крок ад рэвалюцыі

**У прэзыдэнцкай кампаніі ва Ўкраіне, як у люстэрку, можна ўбачыць, што будзе адбывацца ў Беларусі ў 2006 ці, хутчэй, у 2011 годзе. Юшчанка — гэта альтэрнатыва ня толькі Януковічу, але й Пуціну, і Лукашэнку, стылю іхнага кіраваньня. Нават зьнявечаны атрутаю, ён іх палохае. Старонка 4.**

**Што робяць на Дзяды. Старонка 2.**




## Прэзыдэнцкія выбары

ва Ўкраіне аднойчы адбываліся ў адзін тур і два разы — у два туры. У 1991 г. Леанід Краўчук разгромна перамог лідэра Народнага руху Вячаслава Чарнавола. У 1994 г. у першым туры Л.Краўчук набраў болей галасоў, чым былы прэм'ер Леанід Кучма, але ў другім туры Л.Кучма абышоў яго пры масавай падтрымцы ўсходнеўкраінскіх выбарцаў. У 1999 г. Л.Кучма выйграў у камуніста Пятра Сіманенкі ў другім туры.

На выбарах 31 кастрычніка два кандыдаты маюць шанцы на перамогу. Апошнія апытаньні грамадзкае думкі давалі Віктару Юшчанку і Ўладзімеру Януковічу па 34% галасоў. Трэцяе месца аспрэчваюць лідэры сацыялістаў і камуністаў Аляксандар Мароз і П.Сіманенка (абодва каля 7% галасоў).

## Лукашэнка ў Кіеве

27 кастрычніка А.Лукашэнка распачаў працоўны візыт у Кіеў з сустрэчай з кандыдатам-камуністам Пятром Сіманенкам.

# Што робяць на Дзяды

Зьмянілася ўсё, што магло зьмяніцца. Цуды, што зьдзіўлялі нашых продкаў, — ужо ня цуды.

Ці прылятаюць душы нашых продкаў у нашы бэтонныя дамы? Ці вяртаюцца яны туды, дзе нішто не нагадвае пра той сьвет, у якім яны былі людзьмі? Ніхто не адкажа нам. Але чакаць дзядоў трэба. Гэтак ужо павялося, і ня намі заведзены гэты парадак.

Перад Дзядамі заўжды мылі вокны начыста. З аднаго боку гэта — сакральны акт адкрываньня шляху сьвятлу й душам. З другога — цалкам практычная завядзёнка: па Дзядах зазвычай прыходзяць маразы. Вымытая й прыбраная хата з чыстымі шыбамі чакаць будзе продкаў. Мы паказаць мусім ня як жывём самі, а як шануем продкаў. Не для іх прыбіраем хаты, а для сябе перад імі, даводзячы, наколькі нам важная памяць.

На стале мусіць быць багата страваў. Яны мусяць увасабляць спрадвечныя мары беларуската пра сытасьць — сыры, кілбасы, сальцісоны, кумпякі, яечня з салам. Куцьцю запраўляюць салам або маслам, вараць халадзец, пякуць бліны. Калі-нікалі там, дзе асноўнай памінальнай стравай, апроч куцьці, лічацца клёцкі, іх вараць «з душамі», — то бок з кавалачкамі сала, мяса або фаршу ўсярэдзіне. Зрэшты, гатуюць і малыя клёцкі, што запраўляюць шкваркамі з цыбуляю й сьмятанай. Але сама надаюцца бліны, да мачанкі з раберкамі й грыбамі ці да тлустага бігасу. Можна і проста з маслам. Кавалачак такога бліна кладзём на асобную талерку дзядам. Да яго ж кладзём па кавалачку ад кожнае стравы. Справа ня ў тым, наколькі шмат і смачна мы ямо на Дзяды. Мы гэткім актам дэманструем сваю жыцьцёвасьць, трываласьць, гатовасьць жыць. Гэта акт нашае эўхарыстыі з усімі каленамі нашых продкаў. А значыць, павінна сымбалічна хапіць на ўсіх.

Хіба не абысьціся бяз чаркі. Але абавязкова й для дзядоў. І не абавязкова куляць другую й трэцюю, бо гэта таксама акт прычасьця, а не гулянка.

Надасца й сьвечка. Добра, калі з храму. Добра, калі прынесьці яе адтуль на самыя Дзяды, перажагнаўшыся па малітве за душы сваіх продкаў.

Некалі спраўлялі Дзяды Масьленыя, Мясаедныя, Стаўроўскія, Стрэчанскія, Паставыя (перад Вялікім постам). На Палесьсі дзядоў асобна памінаюць у пятніцу, а бабаў — у суботу. Шмат традыцый ужо ня вернеш. Ня кожнага разу ёсьць магчымасьць пад'ехаць на самыя магілы, а нават і на тыя нашы малыя беларускія бацькаўшчыны, родавыя котлішчы. Але заўсёды ёсьць магчымасьць пабыць сам-насам з душамі сваіх продкаў, бо душы іхныя лунаюць вольна па-над цэлым краем, па-над межамі, водамі й палямі. Як ня ведаеш ці на памятаеш, як і што рабіць на Дзяды, — то памый хату, застаў стол, запалі сьвечку. Зрабі ўсё ціха й урачыста. Памаліся ў душы, калі ўмееш. Не памылішся.

**Сяргей Харэўскі**




## **Вячаслаў Корань** адказвае на пытаньні чытачоў «НН»

Легенда беларускага року «Ўліс» сьвяткуе сваё 15-годзьдзе. Дзеля гэтай падзеі 13 лістапада ў к/з «Менск» адбудзецца вялікі канцэрт, у якім таксама возьме ўдзел гурт «Троіца» з сваім новым альбомам «Сем». А «БМА-group» перавыдае першыя тры альбомы «Ўлісу» — «Чужаніца», «Краіна доўгай белай хмары» і «Танцы на даху».

31 кастрычніка з 17.00 да 18.00 лідэр гурту «Ўліс» Вячаслаў Корань — госьць нашай газэты. Свае пытаньні можна дасылаць папярэдне на электронны адрас nn@promedia.by альбо патэлефанаваць наўпрост Вячаславу на нумары 284-73-29, 613-32-32, 707-73-29. Аўтары найбольш цікавых пытаньняў атрымаюць падарункі ад «БМА-group».

### Рэкорд nn.by

**За пэрыяды 11—17 і 18—24 кастрычніка лічба наведваньняў сайту nn.by ўпершыню перакрочыла тысячу за тыдзень (1028 і 1033). І гэта нягледзячы на тое, што 17—18-га сайт быў блякаваны разам з сайтамі іншых незалежных СМІ. 45% наведнікаў — зь Беларусі, 55% — зь іншых краінаў.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Вераніка Чаркасава

Незалежныя журналісты ў Беларусі працуюць пад ціскам, у атмасфэры страху. Забойства нашай калегі з газэты «Салідарнасьць» Веранікі Чаркасавай — чарговы выклік журналісцкай і грамадзянскай супольнасьці. Ганьба забойцам, зямля пухам Вераніцы.

### Вацлаў Іваноўскі. Нашаніўскі пэрыяд

3 лістапада ў Гістарычнай майстэрні (вул.Сухая, 25) адбудзецца выступ на тэму «Вацлаў Іваноўскі. Нашаніўскі пэрыяд». Выступоўца — гісторык Андрэй Унучак. Пачатак а 18-й.

### Шэсьце ў Курапаты

Менгарвыканкам даў дазвол на правядзеньне ў нядзелю 31 кастрычніка шэсьця і жалобнага мітынгу ў Курапатах да Дня памяці продкаў. Заяўку на правядзеньне падала КХП-БНФ. Шэсьце пачнецца ад Гадзіньнікавага заводу, што ля мэтро «Парк Чалюскінцаў», аб 11-й гадзіне.

ПОШТА РЭДАКЦЫІ

### Ні капейкі «Патыё-Піцы»

Учынак пэрсаналу менскай рэстарацыі «Патыё-піца», які, матывуючы дзеяньні «грамадзянскім абавязкам», дазволіў зьбіць у сваім памяшканьні Анатоля Лябедзьку, варты байкоту. Справа тут не ў апазыцыйнасьці, а ў элемэнтарнай чалавечай прыстойнасьці й самапавазе. Заклікаю ўсіх, для каго гэтыя словы — не пустыя гук, у «Патыё-Піцу» не хадзіць. У іншых месцах сталіцы, думаю, кормяць ня горай.

**Вацлаў Зьвяруга, Мядзел**

РЭПЛІКА

## Хто каму прайграў

Часам здаецца, што нашы апазыцыйныя СМІ і палітыкі стаяць у апазыцыі не да лукашызму, а да аптымізму.

З падліку галасоў па-беларуску кпілі СМІ ўсяго сьвету, уключна з расейскімі, а такія стрыманыя палітыкі, як Бэлька й Цапф, назвалі гэта дзікім фарсам. Людзі масава галасавалі «за Беларусь» і «супраць Лукашэнкі», нягледзячы на дасканалую сыстэму замбаваньня і запалохваньня.

Толькі беларуская апазыцыя гэтага не заўважае, а глядзіць БТ, п'е валяр'янку і абмяркоўвае па навінах.by, «чаму мы 17 кастрычніка прайгралі». Той самы падтэкст прачытваецца ў словах Анатоля Лябедзькі: «Я думаю, мы зможам выбраць нашую альтэрнатыву з моцнай камандай, і 2006 год мы не павінны прайграць». З такімі ўстаноўкамі яшчэ 100 гадоў змагацца з рэжымам. Галоўнае — удзел…

Лідэры пяцёркі апазыцыйных партый канстатавалі: пры Лукашэнку выбараў больш ня будзе. Сказаўшы «А», трэба наважыцца і на «Б» — новая стратэгія апазыцыі мусіць быць адэкватнай гэтай жорсткай рэальнасьці.

**Барыс Тумар,** tumar@tut.by

## На элітарнай мове

**Мэнэджэр па маркетынгу кампаніі «Самсунг» у Беларусі Алена Ранцэвіч аб выкарыстаньні беларускай мовы ў рэкляме сваіх тэлефонаў: «Можна сказаць, што ў нашай краіне беларуская мова больш элітарная, чым расейская. Валоданьне гэтай моваі зьяўляецца прадметам раскошы і гонару, як і валоданьне мабільным тэлефонам «Самсунг». Беларускі спажывец адчувае, што зьвяртаюцца менавіта да яго. Апрача таго, беларуская мова адрозьнівае нас ад канкурэнтаў, гучыць яскрава, прыметна, хоць нярэдка выклікае двайстае стаўленьне».**

**Паводле Naviny.by**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**На фота: Рэкляма канкурэнтаў «Самсунгу» з «Мацушыта электронікс»**

# Лукашэнка не ўратаваў Хусэйна

**Працяг са старонкі 1.**

Цяперашняя лінія замежнай палітыкі зыходзіць нібы з адной думкі — усё, што на шкоду Захаду, на карысьць Беларусі. Сяброўства з Сырыяй, Суданам, адкрыцьцё амбасады Палестыны замест дыпламатаў Ізраілю, што зьехалі, — лягічны ланцуг. Чым больш адыёзныя рэжымы й чым болей яны крытыкуюць заходнім сьветам — тым большае разуменьне й падтрымку яны знаходзяць у Менску. Натуральна, такі замежнапалітычны сьверб ня можа быць бескарысьлівым. Ня можа быць і бясьпечным. Выяўленыя факты беларускае дапамогі Хусэйну, скіраванае супраць ЗША, пераводзяць Беларусь у шэраг адкрытых непрыяцеляў Вашынгтону.

Менскія хітруны не ўратавалі сваёй дапамогаю Хусэйна. Затое цяпер беларускім кампаніям наагул ня будзе месца ў Іраку. А Беларусь у вачах цывілізаванага сьвету цяпер трывала асацыюецца з шэрагам тых самых рэжымаў, якім не падаюць рукі ў прыстойных кампаніях.

**Гары Куманецкі**

### Урыўкі з дакладу ЦРУ, у якіх гаворыцца пра супрацу Беларусі з Хусэйнам

Паводле ацэнкі ў справаздачы, беларускі прэзыдэнт Лукашэнка і Садам мелі асаблівыя ўзаемаадносіны. Лукашэнка пагадзіўся падтрымаць Садама таму, што ірацкі прэзыдэнт падтрымаў прэзыдэнцкія выбары ў Беларусі 2001 г.

Асобы з Украіны, Беларусі й Расеі, якія, паводле Багдаду, зрабілі асабліва важкі ўнёсак у справу бясьпекі Іраку, па загадзе Садама атрымлівалі долю ад продажу нафты. Сярод беларускіх атрымальнікаў у справаздачы фігуруюць Віктар Шаўцоў, дырэктар «Інфабанку»; Юры Шаброў, дырэктар «БелФарму»; Аляксандар Рабатай, афіцэр адной зь беларускіх спэцслужбаў.

Вось што сьцьвярджаецца ў дакладзе:

Прэзыдэнт Беларусі Аляксандар Лукашэнка пасьлядоўна падтрымліваў палітычную пазыцыю і патрэбы абароны Іраку. У верасьні 2002 году Лукашэнка сустрэўся з прадстаўнікамі міністэрства фінансаў і Камісіі па вайсковай прамысловасьці, каб абмеркаваць вайсковае супрацоўніцтва. **На гэтай сустрэчы Лукашэнка выказаў жаданьне падтрымаць Ірак і пасланнць экспэртаў па процiпаветранай абароне, каб памагчы Іраку супрацьстаяць ЗША.**

Ключавыя асобы зь Беларусі, зьвязаныя зь незаконным гандлем з Іракам:

**Уладзімер Замяталін**, **Леанід Козік**, **Мікалай Іваненка** – намесьнікі старшыні прэзыдэнцкай адміністрацыі і старшыні зь беларускага боку ў ірацка-беларускім камітэце па эканамічным супрацоўніцтве. **Віталь Харлап** – беларускі міністар прамысловасьці. **Прафэсар Кандрынко** (?) – дырэктар аддзелу камунікацый канцэрну «Агат». Ён вёў перамовы зь дзяржаўнай кампаніяй «Салах Ад-Дзін» і заключыў шмат кантрактаў па вытворчасьці камунікацыйнага абсталяваньня. **Прафэсар Клашко** – навуковец, які ўзначальваў аддзел тэлемэтрычных сыстэм для ракетаў «зямля-зямля» і заключыў шмат кантрактаў з Камісіяй па вайсковай прамысловасьці.

**Працяг на старонцы 10.**

# Сымптомы



## Алесь Аркуш

**Ніколі яшчэ паспалітыя беларусы ня ставіліся так прыязна да прадстаўнікоў дэмакратычнай апазыцыі, як цяпер. Апазыцыя мабілізавала пратэстны электарат, які паверыў ёй і пачаў дэманстраваць сваю нязгоду канкрэтнымі ўчынкамі.**

Ці быў удзел апазыцыі ў выбарах «мартышчынай працай»? Можа, і праўда варта было «Пяцёрцы+», «Эўрапейскай кааліцыі» і Севярынцу з кампаніяй далучыцца да кэхэпэшнага байкоту? Усё адно, маўляў, мелі б тыя самыя вынікі.

Не, ня тыя. Вынікі мінулай выбарча-рэфэрэндумнай кампаніі не такія ўжо і кепскія. Апазыцыя прымусіла ўладу пайсьці на масавую фальсыфікацыю падліку галасоў. Вэртыкаль перастаралася. Лічбы абсалютна нерэальныя. Апазыцыя мабілізавала пратэстны электарат, які паверыў ёй і пачаў дэманстраваць сваю нязгоду канкрэтнымі ўчынкамі. Павязаныя па руках і нагах кантрактнай сыстэмай і застрашаныя папярэджаньнямі аб звальненьнях, людзі выказвалі свой пратэст у кабінках для галасаваньня. Яны добра ведаюць, што іх, нязгодных, было больш.

На ідэалягічнай гадзіне ў клясе майго сына пачалася спрэчка вучняў з настаўніцай, якая казала, што вынікі выбараў і рэфэрэндуму праўдзівыя, а вучні не згаджаліся: ня можа гэтага быць. Тады мой сын і кажа: кожны з нас амаль дакладна адлюстроўвае погляды бацькоў, і дзе тыя больш як 70 адсоткаў, хто галасаваў «за» ў нашай клясе? Гэта

# Паліткарэктура

## Экспэртная рада ВАКу аднавіла цэнзуру тэмаў дысэртацый

**Падзелы Рэчы Паспалітай — тэма «русафобская». Вялікага князя Альгерда не вывучаць, бо пры ім адбываліся паходы на ўсход. А пісьменьнік Уладзімер Арлоў — «адыёзная і няправільная асоба». Уладзімер Міхнюк перад сьмерцю: «Я раскажу пра людзей з вэтэрынарнымі дыплёмамі, якія лезуць кіраваць гісторыяй».**

Вайна супраць гісторыкаў і літаратурзнаўцаў пачалася зь перапісваньня падручнікаў у сярэдзіне 90-х. Цяпер ваенныя дзеяньні перайшлі ў фазу забароны асобных тэмаў для дысэртацый і табу на некаторыя імёны. Фільтрам для «некарэктных тэмаў» стала экспэртная рада Вышэйшай атэстацыйнай камісіі (ВАК), якую ўзначальвае Яўген Новік.

Менавіта з падачы ВАКаўскіх экспэртаў не была залічана доктарская дысэртацыя Алеся Пашкевіча. Пашкевічава праца была толькі першай ластаўкай. Наступнымі «ахвярамі» сталі гісторыкі. Агульная схема выглядае так: навукоўцы пішуць дысэртацыі (кандыдацкія й доктарскія), абараняюць іх, а ВАК не зацьвярджае абароны.

Самым скандальным выпадкам апошняга часу стала кандыдацкая дысэртацыя супрацоўніцы Берасьцейскага ўнівэрсытэту Сьвятланы Навумук «Кастусь Езавітаў. Жыцьцёвы шлях і дзейнасьць». Тэму ейнага дасьледаваньня без пытаньняў зацьвердзілі ў Берасьці. Абараняла дысэртацыю яна ў Белпэдунівэрсытэце ў Менску. Абаранілася выдатна: з 10 сяброў рады па абароне 9 прагаласавалі «за». Аднак экспэртная рада ВАКу выступіла супраць. Не дапамагло нават тое, што праца была напісана ў вельмі асьцярожных выразах. Маладой дасьледніцы заявілі, што Езавітаў ня тая асоба, пра якую можна пісаць кандыдацкую. Я.Новік нават заявіў, што Сьвятлану нельга дапускаць да выхаваньня моладзі, калі яна лічыць, што Езавітаў — нацыянальны дзяяч, а ня здраднік.

З Уладзімерам Міхнюком, навуковым кіраўніком спн.Сьвятланы, мы размаўлялі пры канцы верасьня. «Пачакайце, калі ласка, з публікацыяй, — узрушана казаў гісторык. — Цяпер разглядаецца наша апэляцыя. Вось дадуць адказ, тады я адкажу на ўсе пытаньні й раскажу пра людзей з вэтэрынарнымі дыплёмамі, якія лезуць кіраваць гісторыяй». Для самога Міхнюка абарона ягонай асьпіранткі абярнулася зусім кепска. Яго кандыдатуру прапаноўвалі на пасаду дырэктара акадэмічнага Інстытуту гісторыі. Кажуць, нават быў ужо падпісаны загад на прызначэньне, і папярэдні в.а. дырэктара Мікалай Сташкевіч выносіў рэчы з кабінэту. Але ў той самы дзень загад скасавалі: вырашылі, што такі навуковец ня можа кіраваць установай. Прэтэндэнту на высокую пасаду Міхнюку давялося шукаць сабе месца працы ў недзяржаўным сэктары — ён уладкаваўся ў прыватны інстытут правазнаўства. Відаць, гэты выпадак адыграў немалую ролю ў тым, што ў сярэдзіне кастрычніка У.Міхнюк раптоўна памёр.

Што будзе цяпер рабіць С.Навумук, ня ведае і яна сама: «Параіцца з кіраўніком я не пасьпела. Ёсьць такое правіла, што незалічаную дысэртацыю можна перапрацаваць і зноў абараніць, падаць у ВАК. Але што я магу зрабіць, калі ў ВАКу не падабаецца сама тэма майго дасьледаваньня?»

Доктарская дысэртацыя супрацоўніка Інстытуту гісторыі Яўгена Анішчанкі, абароненая ў траўні 2004 г., цяпер таксама ляжыць на разглядзе ў ВАКу, і ёсьць вялікая імавернасьць, што яна зьведае такі



А.АРЛОЎ. ПАМЕЖНІК І КАЛГАСНІЦА.

ж лёс, як праца Навумук. У Анішчанкі, спэцыяліста па пэрыядзе падзелаў Рэчы Паспалітай, праблемы пачаліся яшчэ ў пэрыяд абароны дысэртацыі. У Інстытуце гісторыі яму абараняца не рэкамэндавалі, бо дасьледаваньне па гэтым пэрыядзе, маўляў, будзе глядзецца «русафобскім». Варта зазначыць, што гісторык абапіраецца выключна на архіўныя дакумэнты і мае 9 навуковых прац, выдадзеных асобнымі кнігамі. Аднак і гэта наўрад ці дапаможа: паводле зьвестак «НН», на кіраўніка рады па абароне, якая залічыла Анішчанку доктарскую дысэртацыю, пачаўся ціск.

Паасобныя выпадкі ўжо складаюцца ў сыстэму. У Інстытуце гісторыі нават ня сталі зацьвярджаць кандыдацкай дысэртацыі, прысьвечанай палітыцы Альгерда. А што паробіш, калі ўся палітыка гэтага князя — экспансія на ўсход?! Зь цяжкасьцю «праскочыла» праз ВАКаўскае рэшата дысэртацыя, прысьвечаная напалеонаўскай вайне 1812 г. Аўтару закідалі, што ў працы ніводнага разу вайна не названая «Айчыннай». Довады, што для Беларусі вайна была не «Айчыннай», а хутчэй грамадзянскай (бо жыхары краю ваявалі на абодвух баках), не браліся пад увагу.

Марна думаць, што «забароненыя тэмы й імёны» існуюць толькі ў гісторыкаў. Прыклад Пашкевіча змусіў задумацца літаратуразнаўцаў. «НН» вядомыя, прынамсі, два выпадкі «паліткарэктуры», якія адбыліся апошнім часам у менскіх ВНУ. У першым зь іх асьпіранты паралі на навуковай радзе памяняць тэму дасьледаваньня. Навуковая рада палічыла Ўладзімера Арлова (менавіта ягоную творчасьць мелася вывучаць дасьледніца) занадта адыёзнай і «няправільнай» асобай. Дзяўчыне рэкамэндавалі ўзяць больш шырокую тэму — беларускую гістарычную літаратуру. Афіцыйнае тлумачэньне: ня варта пісаць працу паводле творчасьці пісьменьніка, калі гэта ня клясык і не хрэстаматыйны аўтар.

У другім выпадку дасьледніца сама памяняла тэму: яна мелася пісаць дасьледаваньне па творчасьці Натальлі Арсеньневай. Рашэньне высьпела ў яе пасьля таго, як на літаратуразнаўчай канфэрэнцыі ў траўні 2004 г. з выступу аднаго «літгенэрала» дзяўчына пачула, што ў паэткі «рукі ў крыві»…

Забарона на тэмы й імёны — трывожны сымптом чаргова вітка панявольваньня гуманітарнае навукі. Навукоўцы могуць па-рознаму ацэньваць тыя ці іншыя падзеі, тых ці іншых асоб. Пакуль дапускаюцца спрэчкі паміж прыхільнікамі розных канцэпцый, разьвіваецца й навуковая думка. ВАК выбраў мэтады таталітарнага грамадзтва, што ўзмацніць дэградацыю гуманістыкі.

**Аркадзь Шанскі**

---

# разняволеньня*

павінна быць амаль аднадушная падтрымка. Ды няма і 20 адсоткаў!

Гэта заўважаюць нават дзеці.

А цяпер паглядзім, што гэта за людзі, якія галасавалі «супраць»? Цьвет і падмурак нацыі — інтэлігенцыя, навукоўцы, дзеячы культуры, інжынэры, прадпрымальнікі, работнікі высокай кваліфікацыі, студэнты. Менавіта на гэтых людзях трымаецца жыцьцё Беларусі. Менавіта яны вызначаюць перспэктыўнае разьвіцьцё краіны. А.Р. цяпер ня іх прэзыдэнт, бо яны ўжо адракліся яго. Ён не зьяўляецца ані сымбалем прагрэсу, ані гарантам законнасьці, ані узорам маральнасьці. І выбары з рэфэрэндумам сталіся апошняй кропляй трываньня-ваганьня.

Лушашэнка — прэзыдэнт бедных. Але беднымі жадае быць усё менш і менш беларусаў.

Ніколі яшчэ паспалітыя беларусы ня ставіліся так прыязна да прадстаўнікоў апазыцыі, як цяпер. Гэта я адчуваю нават па тым, як са мной вітаюцца суседзі па пад'езьдзе — з падкрэсьленай павагай. Зусім іншая сытуацыя была на мінулых прэзыдэнцкіх выбарах.

Цяпер апазыцыя мусіць гэтую павагу ператварыць у падтрымку. Трэба прыглядзецца да гэтых простых, звычайных беларусаў. Пачуць іх. Расказаць пра іх. Дапамагчы ім. Зрабіць так, каб яны паверылі ў свае сілы, згадалі пра сваю годнасьць.

Пасьля таго як пазбавілі рэгістрацыі Леру Сом, мне пазваніла пэнсіянэрка-палачанка і папрасіла: дапамажыце, больш няма да каго зьвяртацца.

Іншыя камэнтары і меркаваньні — **старонкі 10—11.**

* Разьнявалены — той, хто дзейнічае, жыве, існуе без прымусу, без прыгнёту; той, хто вольны.

---

### Працэс Жураўковай

У Вярхоўным судзе распачаўся працэс Галіны Жураўковай, былой кіраўніцы справаў прэзыдэнта. Супраць дае паказаньні яе хаўрусьнік Аляксандар Мурашка, — піша «БДГ». Зь іх вынікае, што пры заключэньні цукровых здзелак фірмы-пастаўніцы абавязвалі вяртаць частку атрыманых грошай ($4—8 за кожную тону) наяўнымі ці на афшорныя рахункі Г.Жураўковай і яе хаўрусьнікам. Такім чынам Г.Жураўкова атрымала ня менш за $2 млн. Манаполію на пастаўку цукру, цыгарэтаў і нафты ў краіну «Белая Русь» атрымала паводле ўказаў А.Лукашэнкі.

### Ерын адпачывае

Кіраўнік дзяржавы з 20 кастрычніка адправіў старшыню КДБ у «бестэрміновы адпачынак». Паводле нязіральнікаў, да працы ён болей ня вернецца. Сярод прэтэндэнтаў на пасаду разглядаецца цяперашні в.а. абавязкаў старшыні — Сьцяпан Сухарэнка, які лічыцца «чалавекам Шэймана». Ерын лічыўся прыяцелем Латыпава і Тозіка.

### Нямецкія візы атрымаць цяжэй

МЗС Нямеччыны запатрабавала ад усіх сваіх 194 консульстваў узмацніць кантроль пры выдачы візаў. МЗС у сваёй інструкцыі раіць не выдаваць візы падазроным асобам. Прычынай адмовы можа быць найменшае падазрэньне работніка візавай службы, што дэкляраваная мэта візыту не адпавядае праўдзівай.

### Літаратуру далучылі да міталёгіі

На філфаку БДУ катэдру беларускай літаратуры ХХ ст. аб'ядналі з катэдрай гісторыі культуры. Незадаволеныя тлумачаць гэта імкненьнем заціснуць навуковую дзейнасьць асяродку, да якога належыць старшыня Саюзу пісьменьнікаў Алесь Пашкевіч. Дэкан філфаку Іван Роўда тлумачыць зьліцьцё рэструктурызацыяй БДУ. Кіраваць новай катэдрай мае Тацяна Шамякіна.

### Хто абароніць беларускае

Сярод васьмі кандыдатаў у савет рэспублікі ад Менску — два абаронцы беларускае культуры. Гэта дырыжор Міхаіл Фінбэрг (быў і ў мінулым складзе) і рэктарка Лінгвістычнага ўнівэрсытэту Натальля Баранава (упершыню).

### Польскае МУС крытыкуе беларускіх калегаў

Польскае МУС спыніла супрацу паміж польскай Вышэйшай школай паліцыі й Акадэміяй МУС Беларусі праз 12 дзён пасьля падпісаньня пагадненьня. Міністар унутраных справаў і адміністрацыі Польшчы Рышард Каліш заявіў, што супраца немагчымая, пакуль беларуская міліцыя зьбівае мірных дэманстрантаў, што змагаюцца за дэмакратычныя свабоды ў Беларусі.

### Чатыры сыны за раз

У сям'і Алены і Чэслава Шамрэяў зь Менску нарадзіліся адразу 4 хлопчыкі. Да гэтага сям'я мела 5-гадовага сына. Апошні раз 4 дзіцяці за раз нараджаліся ў Беларусі 10 гадоў таму. У 2003 г. у Беларусі нарадзіліся 682 двойні і 1 тройня.

### Новыя місіянэры ў Парыжы

Каталіцкі касьцёл у нядзелю пачаў агітацыйную кампанію ў Парыжы дзеля вяртаньня цікавасьці да рэлігіі. Тысячы вернікаў маюць чытаць лекцыі ў кавярнях, парках і на вуліцах. Кампанія «гарадзкая місія» пачалася летась у Вене ў рамках пяцігадовай кампаніі, на якую паблаславіў Папа Ян Павал ІІ.

**АВ, ВР; БелПАН, gazeta.pl**

# Украіна за крок ад рэвалюцыі

**Працяг са старонкі 1.**

Той, хто ў 1996 г. браў удзел у Дні Волі, ведае, што такое энэргетыка шматтысячнага мітынгу. Уявіце сабе гіганцкую плошчу Лесі Ўкраінкі, падобную да аранжавага мора. Аранжавы — колер кампаніі былога ўкраінскага прэм'ера. На мітынгу — спрэс маладыя твары. А на трыбуне Віктар Юшчанка — на 20 гадоў старэйшы за сябе ж на вялікім транспаранце. Ягоны твар усё яшчэ нясе страшныя адбіткі таямнічага атручваньня, ад якога Юшчанка так да канца і не акрыяў.

Хто й чым атруціў? Невядома. Народны тэлеграф перадае, што таямнічая хвароба распачалася пасьля размовы з намесьнікам кіраўніка СБУ, у часе якой Юшчанку прапанавалі кілішак закарпацкага каньяку. Але гэта чуткі, а сапраўдныя выканаўцы тайнае апэрацыі невядомыя. Журналісты разыходзяцца ў ацэнках таго, хто быў замоўцам — штаб Януковіча, атачэньне аднаго з алігархаў ці наўпрост расейскія спэцслужбы і адпраўленыя імі ва Ўкраіну паліттэхнолягі. Самому Януковічу наўрад ці ёсьць карысьць браць на сябе такі грэх перад выбарамі, зыход якіх далёка не вядомы. А мо гэта была спэцслужба іншае дзяржавы, якой нявыгадны прыход Юшчанкі да ўлады? Алігархічныя СМІ, што спачатку ўкідвалі вэрсію пра «атручваньне сушы і чырвоным вінам, якія складалі асноўную дыету Юшчанкі», цяпер пераключыліся на адналькава праўдападобную вэрсію пра «абвастрэньне герпэтычнае інфэкцыі», вылучаную паслухмянай Януковічу камісіяй Вярхоўнае Рады.

На плошчы Лесі Ўкраінкі месьціцца Цэнтравыбаркам. І ў нас 100 тысяч сабралася б, каб дазволілі сабрацца ля Цэнтравыбаркаму, а не на Бангалоры. Усё тое, што я назіраю ў сталіцы Ўкраіны, можа паўтарыцца і ў нас, як толькі прагрэсіўныя сілы вылучаць моцнага кандыдата ў прэзыдэнты, — будуць і мітынгі, і атручваньні.

Аранжавы колер кампаніі Юшчанкі




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

выбраны, каб не палітызаваць нацыянальны жоўта-блакітны сьцяг. Але адначасова гэта мае на мэце прыцягнуць камуністычны і сацыялістычны электарат кандыдатаў-аўтсайдэраў — Пятра Сіманенкі і Аляксандра Мароза. І Юшчанка, і Цімашэнка нястомна зьвяртаюцца да левага электарату: «Пасьля нашай перамогі мы спынім злачынную прыватызацыю, мы нікому не дамо прадаць зямлю», — абяцае палкая аратарка Юлія Цімашэнка на мітынгах. Яна пераяжджае з райцэнтру ў райцэнтар, гэтым юшчанкаўцы імкнуцца кампэнсаваць недаступнасьць тэлеэфіру. Праграма Юшчанкі сацыяльнаскіраваная па сваёй сутнасьці, ягоная кааліцыя называецца «Сіла народу». Але хвароба Юшчанкі перабіла графік перадвыбарнага турнэ.

Багатая агітацыя дзейнага прэм'ера Віктара Януковіча вытрымана ў сініх тонах — пікеты, плякаты, бігборды. Януковіч мае грошы, шмат грошай. Ён купляе найлепшае. Ягонай прэс-сакратаркай стала кіраўніца кіеўскага бюро радыё «Свабода». На засмучэньне інтэлігенцыі, яго падтрымалі сыны Вячаслава Чарнавола, а вядомы львоўскі палітоляг Косьць Бандарэнка напісаў кнігу пра «сапраўднае аблічча ўраду Юшчанкі», якую цяпер праваднічкі раздаюць пасажырам у цягніках. «Усё купляецца», — вось што тэхнолягі Януковіча хочуць даказаць насельніцтву. Іх супэрзадача — не дапусьціць рамантычнага ўздыму людзей.

Украіна — самая дэмакратычная і празаходняя краіна СНД пасьля Грузіі. Ці застанецца яна такою пасьля выбараў? У пачатку 90-х Народны рух Чарнавола супрацоўнічаў з экс-камуністам Краўчуком, у канцы — зь «меншым злом» Кучмам. Тады праэўрапейскія сілы ня мелі свайго лідэра і шанцаў на перамогу, але, будучы ў меншасьці, аказвалі вырашальны ўплыў на ўкраінскую палітыку. Сёньня нацыянал-дэмакраты замахнуліся на ўладу. Тым самым яны паклалі ўсе яйкі ў адзін кошык. Украіна блатногаданяччаніна Януковіча можа аказацца занадта марознаю для эўрапейцаў. Найлепшыя інтэлектуалы і артысты Ўкраіны ад пісьменьніка Юр'я Андруховіча да сьпевака Алега Скрыпкі згуртаваліся вакол Юшчанкі. Але шанцы экс-прэм'ера на перамогу застаюцца 50 на 50: адміністрацыйны апарат і дзяржаўныя СМІ працуюць на ўладу.

Алігархічныя кланы пачалі звужаць прастору дэмакратыі. Абсяг вяшчаньня адзінага незалежнага ад алігархаў «Пятага каналу» абмяжоўваецца, у офісах недзяржаўных арганізацый ідуцьператрусы. Януковіч выкарыстоўвае Лукашэнкавы ноў-хаў дзесяцігадовай даўніны, якія прывялі да міжнароднай ізаляцыі Беларусі, штурхнулі краіну ў абцугі Расеі і выклікалі раскол грамадзтва. У падзеленай на Захад і Ўсход Украіне гэта можа мець катастрафічныя вынікі.

«Чаму мы так жывём? Бо ў краіне — бандыцкая ўлада! Гэтая нацыя дзеліцца на бандытаў і сумленных людзей! Але ня верце таму, што выбары робяцца на сходняках. 31 кастрычніка — гэта адказ, перамогуць ва Ўкраіне сумленныя людзі ці на дзясяткі гадоў тутака будзе дыктатура», — такое дзэдэалягізаванае пасланьне нясе Юшчанка з трыбуны мітынгаў.

**Працяг на старонцы 9.**

# Прымакова чакае Скарына

Раман Якаўлеўскі

29 кастрычніка спаўняецца 75 год з дня нараджэньня Яўгена Прымакова. З гэтай нагоды ў расейскіх і іншых СМІ зьявіліся рознага роду матэрыялы. Біяграфія юбіляра і ягоная палітычная кар'ера настолькі насычаны цікавымі падзеямі, што пісаць і гаварыць пра Прымакова-журналіста, разьведчыка, вучонага, дыпляната і выдатнага палітыка ўяўляецца справай ня вельмі цяжкай. Аднак, думаецца, наўрад ці ў вялікай замежнай прэсе можна будзе сустрэць у гэтыя дні апісаньні ролі Прымакова ў расейска-беларускіх адносінах часоў Лукашэнкавага праўленьня. А роля гэтая вельмі значная.

Калі ў Беларусі здарыліся першыя прэзыдэнцкія выбары, Яўген Прымакоў быў дырэктарам Службы замежнай разьведкі (СЗР). Агульнавядома, што ў бытнасьць Прымакова на гэтай пасадзе ў СЗР узмацнілася інфармацыйна-аналітычная сфэра дзейнасьці. І там наўрад ці маглі прамаргаць прыход у 1994 г. да ўлады ў Беларусі звычайнага дырэктара саўгасу з дэпутацкім мандатам, які пэрыядычна шумеў у Авальнай залі беларускага парлямэнту. Пасьля першага рэфэрэндуму ў траўні 1995 г., які адмяніў нацыянальную сымболіку і абвясьціў інтэграцыю з Расеяй, Васіль Быкаў неяк сказаў, што беларусы выбралі рэзыдэнта, а не свайго прэзыдэнта. Што да замежнай палітыкі, дык Лукашэнка ўзяў выразны антыамэрыканскі, антызаходні курс. І ўзяўся разьвіваць цесныя стасункі з рэжымамі краін арабскага Ўсходу. Такая палітыка цалкам адпавядала сьветаадчуваньню Прымакова, які зрабіўся ў студзені 1996 г. міністрам замежных спраў Расеі ў кабінэце Віктара Чарнамырдзіна. Узначаліўшы МЗС, Прымакоў на ўвесь голас стаў прапагандаваць ідэю шматпалярнага сьвету ў процівагу амэрыканскай гегемоніі. У рыторыцы на гэтую тэму менскія стратэгі стараліся яму не саступаць. Праўда, у адрозьненьне ад свайго прэм'ера, Прымакоў восеньню 1996 г. у Менску не зьяўляўся. У Беларусі добра памятаюць, як Чарнамырдзін са сьпікерамі абедзьвюх палат расейскага парлямэнту здалі пасьля другога рэфэрэндуму наіўнага старшыню Вярхоўнага Савету Шарэцкага, які так спадзяваўся тады на дапамогу Масквы ў справе ўціхамірваньня Лукашэнкі. Дасьведчаныя людзі кажуць, што да беларускага «мюнхену» прычыніўся і аўтарытэтны кіраўнік расейскага МЗС.



**Па тым, якім чынам вырашыць Лукашэнка павіншаваць патрыярха расейскай палітыкі, можна будзе меркаваць і пра цяперашні стан адносін Менску з Крамлём.**

Трэба меркаваць, даволі моцны прыліў энтузіязму Лукашэнка адчуваў, калі Прымакоў зрабіўся прэм'ер-міністрам. Пры гэтым мала хто памятае, што яго кандыдатуру прапанавала фракцыя «ЯБЛык». Яўлінскі і ягоныя паплечнікі ніколі ня мелі сымпатый да Лукашэнкі. Тым ня менш, беларускі дыктатар усё часьцей стаў называць Прымакова сваім настаўнікам.

Як жартавалі дыпляматы, відаць, антыамэрыканскі Прымакоў і навучыў Лукашэнку таму, каб той выгнаў заходніх, а заадно і астатніх паслоў зь іх рэзыдэнцый у Драздах. Гэта ўжо пазьней, падчас югаслаўскага крызісу, Прымакоў сам калямбурыў, разварочваючы ў небе самалёт, які ляцеў у Вашынгтон. А ягоны беларускі вучань і наагул асабіста лётаў у Бялград да асуджанага Мілошавіча. Што зрабілася потым з гэтых салідарысцкіх намаганьняў, вядома. Мілошавіча перавезьлі ў Гаагу, а Ельцын груба перамясьціў Прымакова з маскоўскага Белага дому на пэнсію. Менавіта ўзроставыя параметры патрыярха расейскай палітыкі Прымакова, якому прадказвалі і прэзыдэнцкае крэсла, цалкам задавальнялі Лукашэнку, што імкнуўся за Прымаковым туды ж, у Крэмль.

Пайшоўшы на грамадзкую работу ў якасьці прэзыдэнта, але Гандлёва-прамысловай палаты, Прымакоў усё ж заставаўся чаканым госьцем у Менску. І ён сапраўды спрабаваў гуляць ролю настаўніка маладога беларускага прэзыдэнта. Пра гэта яго ўжо прасіў новы гаспадар Крамля Пуцін, якому асабістыя зносіны зь беларускім калегам рабіліся ўсё больш пакутлівымі. Але пасьля сваёй «элегантнай» перамогі на прэзыдэнцкіх выбарах 2001 г., падобна, Лукашэнка перастаў мець патрэбу ў названых настаўніках. Кажуць, у гэтым пераканаўся і Прымакоў пасьля сваёй апошняй сустрэчы з Лукашэнкам у менскім Чырвоным доме. Тым ня менш, некаторыя маскоўскія крыніцы сьцьвярджаюць, што Прымакоў застаецца ў ролі наглядчыка за Беларусьсю, рэгулярна выкладваючы Пуціну свае меркаваньні, прагнозы наконт будучыні Лукашэнкі. Недзе з гэтым, відаць, і зьвязана адно неардынарнае Лукашэнкава рашэньне.

У сувязі з 60-годзьдзем з дня нараджэньня ў жніўні гэтага году беларускім ордэнам Францыска Скарыны быў узнагароджаны Вячаслаў Трубнікаў, найбліжэйшы таварыш і пераемнік Прымакова ў СЗР. Малаімаверна, каб аналягічнага гонару не ўдастоіўся і сам Прымакоў. У адваротным выпадку гэта можа быць успрынята як помста Лукашэнкі за так і не атрыманы ім на сваё 50-годзьдзе жаданы ордэн Андрэя Першазванага. Пуцін застаўся глухі да хадайніцтваў за 50-гадовага юбіляра.

# Замест Успаскіх вяртаецца Ландсбэргіс

**Папулістам не ўдалося здабыць большасьці месцаў у літоўскім Сойме. Трэцяй палітычнай сілай Літвы сталі нацыянал-кансэрватары Кубілюса-Ландсбэргіса.**

Літоўскага мільянэра расейскага паходжаньня Віктара Ўспаскіх традыцыйным партыям удалося спыніць «пад Мажайскам». Ягоная Партыя працы атрымала 39 мандатаў у 141-мясцовым Сойме. Такі вынік двух тураў парлямэнцкіх выбараў, што адбываюцца ў нашых суседзяў паводле мажырытарна-прапарцыйнай сыстэмы, калі частка дэпутатаў абіраецца ад партыйных сьпісаў, а іншая — у аднамандатных акругах. Усе папулісцкія партыі разам атрымалі 59 месцаў. Яшчэ 11 мандатаў прыхільнікі імпічментага прэзыдэнта Паксаса і 9 — Сялянская партыя Казімеры Прунскенэ. Гэтага мала, каб сфармаваць урад, а традыцыйныя партыі гатовыя забыцца аб права-левым расколе, абы не дапусьціць у міністэрскія крэслы папулістаў.

Прэм'ерам Літвы, напэўна, застанецца вэтэран палітыкі Альгірдас Бразаўскас, але частка партфэляў на гэты раз дастанецца кансэрватарам, якіх узначальвае Андрус Кубіліус, і правым лібэрал-цэнтрыстам мэра Вільні Артураса Зуокаса.

Расейскія камэнтатары часта парабольшваюць, гаворачы аб прарасейскасьці Партыі працы. Ураджэнец Архангельску Ўспаскіх зарабіў свой капітал (30 млн даляраў) на гандлі расейскім газам і жыве ў Кейданах толькі ад 1987 г., куды пераехаў як газазваршчык. Але ён ужо гаворыць па-расейску з акцэнтам, а перад выбарамі абяцаў у выпадку перамогі аддаць права выбару міністраў абароны і замежных справаў на волю прэзыдэнта Валдаса Адамкуса. Замежнапалітычная арыентацыя краіны яго цікавіць менш, чым лёс рэнтабельных дзяржаўных прадпрыемстваў.

Дэпутат-беларус Вацлаў Станкевіч пераабраны на новы тэрмін. Беларуская палітыка новага кааліцыйнага ўраду будзе, напэўна, яшчэ больш жорсткаю ў дачыненьні да Лукашэнкі, чым гэта было ў часы левага ўраду Бразаўскаса.

**Мікола Бугай**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Асьцярожны Альгірдас Бразаўскас — непатапляльны лідэр літоўскай палітыкі.**

## Расклад сілаў у Сойме, мандатаў

| | |
|---|---|
| Партыя працы | 39 |
| Кааліцыя Раландаса Паксаса | 11 |
| Саюз Сялянскай партыі і Новай дэмакратыі Казімеры Прунскенэ | 9 |
| Польскія дэпутаты | 2 |
| Незалежныя | 6 |
| Сацыял-дэмакраты — сацыял-лібэралы Альгірдаса Бразаўскаса і Артураса Паўлаўскаса | 31 |
| Саюз лібэралаў і Цэнтру | 18 |
| Кансэрватары Андруса Кубілюса | 25 |

# Рабаваньні з палітычным адценьнем

## Прачніся Мілана Міхалевіч — і яе магло б ня быць у жывых

**Загадкавыя крадзяжы адбыліся ўначы з 21 на 22 кастрычніка ў двух гарадах Беларусі — Менску і Віцебску. Напады зладзеяў зазналі кватэра намесьніка старшыні ПБНФ Алеся Міхалевіча і жытло кіраўніцы віцебскай філіі АГП Алены Залескай.**

Абкраданьне кватэры А.Міхалевіча выглядае загадкава. Рабаваньне адбылося ўначы, калі сам Міхалевіч быў у ад’езьдзе. Дома былі яго жонка Мілана і маленькая дачка Алеся-Стэфанія. Праўда, абедзьве яны спалі й нічога ня чулі. З кватэры зьніклі партатыўны кампутар Міхалевіча, мабільныя тэлефоны, грошы і залатыя ўпрыгажэньні.

Паводле вэрсіі міліцыянтаў, дзейнічаў прафэсійны «фортачнік» — злодзей, які трапіў у кватэру, разьмешчаную на першым паверсе дому, праз фортку незакратаванага акна. Пры гэтым ён не перакуліў вазонаў з кветкамі, якімі спрэс устаўлены падаконьнік, незразумела: сьлядоў прасыпанае зямлі нідзе няма. Затое сьляды ператрусу кватэры былі відавочнымі. Першае, што пабачыла Мілана, калі прачнулася ад холаду зь незачыненай форткі, — каробку з дакумэнтамі на дзіцячым ложку. У пярэднім пакоі быў кінуты кухонны нож, з шафаў выпатрашаныя прасьціны.

Як так маладая маці Мілана і яе дачушка не прачнуліся і што іх магло чакаць, калі б яны прачнуліся, можна толькі гадаць. Ці ня быў у кватэру пушчаны які-небудзь сонны газ? Гэтае меркаваньне сьледчым прыйшло да галавы толькі празь некалькі дзён, 25 кастрычніка. Рабіць мэдэкспэртызу было позна.

Спн.Мілана паведаміла «НН», што суседзі за некалькі дзён да здарэньня неаднаразова бачылі ў пад’езьдзе невядомых маладзёнаў. Пасьля таго ў кватэры Міхалевічаў быў зьлёгку пашкоджаны замок (мо спрабавалі ачыніць удзень, калі гаспадары адсутнічалі). Магчыма, у кватэру праніклі праз дзьверы, а не праз фортку: увечары Мілана не паставіла замок на фіксатар. На думку М.Міхалевіч, кватэру абкрадалі «па наводцы» й цікавіліся менавіта ноўтбукам.

У прыватных размовах зь Міхалевічамі міліцыянты паведамілі, што абкраданьне іхнай кватэры ня першае ў раёне — былі й яшчэ некалькі падобных выпадкаў. 25-га ў кулюарах нават сказалі, што ўжо злавілі падазроных. Праўда, 26-га ў міліцыі ўжо ні слова пра іх не казалі. Сьледзтва вядзецца. У справе прызначаны сьледчы Раман Шалімаў.

Алесь падазрае ў гэтай справе палітычны сьлед.

У кватэру А.Залескай, разьмешчаную на другім паверсе дому, зладзеі забраліся ў адсутнасьць гаспадыні. Як паведаміла «НН» спн.Алена, у выніку гэтага няпрошанага візыту зьніклі кампутар і факс, перанесеныя з партыйнага офісу, відэамагнітафон, недарагі фотапарат і… пачатая бляшанка «Nescafe». Зладзеі трапіліся «акуратныя»: рэчаў ды кніг у пошуку грошай не пераграсалі, біжутэрыі не шукалі. Міліцыянты кажуць, што злачынцы трапілі ў кватэру, абраўшыся па вадасьцёкавай трубе. Суседзі нічога не заўважылі, толькі суседка зьнізу праз сон чула бразгатаньне бляхі, пакладзенай на прыаконьні. Злачынцы, маглі быць удвух — у кватэры засталіся сьляды дзьвюх параў пальчатак. Уцякаючы, яны забыліся на прыаконьні ключы ад машыны. «Міліцыянты вельмі стрымана паставіліся да гэтай знаходкі, — кажа А.Залеская. — Я, вядома, не спэцыялістка, але няўжо гэта не зачэпка ў пошуку злачынцаў?» Жанчына не адкідае палітычнай вэрсіі, але кажа, што ў гэтым выпадку моцна пралічыліся: кампутар быў незадоўга да здарэньня забраны з рамонту й ня меў у памяці важнай інфармацыі.

**Аркадзь Шанскі**



ЮЛЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Паводле вэрсіі міліцыі, Міхалевічаў абакраў прафэсійны фортачнік.**

### Па пяску ды рэчышчы

У Воршы пасьля доўгага перапынку адбыліся міжнародныя спаборніцтвы па матакросе. У якасьці трасы ўжо шмат гадоў выкарыстоўваецца рэчышча Куцеінкі, якая ледзь бруіцца толькі ўвесну. Менавіта на яе берагах у XVII ст. былі заснаваны знакамітыя Куцеінскія праваслаўныя манастыры. І калі на месцы жаночага Ўсьпенскага цяпер жылы мікрараён, дык ад мужчынскага мататрасу аддзяляе ўсяго толькі дарога. Сама ж Куцеінка некалі была ладнай рэчкай — яшчэ і цяпер у адным месцы ляжаць валуны з падмуркаў былога млына. Ужо некалькі гадоў мясцовыя эколягі спрабуюць уладкаваць ды акультурыць яе стромкія берагі, але, на жаль, пакуль безвынікова.

А вось у мястэчку Балбасава пад Воршай чэмпіянат Беларусі па матагонках на малалітражках праведзены ўпершыню. Месца для спаборніцтваў выбрана невыпадкова, бо тут ёсьць выдатны аэрадром, які застаўся пасьля вывазу ў Расею ў пачатку 1990-х г. палка цяжкіх бамбавікоў. Авіяцыйнае злучэньне разьмяшчалася тут з 1930-х гадоў, тады ж была пабудавана і бэтонная ўзьлётна-пасадачная паласа, якую падчас другой сусьветнай вайны ўдасканалілі немцы. Цяпер аэрадром належыць мясцоваму авіярамонтнаму заводу, але самалёты ды шрубалёты прызямляюцца на яго ня так часта. У другой палове 1990-х аэрадромнае абсталяваньне (асабліва розныя кабэлі з каляровых мэталаў) раскралі, спрабавалі красьці і бэтонныя пліты. Але цяпер аэрадром пільна вартуюць. Аэрадромная гоначная траса мае даўжыню 420 мэтраў. Ахвотных прамчацца па ёй было дастаткова. Вядома, гэта ня «Формула-1», але відовішча захапляльнае.

### Забавы піраманаў ці падпалы?

Надзвычайнае здарэньне адбылося на мінулым тыдні ў Воршы. З 30-хвілінным інтэрвалам загарэліся адразу тры прыватныя дамы. Усе ўзгараньні, паводле слоў супрацоўніка мясцовага атраду МНС, пачаліся з дахаў. Дзякуй Богу, чалавечых ахвяр ды вялікае шкоды пажары не прынесьлі. Іх прычыны высьвятляюцца. Сувязь паміж імі, на наш погляд, несумненная. Асабліва гэта тычыцца пажару ў адзінокай хаце, якая месьціцца побач са шматпавярховікамі мікраражёну «Раніца» — якраз на тым месцы, дзе адзін прадпрымальнік пачаў будаваць буйны гандлёвы цэнтар. Яго тэрыторыя ўжо абнесеная агароджай, у тым ліку і згаданы дом. Праўда,назваць яго домам складана. Гэтая маленькая драўляная хатка пад рубэроідавым дахам даўно псуе выгляд цэнтральнай вуліцы гораду. Але праблема ў тым, што ў ёй прапісана некалькі сем’яў, якія жадаюць атрымаць кватэры. Такой магчымасьці горад пакуль не знайшоў. Мабыць, хтосьці вырашыў зрабіць гэта хутчэй і пусьціў пад дах «чырвонага пеўніка». Аднак перашкодзілі пажарныя.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Дэбютаваў зборнікам прозы

Вячаслаў Атрахімовіч нарадзіўся ў 1947 г. на Браслаўшчыне. У Навапалацку, дзе ён цяпер жыве, яго найперш ведаюць як аўтара кароткіх апавяданьняў, якія пэрыядычна зьяўляюцца на старонках гарадзкой газэты «Химик». Нядаўна ў выдавецтве Алеся Судніка выйшла першая кніга прозы В.Атрахімовіча «Жыцьцёвыя гісторыі». Яна складаецца зь немудрагелістых гісторый з жыцьця, якія здараюцца на вуліцы, на працы, у сям’і, на рыбалцы або ў лесе. Аўтар умее ўсё гэта падаваць з добрым гумаркам. Гэта адзіная сёлетняя кніга навапалацкага аўтара, якая выйшла па-беларуску. Расейскамоўных жа кніг зьявілася блізу дзесяці.

### «Званы Сафіі-2004»

24 кастрычніка ў полацкім Сафійскім саборы пачаўся IX Міжнародны фэстываль арганнай музыкі «Званы Сафіі». Адкрылі фэстываль сваім канцэртным выступам заслужаная артыстка Расеі Людміла Голуб (арган) і ляўрэат міжнародных конкурсаў Аляксандар Ветух (труба). Надзвычай прыгожа гучаў дуэт гэтых двух, здавалася б, цяжкаспалучальных галасоў — імклівай, графічнай трубы і павольнага, акварэльнага аргана. Часьцей у Сафійцы пачуеш дуэт аргана і скрыпкі. Наступны канцэрт у Сафіі адбудзецца 31 кастрычніка — упершыню ў Полацку выступіць літоўскі арганіст Аляксандар Ісакаў. Цана квіткоў на ўсе канцэрты — 5 тыс. рублёў.

**Васіль Кроква, Полацак**

### Хто заплаціць за камфорт?

Беларуская чыгунка павялічыла колькасьць электрычак «павышанай камфортнасьці», якія пачалі хадзіць з канца жніўня паміж Воршай і Менскам чатыры дні на тыдзень: у пятніцу, суботу, нядзелю і панядзелак. У найбольш камфортных вагонах другога клясу сьпінкі крэслаў адкідаюцца, а шыбы зроблены з танаванага шкла. Дарогу паміж Воршай і Менскам звышкамфортная электрычка адолвае амаль на дзьве гадзіны хутчэй за звычайную, якая цягнецца чатыры гадзіны. Да пасажырскага поезда новую электрычку набліжае таксама наяўнасьць праваднікоў і бару. Кошт праезду складае ад 6 да 10 тысяч рублёў.

Зьяўленьне новага цягніка адбылося амаль адначасова з чарговай пэратасоўкай кадраў на вышэйшых пасадах у краіне. 27 жніўня Лукашэнка прасунуў былога кіраўніка БЧ на пасаду віцэ-прэм’ера, а новым начальнікам чыгункі зрабіў **Уладзімера Жаралу**, які засьведчыў сваю адкрытасьць і адсутнасьць уласьцівай беларускім чыгуначнікам баязьлівасьці на прэс-канфэрэнцыі напярэдадні Дня чыгуначніка.

Прасоўваньне чыгуначніка ва ўрад сьведчыць, што найбліжэйшым часам ня зьдзейсьняцца пражэкты пра далучэньне БЧ да Міністэрства транспарту (на правах дэпартамэнту) ці да Расейскай чыгункі (на правах тэрытарыяльнага падразьдзяленьня).

Простыя чыгуначнікі, якія песьцяць успаміны пра былых кіраўнікоў БЧ ды з зайздрасьцю прыглядваюць становішча чыгуначнікаў у суседняй Польшчы, пакуль сьцілпа ў сваіх спадзевах на будучыню. Прыбыткі ад унутраных пасажырскіх перавозак пакрываюць выдаткі напалову. Рэнтабэльныя толькі міжнародныя пасажырскія перавозкі, а выдаткі ад мясцовых перавозак пакрываюцца з транзыту. Але, паводле інфармацыі таго ж У.Жаралы, за першыя паўгоду аб’ём транзытных перавозак зьменшыўся на 12%. Гэта выклікана пераарыентацыяй грузавых перавозак, якую правяла Расея. Яна актыўна будуе порты на Балтыцы і ня хоча везьці свае грузы праз тэрыторыю Беларусі ў порты Літвы і Латвіі, а нафтапрадукты і мэталы ўсё часьцей вязе праз Паўднёва-Ўсходнюю Азію.

**Міхал Чарвінскі, Віцебск**

### Кніга на грошы Канаплёва

Краязнаўчы агляд «Зямля Бялыніцкая» выйшаў у выдавецтве «Тэхналёгія» накладам 300 ас. Аўтар выданьня — настаўнік гісторыі мясцовай сельскагаспадарчай вучэльні Анатоль Марозаў. Зьяўленьню агляду ў сьвет паспрыяў дэпутат У.Канаплёў.

**Базыль Ліцьвіновіч, Бялынічы**

### Загадкі з-пад Лоева

Раскопкі археоляга Алега Макушнікава пад Лоевам адкрылі цэлы археалягічны комплекс X—XI ст. Ён уключае мноства прыкмет, нетыповых для старажытных жыхароў гэтай часткі Гомельшчыны.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

# Адноўленая сьвятыня

24 кастрычніка быў урачыста адкрыты касьцёл Сьвятога Лаўрэна ва Ўшачах. Рэстаўрацыйныя работы доўжыліся пяць гадоў, і вось сьвятыня адноўлена. Пасьвячаў храм біскуп Віцебскай дыяцэзіі Ўладзіслаў Блін. На ўрачыстасьці сярод іншых гасьцей прысутнічаў народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін, які падчас цырымоніі прачытаў верш Папы Рымскага Яна Паўла II у сваім перакладзе. Аднаверцаў са сьвятам віншавалі парафіяне з суседніх парафій — лепельскай, чашніцкай, новалукомскай, блізьніцкай. Пробашч віцебскай катэдры Сьв. Барбары, айцец дамініканін Міхаіл Ермашкевіч, падараваў касьцёлу абраз, які ён намаляваў сам. Прадстаўнікі мясцовай вэртыкалі ў цырымоніі адкрыцьця бажніцы ўдзелу ня бралі.



**Тамаш Гурба, Полацак. Фота Міколая Новікава**

### Радыё «Швэцыя» пачынае трансьляцыі на беларускай мове

Радыё «Швэцыя» — служба замежнага вяшчаньня швэдзкага радыё — вяшчае на 9 замежных мовах, а таксама на швэдзкай. Беларуская праграма радыё «Швэцыя» будзе знаёміць беларускага слухача са Швэцыяй — яе гісторыяй і сучаснасьцю, а таксама асьвятляць культурныя, палітычныя і грамадзкія падзеі ў галіне швэдзка-беларускіх адносін. Праграма (30 хвілін) выходзіць у эфір на кароткіх хвалях кожную другую нядзелю а 18-й паводле Грынвіча з паўторам а 19.30. Першая праграма выйдзе ў эфір 7 лістапада. Час (паводле Грынвіча) і частоты (хвалі): 18.00—18.30, 5830 МГц (КХ 49 м); 19.30—20.00, 5830 МГц (КХ 49 м).

# Рэальная цана беларускаму футболу

## У нядзелю на менскім стадыёне «Дынама» за тур да фінішу можа вырашыцца лёс залатых мэдалёў нацыянальнага першынства

На матч 28-га туру, што прайшоў 25 кастрычніка, менскае «Дынама» адправілася ў Салігорск да тамтэйшага «Шахцёра». Гарнякі да гэтага матчу 60 гульняў запар (са жніўня 2000 году!) у чэмпіянаце нікому не саступалі на сваім полі. Але ў панядзелак традыцыя была зламаная. «Дынама» перамагло зь лікам 1:0.

БАТЭ ў гэты дзень без асаблівых праблем перамагло ў Барысаве мазырскую «Славію» — 4:0.

Цяпер становішча за два туры да фінішу такое: «Дынама» мае 69 балаў, БАТЭ — 67, «Шахцёр» — 61.

У наступным туры, які пройдзе 31 кастрычніка, можа вырашыцца лёс залатых мэдалёў чэмпіянату. На галоўнай арэне Беларусі сустрэнуцца ўладальнікі ўзнагарод мінулага першынства — «бронзавае» менскае «Дынама» і «сярэбранае» барысаўскае БАТЭ. «Дынама» мае адпомсьціць за мінулагоднюю аплявуху ў апошнім туры, атрыманую ў сталіцы ад Барысава, — 0:4.

Менску патрэбна толькі перамога, бо ў апошнім туры, 7 лістапада, давядзецца гуляць у гасьцях зь віцебскім «Лякаматывам», які адчайна змагаецца за прапіску ў вышэйшай лізе. А БАТЭ ў апошнім туры, хутчэй за ўсё, пераможа, бо гуляе зь менскім «Тарпэда-СКА», якое ўжо страціла ўсялякую матывацыю.

Вось такая інтрыга ў нашым футбольным першынстве. Бо рэальная цана беларускаму футболу — у сустрэчах на эўраарэне: матчах Лігі чэмпіёнаў і Кубку УЭФА.

Сёлета нашы клюбы дружна павыляталі яшчэ ў **першым раўндзе кваліфікацыі**. Мінулагодні чэмпіён «Гомель» у першым раўндзе Лігі чэмпіёнаў саступіў альбанскай «Тыране». БАТЭ ў кубку УЭФА — тбіліскаму «Дынама». А «Шахцёр», уладальнік кубку Беларусі-2004, — малавядомаму «Ністру» з малдаўскага Атакі. У сэзоне-2003 мы таксама вылецелі ў першым крузе, але прайгралі прадстаўнікам Ірляндыі, Румыніі, Даніі. Усё ж «Багеміянс», «Сьцяўа» ды «Брондбю» вышэйшыя клясам за каманды з Малдовы, Грузіі, Альбаніі.

Таму ці не чакае нас пасьля такой прыгожай і драматычнай канцоўкі нацыянальнага чэмпіянату налета такі ж аглушальны пралёт у першым туры эўракубкаў?

Слабенькі наш чэмпіянат. Найлепшы бамбардзір мінулага сэзону Генадзь Блізьнюк перабраўся з чэмпіёну «Гомелю» ў клюб першай лігі расейскага чэмпіянату саратаўскі «Сокал». А найлепшы гулец сэзону-2003 Цімох Калачоў («Шахцёр», Салігорск) гуляе за фармклюб данецкага «Шахцёру».

Адзначу «цікавае» стаўленьне Фэдэрацыі футболу да нацыянальнага першынства. У панядзелак шэсьць матчаў з васьмі пачаліся а трэцяй гадзіне. Зразумела, што большасьць стадыёнаў не забясьпечана электраасьвятленьнем. Але што замінала паставіць матчы на суботу—нядзелю? Праўда, у БФФ потым зразумелі пралік — і ў панядзелак скарэктавалі каляндар на наступны тур. Бо інакш на каго разьлічаны футбол, як не на шараговых заўзятараў, якія ўдзень ці працуюць, ці на занятках? Матчы перанесьлі з 2 лістапада на нядзелю, 31 кастрычніка.

**Алег Раявец**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Гульня чэмпіянату Беларусі паміж БАТЭ (Барысаў) і «Славіяй» (Мазыр) 25 кастрычніка ў Барысаве. Гаспадары поля зарабілі ў сваю скарбонку яшчэ 3 ачкі.**

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

Пракуратура Цэнтральнага раёну Менску адмовілася расьсьледаваць акалічнасьці затрыманьня і зьбіцьця невядомымі навучэнца Беларускага ліцэю **Франка Вячоркі** 1 верасьня: не зважаючы на шматлікія фатаздымкі, пракуратура лічыць факты непацьверджанымі. Хворы на сэрца сябар КХП-БНФ **Уладзімер Плешчанка** (Віцебск) 16 кастрычніка быў арыштаваны на 10 сутак за мастацкі пэрформанс, а ўначы 17-га яго мусілі перавесьці ў больніцу. 20 кастрычніка за ўдзел у вулічнай акцыі ў Менску былі асуджаныя **Яўген Валкавец** (10 сутак), **Сяргей Манкевіч** (5 с.), **Сяргей Міхаленка** (5 с.), **Аляксандра Гаеўская** (5 с.), **Уладзімер Шыдлоў** (3 с.), **Яраслаў Навуменка** (3 с.), асуджанага ўдзельніка акцыі **Сяргея Міхаленку** 21 кастрычніка даставілі са спэцпрыёмніку ў больніцу праз праблемы з сэрцам. **Міхаілу Кандрашову**, асуджанаму за ўдзел у акцыі на 10 с., дырэкцыя навучальнай установы 20 кастрычніка прапанавала забраць дакумэнты. 20 кастрычніка, мусіць, за незалежную журналісцкую дзейнасьць на радыё «Свабода» са шматтыражкі «Полимировец» (Наваполацак) звольнілі **Вінцэся Мудрова**. Затрыманы на вуліцы каардынатар «Зубра» **Яўген Афнагель** асуджаны 20 кастрычніка на 10 с. За ўдзел у акцыі ў Менску **Зьміцер Барадка** 21 кастрычніка асуджаны на 15 с., **Зьміцер Вайтко** — на 10 с. У Бялынічах 22 кастрычніка асуджаны на 7 с. каардынатар «Зубра» **Алег Мяцеліца**. Адміністрацыя ААТ «Рытм» (Рэчыца) 21 кастрычніка звольніла па скарачэньні штатаў актывістаў прафсаюзу РЭПАМ **І.Паплаўную**, **С.Сяндзевіча**, **В.Давыдзенку**, **С.Усхопаву**. Адміністрацыя «Рытму» таксама не пералічвае на рахунак **РЭПАМу** грашовыя складкі, утрыманыя з заробкаў сяброў прафсаюзу. Суд Маскоўскага раёну Менску 21 кастрычніка не задаволіў пазову генэрала **Валер'я Фралова** да газэты «Обозреватель» і журналісткі Ганны Мураўскай, што назвалі яго антысэмітам. Падчас акцыі пратэсту 21 кастрычніка ў Менску **Вячаслаў Сіўчык** атрымаў позву ў міліцыю. 22 кастрычніка вымусілі звольніцца з працы кандыдата ад «Народнай грамады» на апошніх выбарах **Анатоля Балакіра** (Слуцак). Адміністрацыя Беларускага мэталюргічнага заводу (Жлобін) пасьля выбараў прымушае звольніцца кандыдата ад ПКБ **Валер'я Рыбчанку**, а адміністрацыя Магілёўскага аўтазаводу — кандыдата **Аляксандра Карыткіна** (былая Партыя працы). 22 кастрычніка ў Слоніме за распаўсюд улётак аштрафавалі на 10 б.в. сябра БНФ **Уладзімера Бруцкага** — суд заняў дзьве хвіліны. За ўдзел у несанкцыянаваным пікеце супраць уціску прэсы 4 кастрычніка гарадзенскія міліцыянты 21 кастрычніка пачалі шукаць журналістаў **Ірыну Чарняўку**, **Натальлю** і **Анатоля Макушыных**, **Паўла Мажэйку**, **Юлію Коцкую**. Справа **Паўла Шарамета** 22 кастрычніка часова прыпыненая. 25 кастрычніка невядомыя тэлефанавалі каардынатару «Хартыі'97» **Зьмітру Бандарэнку** й запрашалі «на размову» ў менскі аддзел па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю, а пасьля пагражалі зьбіцьцём. 25 кастрычніка пракуратура Беларусі распачала крымінальную справу з нагоды прэс-канфэрэнцыі **кіраўнікоў «5+»** 13 кастрычніка, калі былі агучаны загадзя вызначаныя вынікі галасаваньня. За ўдзел у акцыі 25 кастрычніка ў Менску былі асуджаныя **Вячаслаў Сіўчык** (15 с.), **Наста Азарка** (10 с.), **Алесь Васілеўскі** (10 с.), **Уладзімер Беглік** (5 с.) і **Сяргей Высоцкі** (3 с.).

**АШ**

НА ПРАВОХ РЭКЛЯМЫ

# Эўрапейскія палітыкі думаюць пра Беларусь

Падчас канфэрэнцыі, арганізаванай Усходнеэўрапейскім дэмакратычным цэнтрам, прагучала думка, што ні польскія, ні эўрапейскія палітыкі ня маюць уяўленьня, якім чынам ладзіць супрацоўніцтва зь Беларусьсю. «Ці гэта сапраўды так?» — пацікавіліся мы ў намесьніка старшыні Эўрапарлямэнту **Януша Анышкевіча**.

**Я.А.:** Гэта сапраўды складаная справа, а вынікае гэта часткова са слабасьці беларускае апазыцыі. Кажучы «апазыцыя», я ня толькі маю на ўвазе людзей, згуртаваных вакол палітычных партый, але таксама шырэйшыя колы, якімі, для прыкладу, была ў Польшчы «Салідарнасьць». Мы цяпер ужо, як чалец Эўразьвязу, які мае сваіх дэпутатаў у Эўрапарлямэнце, стаім перад дылемай — не прызнаючы беларускага парлямэнту, мы ў Беларусі ня маем партнэра для размоваў. Не прызнаючы ўлады А.Лукашэнкі, мы таксама ня маем партнэра для дыскусіі. Тым часам калі дэлегацыя Эўрапарлямэнту едзе ў Беларусь, то ўсё ж такі павінна яна сустрэцца з прадстаўнікамі органу, прызнаванага ў Беларусі парлямэнтам. Гэта складанае пытаньне. Мы яшчэ нейкі час будзем дзейнічаць на прасторы паміж палітыкай ізаляцыі рэжыму Лукашэнкі, непрызнаньня яго, што азначае адсутнасьць размоў, ды палітыкай нейкага дыялёгу, які выглядае падобным чынам, як выглядаў дыялёг дэмакратычных краінаў Захаду з польскай уладай у пэрыяд 80-х гадоў.

**— Ці ня ўдасца — можа, дзякуючы польскім эўрадэпутатам — перанесьці гэты дыялёг на ўзровень канкрэтных дзеяньняў, якія прымаюць, напрыклад, урады Чэхіі ці Нямеччыны ў адносінах да канкрэтных выпадкаў, калі ў Беларусі чакаецца падтрымка з боку Захаду?**

**Я.А.:** Амаль палову групы «Эўразьвяз—Беларусь» Эўрапарлямэнту складаюць палякі. У час апошняй сустрэчы я прапанаваў групе дзеяньні, мэтай якіх было б фінансаваньне ЭЗ на адкрыцьцё беларускамоўнай радыёстанцыі на тэрыторыі Польшчы ці Літвы. Мы выступім з такой ініцыятывай. Старшыня групы дэпутат Богдан Кліх ужо, дарэчы, пра гэта заявіў. З такога тыпу прапановамі мы можам выступаць на ўзроўні Эўрапарлямэнту. Я спадзяюся, што зможам таксама праверыць, як працуюць розныя зьвязаўскія праграмы, такія, як TACIC. Асаблівую ўвагу мы зьвяртаем на сыстэму стыпэндый для беларускае моладзі, якая вучылася ў Эўрапейскім гуманітарным унівэрсытэце ці ў Беларускім гуманітарным ліцэі. Трэба стварыць гэтым маладым людзям магчымасьць завяршыць адукацыю.

**— Ці гэтая радыёстанцыя, пра якую вы згадалі, азначала б працяг існаваньня радыё «Рацыя»?**

**Я.А.:** Найважнейшае, каб такая радыёстанцыя папросту існавала. Гэта будзе складана зрабіць у будучым годзе, таму што такое рашэньне зьвязана зь бюджэтам. Калі мы пачнём дзейнічаць сёлета, то ў 2006 г. нашы дзеяньні завершацца посьпехам. У Эўрапарлямэнце дзякуючы палякам, а таксама дэпутатам з краін Балтыі пытаньне Беларусі часта ўздымаецца.

**— Ці Эўрапарлямэнт, дзякуючы палякам, будзе больш адважны ў сваіх дзеяньнях за польскае Міністэрства замежных спраў? Польскае МЗС старалася дапамагчы ў адкрыцьці беларускамоўнай станцыі, якая вяшчала б з тэрыторыі Польшчы, але ўсе гэтыя дзеяньні былі амаль сакрэтныя…**

**Я.А.:** Карысьней схавацца за ініцыятывай цэлага ЭЗ, чым выступіць зь ёю самім. Трэба памятаць, што А.Лукашэнка даволі часта ў сваіх выступленьнях зьвяртаў увагу на тое, што беларуская апазыцыя карыстаецца падтрымкай Польшчы. Лукашэнка спрабаваў пераканаць іншых, што Польшча мае дрэнныя намеры ў дачыненьні да Беларусі й выкарыстоўвае беларускіх апазыцыянэраў у якасьці сваіх агентаў. Калі з ініцыятывай выступіць ЭЗ, значна цяжэй будзе сфармуляваць такі закід. Дакладней, закід найхутчэй што будзе, але цяжэй будзе пераканаць людзей, што пад абвінавачваньнямі ёсьць хоць нейкі грунт.

**— Вы сказалі, што эўрапейскія палітыкі не адмаўляюць у дыялёгу з А.Лукашэнкам. Ці можна весьці дыялёг зь людзьмі, якія фармулююць такія абвінавачаньні?**

**Я.А.:** ЭЗ пакуль што забараняе такі дыялёг. У сувязі з гэтым мы адкідаем пэўныя магчымасьці. Я ня ведаю, ці можна будзе гэта ўтрымаць. Я прыхільнік таго, каб такую ізаляцыю надалей захоўваць, але мы пабачым, ці дасьць гэта нейкія вынікі. Можа, трэба будзе весьці, скажам, больш рэальную палітыку, якая ў меншай ступені будзе абапірацца на раней вызначаныя кірункі. ЭЗ вядзе размовы з прадстаўнікамі парлямэнтаў, якія былі выбраны недэмакратычным шляхам, — напрыклад, з парлямэнтам Паўночнай Карэі.

**Паводле радыё «Палёнія»**
**http://www.radio.com.pl/polonia**

## НАВІНЫ СПОРТУ

### Забур'янава крытыкуе дармаедаў

У мінулую пятніцу прайшло сумеснае пасяджэньне калегіі Міністэрства спорту і турызму з Нацыянальным алімпійскім і паралімпійскім камітэтамі. Намесьнік міністра спорту Галіна Забур'янава — яна кіравала беларускай дэлегацыяй у Атэнах у адсутнасьць Юрыя Сівакова — рэзка раскрытыкавала гімнаста Івана Іванкова, які, паводле яе слоў, не заваяваўшы на Алімпіядах ніводнага мэдаля, атрымаў за чатыры гады 96 тыс. даляраў заробку, «ня лічачы збораў і узнагароджаньняў». Не засталася па-за ўвагай намесьніцы міністра і дзюдаістка Таццяна Масквіна, што вярнулася з Грэцыі без мэдаля: «Калі мы спыталі Масквіну, навошта яна прыехала ў Грэцыю, яна адказала, што па футры».

Іванкова не было на мінулым тыдні ў Менску, ягоная жонка абурылася выказваньнямі ўрадоўкі, а Масквіна заявіла, што ні пра якое футра гаворкі не было, і паабяцала, што Забур'янаву чакае «размова».

### «Качар» Салей стаў «барсам»

Абаронца клюбу Нацыянальнае хакейнае лігі і зборнай Беларусі Руслан Салей на час лякаўту ў НХЛ будзе выступаць за клюб расейскае суперлігі «Ак Барс» (Казань). Салею даюць у сталіцы Татарстану кватэру і аўтамабіль. Нарачоная хакеіста Бэці пакуль застаецца ў Каліфорніі.

Напэўна, падпіша аналягічны кантракт зь «Белымі барсамі» і ўладальнік Кубку Стэнлі-2004 галкіпер «Тампы» Мікалай Хабібулін. Адзначым, што яго «сваталі» ў Менск, адкуль паходзіць жонка, і менавіта сюды Хабібулін прывозіў у чэрвені Кубак Стэнлі. Але галкіпер едзе ў Казань, дзе, паводле неафіцыйнай інфармацыі, атрымае 6 млн даляраў за сэзон. Наўрад ці які б зь беларускіх клюбаў пацягнуў такі кантракт.

### «Мядзьведзі» перамаглі Берасьце

У суботу другую паразу ў Лізе чэмпіёнаў атрымаў берасьцейскі гандбольны клюб імя А.Мяшкова, гэтым разам ад «Чэхаўскіх мядзьведзяў» (Маскоўская вобласьць) — 29:34. Берасьцейцы пасьля трох тураў ідуць трэцімі і, здаецца, разьвіталіся з надзеяй трапіць у 1/8 фіналу (дзеля гэтага трэба заняць у групе другое месца). Тут бы трэцяе ўтрымаць.

### Бойка на сталічным «Тарпэда»

Матч 28-га туру паміж сталічнымі «Тарпэда-СКА» і «Зоркай-ВА-БДУ», што прайшоў 25 кастрычніка, скончыўся бойкай. Бойка пачалася пасьля таго, як «Зорка», што змагаецца за прапіску ў вышэйшай лізе, павяла ў ліку — 1:0. Гульцы пачалі паляваць адзін на аднаго, урэшце гэта перарасло ў масавую калатнечу з удзелам запасных. Бойку спынілі байцы АМАПу.

**АР**

# Усе мы родам зь Пінску

**Мінулы ўік-энд выдаўся насычаным на музычныя падзеі: Вайцюшкевіч іграў найлепшыя песьні, «Нэйра Дзюбэль» прэзэнтаваў новую праграму, «Індыга» ўпершыню грала ў акустыку, «J-Морс» далі сумесны канцэрт з екацерынбуржцамі са «Смысловых галлюцинаций».**



АРХІЎ «J-МОРС»

У клюбе «Экстрым» граюць «J-Морс».

Канцэрт «WZ-orkiestra» ў чацьвер аказаўся пад пагрозай зрыву, бо дырэкцыя Палацу вэтэранаў, дзе ён мусіў прайсьці, адмяніла імпрэзу за некалькі гадзін да пачатку. «Арганізатары не заплацілі нам за арэнду залі, — растлумачыў «НН» дырэктар Палацу вэтэранаў Яўген Барсукоў. — Толькі не шукайце тут ніякай палітыкі». Але Вайцюшкевіч зайграў усё ж такі ў гэты ж дзень, толькі ў іншым месцы — у Дольнай залі Чырвонага касьцёлу. У лістападзе Тодар паабяцаў вялікі канцэрт-прэзэнтацыю праграмы на вершы Рыгора Барадуліна.

На наступны дзень у Менску былі «Танкі». Фаны нарэшце дачакаліся беларускамоўнай праграмы Кулінковіча. Пасьля яе выкананьня з «Нэйра Дзюбэлю» цэтлік «панкі» мусіць быць зьняты канчаткова. У «Танках» знайшлося месца і року, і рэгі («Мне не хапае у.е.», прасьпяванай з Гюнэш Абасавай), і лірыцы.

Свой адзіны балядны твор «Жыцьцё» Кулінковіч прысьвяціў памяці забітай журналісткі Веранікі Чаркасавай. Цікава, што гэтая песьня, паводле слоў Кулінковіча, ёсьць сьведчаньнем таго, што ён сам жывы. 28 кастрычніка будзе роўна 10 год з таго часу, як яму зрабілі цяжкую апэрацыю на мозгу.

У суботу ў клюбе філяфаністаў можна было пачуць «Індыга» зь нечаканай акустычнай праграмай. Як выявілася, у групы нават няма акустычнай гітары — пазычылі ў Віктара Маўчанава. Аднак у такім камэрным выкананьні музыка Русі набывае дадатковы прысмак. «Індыга» зайграла колькі песень са свайго пакуль адзінага альбому «Дні» і некалькі нечаканых кавэраў, як «Come Together».

Музычны марафон скончыўся ў ноч з суботы на нядзелю, калі ў клюбе «Экстрым» адбыўся сумесны канцэрт «J-Морс» і «Смысловых галлюцинаций».

На прэс-канфэрэнцыі высьветлілася, што агульнасьць палягае ня толькі ў тым, што лідэры груп «набываюць мэтафары ў адной і той жа краме». Аказалася, што дырэктар «Галлюцинаций» Алег Фельд і Ўладзімер Пугач, хоць і пазнаёміліся толькі ў дзень канцэрту, нарадзіліся ў адным горадзе — Пінску.

У клюбе «Экстрым», дзе праходзіў сумесны канцэрт, набілася ля тысячы чалавек — ці не рэкорд для клюбнай імпрэзы. Музыкам з Екацярынбургу даспадобы прыйшлася творчасьць «морсаў», так што можна чакаць супольнага праекту. Расейскія рок-зоркі прызналіся, што пра беларускую музыку маюць цьмянае ўяўленьне, пасьля чаго атрымалі прэзэнт ад «НН» — дыск «Крамы».

Пугач разьвеяў чуткі адносна выступу групы на акцыі ў падтрымку рэфэрэндуму: «Аніякай згоды на выступ мы не давалі, і наогул палітыка знаходзіцца па-за сфэрай нашых творчых зацікаўленасьцяў і мэтаў групы».

**Сяргей Будкін**

# Кніга для падлеткаў замест дысэртацыі



**А ці не прытвары́ўся гетман Кішка перад Клецкаю бітваю?**

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ



**Між раскопкамі Міхась Чарняўскі заўжды знаходзіў час на дзіцячыя кніжкі. Ягоныя «Страла Расамахі» й «Вогнепаклоньнікі» зрабілі яго адным з найлепшых дзіцячых пісьменьнікаў. «Дзесяць бітваў» увойдуць у гэты самы шэраг.**

Адзін з ініцыятараў адраджэньня сацыял-дэмакратычнага руху ў Беларусі **Міхась Чарняўскі** (на фота) плённа працуе як прафэсійны археоляг. Ён, як паведамляе Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі, вылучыў асобную нёманскую археалягічную культуру і крывінскі (ад назвы тарфяніку ў Віцебскай вобласьці) варыянт нарвенскай культуры. Даробак немалы, а тым часам супрацоўнікі дакараюць яго за… гультайства: аніяк чалавек не зьбярэцца і ня сядзе пісаць доктарскую. Замест таго каб пісаць доктарскую, у вольны час Міхась Чарняўскі піша кніжкі для падлеткаў і люду паспалітага. Як гэта кажуць, папулярызуе гістарычныя веды. Ня толькі пра далёкую мінуўшчыну — пра бліжэйшую, як у нарысе пра Яна Караля Хадкевіча «Правадыр крылатых вершнікаў», таксама.

Гэтыя крылатыя вершнікі ўпрыгожваюць вокладку самае новае кніжкі гісторыка «Дзесяць бітваў». Толькі зірнуўшы на вокладку (мастак Рыгор Долбік), хлапчук і нават каторая зь дзяўчынак захоча мець такую кніжку.

З ваеннае гісторыі Беларусі М.Чарняўскі выбраў працягла змаганьне Полацка за Варажскае мора, бітвы на Сініх Водах, пад Грунвальдам, пад Клецкам, пад Воршай, на Іван-полі (на Уле), за Полацак, пад Кірхгольмам, пад Хацінам і бітву пад Палонкай.

Я ўпэўнены, што кніжка «Дзесяць бітваў» разыдзецца хутка і насьпее патрэба яе перавыданьня. Вось тады…

Паважаючы аўтарскі выбар і зрабіўшы тую заўвагу, што бітву за Полацак лепей было б назваць змаганьнем, я б параіў М.Чарняўскаму напісаць для новага выданьня нарыс пра змаганьне Віценя з крыжакамі, пра тое, як ён, прыйшоўшы на дапамогу рыжанам і палачанам, злучыў Навагародак і Полацак у адной дзяржаве (Вялікім Княстве Літоўскім і Рускім) і «прыдумаў» сваёй дзяржаве герб, «ежэ ныне нарычут Пагоня», напісаць пра Давыда Гарадзенскага і пра бітву на Стрэве, пасьля якое крыжакі перайшлі да тактыкі райзаў. З вайны 1654—1667 г. я б параіў вылучыць таксама сюжэт «крэпасьці-героя» — пра тое, як доўга змагаўся Быхаў, як выстаялі Слуцак і Ляхавічы. І пра няўдачы баярына Шэіна ў Смаленску ды пад Смаленскам някепска было б напісаць. І, вядома, дадаць карты-схемы.

Што б яшчэ я параіў аўтару? Калі згадваецца, што ў 1223 г. (бітва на Калцы) «у высокую стэпавую траву ляглі і дружыны зь беларускіх княстваў», то трэба было б згадаць крывічоў-смаленцаў, якія здолелі выстаяць і прарвацца. У апавяданьні пра Грунвальдзкую бітву ўвёў бы панятак «Вялікая вайна», а сярод саюзьнікаў ВКЛ на Ўсходзе, акрамя Пскова і Ноўгараду, назваў бы крывіцкую Цьвер. І спытаўся б: а ці не прытвары́ўся гетман Кішка перад Клецкаю бітваю? Бо ёсьць і гэткая вэрсія. Абвязкова падкрэсьліў бы, што гетман Канстанцін Астроскі перад Аршанскаю бітваю «пад, памаліся Богу» ў царкве «сьвятоі жываначальнаі Троіцы», і колькі бітваў было ў яго. А чаго я не рабіў бы, дык ніколі князя Астроскага не назваў бы Кастусём. Рурыкавіч, ён у дамавіне пераварнуўся б ад такога панібрацтва і «ўнарадавеньня». Мы ўжо назвалі Кастусём аднаго шляхціца…

**Анатоль Сідарэвіч**

Міхась Чарняўскі. Дзесяць бітваў. — Вільня: Наша Будучыня, 2004.

## Мартыралёг у Белнэце

У Інтэрнэце зьявіўся сайт «Мартыралёг Беларусі» (martyraloh.org), які распавядае пра злачынствы і ахвяраў камунізму ў Беларусі ў XX ст. Сярод разьдзелаў сайту — «Ахвяры» (зьвесткі пра рэпрэсаваных), «Карнікі». У «Бібліятэцы» зьмешчаны творы Ф.Аляхновіча, А.Лукашука, З.Пазьняка, Я.Шмыгалёва, М.Крывальцэвіча, А.Іова «Курапаты».

## Да Шагала цікавасьць зьніжаецца

16 кастрычніка ў Віцебску ў Артцэнтры Марка Шагала спыніла працу выстава «Марк Шагал і сьцяна». З гэтай нагоды адбылася прэс-канфэрэнцыя з удзелам унучкі славутага майстра Мэрэт Мэер-Грабэр. Дырэктарка музэю Шагала Людміла Хмяльніцкая паведаміла, што за месяц выставу наведала ўсяго каля дзьвюх тысяч чалавек. Гэта самы горшы вынік з усіх ранейшых (а іх было ўсяго чатыры) віцебскіх выставак з калекцый спадчыньнікаў майстра. Аднак у арганізатараў падобных выстаў энтузіязм ня зьнік. Ужо вядуцца перамовы пра чарговую выстаўку, якая павінна адбыцца ў наступным годзе ў Віцебску і Менску. Ініцыятарам яе выступіць амбасада Нямеччыны ў Беларусі. Плянуецца паказаць афорты мастака, створаныя ў Бэрліне ў 1922—1923 г.

## Выстава Адамовіча

У Літаратурным музэі на Пятроўцы (Масква) адкрылася выстава «Алесь Адамовіч. А для вечнасьці — Беларусь...». Экспазыцыя прысьвячаецца 60-годзьдзю перамогі ў вайне, якая была асноўнай тэмай у творчасьці пісьменьніка.

## Тоўсты «Дон Кіхот»

Да 500-годзьдзя з часу выхаду першага выданьня «Дон Кіхота», што будзе адзначацца налета, у Гішпаніі выйшаў самы поўны тэкст слыннага раману. Працу над выданьнем больш як 10 гадоў вялі каля сотні філёлягаў. На 1349 старонках кнігі зьмясьціліся арыгінальны тэкст раману, а таксама іншыя тэксты, у якія пісьменьнік пры жыцьці зрабіў праўкі (у тым ліку пад ціскам інквізыцыі). Да асноўнага тому дадаецца яшчэ адзін — з камэнтарамі спэцыялістаў, ілюстрацыямі Гюстава Дарэ, Пікаса й інш., мапа падарожжаў Рыцара Сумнага Вобразу, факсыміле вокладак рыцарскіх раманаў, якія захоўваліся ў бібліятэцы Сэрвантэса. Камплект з двух тамоў і арыгінальнага CD-ROM прадаецца ў Гішпаніі за 50 эўра.

## Букер-2004

Сёлетнюю Букераўскую прэмію (Вялікабрытанія) атрымаў раман «Лінія прыгажосьці», напісаны Аланам Голінгерстам, пра жыцьцё гомасэксуалістаў у часы тэтчэраўскага кіраваньня. Гэта першы выпадак за 36-гадовую гісторыю прэміі, калі ўзнагароду атрымлівае твор пра аднаполае каханьне. А.Голінгерст нарадзіўся ў 1954 г., вучыўся і выкладаў у Оксфардзе, некалькі гадоў быў намесьнікам рэдактара літдадатку да «Таймз».

## Музэй Рэмбо

На радзіме Арцюра Рэмбо ў Шарлевілі-Мэзьеры адкрылі музэй паэта. Ён размешчаны ў доме, дзе творца некалькі гадоў жыў з маці. Адзін з пакояў аддадзены пад рэчы з этыёпскага гораду Харэр, дзе Рэмбо займаўся прадпрымальніцкай дзейнасьцю. Стварэньне музэю прымеркавана да 150-годзьдзя паэта.

**АВ, Тамаш Гурба; Gazeta.pl**

# Вужгарад між Усходам і Захадам

У Вужгарадзе, самым заходнім і самым малым па колькасьці насельніцтва абласным цэнтры Ўкраіны, першыя выходныя кастрычніка — сьвята гораду. Сёлета Вужгараду 1111 гадоў. Тут даведваешся, што Вужгарад — гэта акурат цэнтар Эўропы: так нават называецца адна з вужгарадзкіх газэт.

На сьвята гораду вужгарадцы атрымалі падарунак — новы будынак вакзалу. Будаўніцтва вялося ўдарнымі тэмпамі круглыя суткі, будынак сапраўды шыкоўны. 6 кастрычніка адкрываць вакзал прыехаў прэм’ер-міністар і кандыдат у прэзыдэнты Ўкраіны Віктар Януковіч. У сувязі з гэтым вужгарадцы расказваюць анэкдот: «Чакаецца прыезд у Вужгарад Януковіча. Рэзка ўзрасла цана на яйкі». Пасьля таго як у Івана-Франкоўску ў Януковіча кінулі яйкам, і прэм’ер вагою 130 кг і ростам 195 см страціў прытомнасьць, на ўкраінскім Інтэрнэце зьявіўся новы хіт — гульня «Хамське яєчко», дзе трэба патрапіць у прэм’ера, каб адну за другой вызваліць усе вобласьці Ўкраіны.

Януковіч адкрыў таксама новы кардыялягічны цэнтар і сустрэўся са студэнтамі Вужгарадзкага нацыянальнага ўнівэрсытэту. Акурат перад выбарамі ўнівэрсытэт займеў новага рэктара. Былога рэктара знайшлі забітым, а на ягонае месца прызначылі дэкана мэдыцынскага факультэту, сябра алігархічнае Сацыял-дэмакратычнае партыі і даверанаю асобу Януковіча Васіля Русіна. Дэпутат ад Закарпацьця ў Вярхоўнай Радзе зьвяртаўся ў пракуратуру з просьбай узбудзіць крымінальную справу, паколькі было вядома, што васьмі прафэсарам пагражалі, каб яны не выстаўлялі сваёй кандыдатуры на пасаду рэктара.

Перад выбарамі ў два разы павысілі стыпэндыю студэнтам (яна сягае каля 20 даляраў ЗША, раней — 10 даляраў) і павысілі пэнсію. Праўда, жыхары Закарпацьця глядзяць на гэта крытычна і баяцца, што гэта аднаразовыя выплаты, а потым пэнсія зноў вернецца да ціперашняга памеру.

> Кабінэт Януковіча актыўна рэклямуе кампанію вяртаньня людзям грошай, накопленых у Ашчадным банку СССР. Цяпер выдаецца разавая кампэнсацыя ў памеры 50 грывень (каля 10 даляраў ЗША).

Кабінэт Януковіча актыўна рэклямуе кампанію вяртаньня людзям грошай, накопленых у Ашчадным банку СССР. Цяпер выдаецца разавая кампэнсацыя ў памеры 50 грывень (каля 10 даляраў ЗША), у наступным годзе абяцаюць у залежнасьці ад накопленай сумы залічваць гэтыя грошы ў кошт камунальных паслуг. Бабулькі шчасьлівыя. Праўда, Януковіч не гаворыць, дзе гарантыі, што ён гэта зробіць. Ня кажучы пра той выпадак, калі разьбірацца з гэтым прыйдзецца іншаму прэм’еру.

На 15 кастрычніка прызначана здача яшчэ аднаго аб’екту — трасы Кіеў—Чоп, якая цяпер рэканструюецца. Абласная адміністрацыя рэклямуе сваю працу: да сьвята ліквідавана запазычанасьць па заробках, мікраараён Даманінцы атрымаў ваду, беспрацоўе — адно з найніжэйшых у Эўропе (1,3%). Пры гэтым нічога ня згадваецца пра вялікую колькасьць украінцаў, якія працуюць за мяжой.

Толькі ў Партугаліі пражывае легальна 75 тысяч украінцаў, а нелегальна як мінімум яшчэ столькі ж. Заходнія украінцы часта разьбіваюць сем’і, каб зарабіць грошай: жанчыны езьдзяць працаваць у Італію ці Гішпанію, мужчыны — у Партугалію. Зарабіўшы грошай, людзі вяртаюцца на радзіму і набываюць дамы.

Вугорская меншасьць, якая жыве ў Закарпацьці, таксама стараецца пра разнастайныя льготы. Некаторыя афармляюць сабе пэнсію ў Вугоршчыне, а жывуць ва Ўкраіне.




ВЕРАНІКА ДЗЯДОК

Студэнты езьдзяць вучыцца ў Вугоршчыну, дзе існуюць дзяржаўныя праграмы падтрымкі вугорцаў з-за мяжы. Жанчыны езьдзяць туды нараджаць дзяцей, паколькі там лепшы стан мэдыцынскага абслугоўваньня. У Вужгарадзе адна школа з выкладаньнем вугорскай мовы.

Найбольшая колькасьць вугорцаў жыве ў Чопе, суседнім райцэнтры і самым заходнім пункце Ўкраіны. Там вугорцы складаюць палову насельніцтва, усе шыльды дзьвюхмоўныя. З вакзалу ў Чопе маршруткі і аўтобусы рушаць на Славаччыну й Вугоршчыну. Нічога не зьмяніла нават увядзеньне візаў, тым больш што ў Вугоршчыну яны бясплатныя. Павялічыўся і рух у адваротны кірунак: вугорцы прыяжджаюць ва Ўкраіну па прадукты харчаваньня, якія тут значна таньнейшыя.

> У супрацьюшчанкаўскай рэкляме паказваюць мапу Ўкраіны, падзеленую з захаду на ўсход на тры часткі: першы гатунак, другі гатунак і трэці гатунак.

Традыцыйна лічыцца, што Захад будзе галасаваць за Юшчанку, а Ўсход — за Януковіча. Але апошнія вынікі дасьледаваньняў кажуць, што за Юшчанку гатовы прагаласаваць 38%, за Януковіча — 29% грамадзян Закарпацкае вобласьці (для параўнаньня: у цэлым у краіне гатовы прагаласаваць за Юшчанку 31,5%, за Януковіча — 30,6%). Закарпацьце лічыцца бастыёнам аб’ядналых сацыял-дэмакратаў (СДПУ(а) — партыі Медзьведчука, які ўзначальвае адміністрацыю прэзыдэнта. Тут сацыял-дэмакраты займаюць усе галоўныя пасады, тут, паводле чутак, будуюць сабе лецішчы. Ці не на кожным гародзе тырчаць бігборды з рэклямай Януковіча.

Палітычная барацьба за Закарпацьце пачалася ўжо даўно. Самыя паказальныя падзеі разгортваліся ў Мукачаве — найбліжэйшым раённым цэнтры. У 2003 г. гарадзкая рада выказала недавер мэру гораду, былі прызначаны новыя выбары. На выбарах народ выбраў прадстаўніка «Нашай Украіны», але раптам масава зьніклі бюлетэні. Выбары былі прызнаныя несапраўднымі. На перавыбарах мукачаўцы паўтарылі свой выбар, але новага мэра так і не дапусьцілі да працы. Былі мітынгі ў дзясяткі тысяч чалавек і захопы міліцыянтамі працоўнага кабінэту мэра. Выбары ў Мукачаве сталіся сымбалем няскоранага духу, а таксама, гвалту, рэпэтыцыяй фальсыфікацый.

Украіна, у адрозьненьне ад Беларусі, яшчэ мае магчымасьць убачыць па тэлевізіі агітацыю за ўсіх кандыдатаў. Праўда, гэта таксама дае багата магчымасьцяў для праваакцый і дыскрэдытацый. Выглядае, што роля некаторых з 26 кандыдатаў у прэзыдэнты толькі ў тым і палягае, каб дыскрэдытаваць Юшчанку. Напрыклад, адзін з кандыдатаў (Раман Казак) замовіў тэлерэкляму, дзе кажа, што калі пераможа Юшчанка, дык яны разам дамогуцца дэпартацыі расейцаў з Украіны. У іншай супрацьюшчанкаўскай рэкляме паказваюць мапу Ўкраіны, падзеленую з захаду на ўсход на тры часткі: першы гатунак, другі гатунак і трэці гатунак. Слоган: «Так выглядае іхная Ўкраіна». Затое Януковіч абвясьціў аб жаданьні правесьці рэфэрэндум аб наданьні расейскай мове статусу дзяржаўнай ды аб пераглядзе курсу Ўкраіны на ўступленьне ў NATO.

**Вераніка Дзядок, Вужгарад—Чоп—Менск**

# Кабзон супраць Скрыпкі

Забаўляльныя мерапрыемствы з удзелам зорак шоў-бізнэсу — традыцыйны атрыбут любой выбарчай кампаніі. Калі ў Беларусі дазваляюць канцэрты толькі «за Беларусь», то ва Ўкраіне музыканты, няхай і зь перашкодамі, могуць засьведчыць сваю грамадзянскую пазыцыю. Зь верасьня па ўсёй краіне распачаліся шырокамаштабныя туры ў падтрымку як Януковіча (пад лёзунгам «Моладзь — супраць, моладзь — за», «Веру Януковічу»), так і Юшчанкі («Песні свабоды», «Разам переможам»), якія звычайна праходзяць на цэнтральных плошчах і ў вялізных спарткомплексах ды зьбіраюць да 100 тысяч гледачоў.

Януковіч зрабіў стаўку на папулярных артыстаў з Расеі. Своеасаблівым музычным кіраўніком перадвыбарнай кампаніі прэм’ер-міністра выступіў Іосіф Кабзон. Ён заявіў, што грошай у яго багата і канцэрты «за Януковіча» ён дае па сваіх ідэйных перакананьнях. Акрамя яго, Украіну пад гэтым слоганам аб’езьдзілі сталыя ўдзельнікі «Славянскага базару» — Лаліта, Надзея Бабкіна, Наташа Каралёва, Клара Новікава, Валеры Меладзэ. З расейскіх рок-гуртоў у агітацыі за Януковіча быў заўважаны «Сплін».

Украінскія мэгазоркі Верка Сярдзючка і Руслана ў агітацыйных турах заўважаны не былі, аднак на адным са сваіх сольных канцэртаў пераможца «Эўрабачаньня-2004» сьпела разам зь Януковічам савецкі шлягер «Калі вясна прыйдзе, ня ведаю», пасьля чаго ўзьнялася вялікая хваля абурэньня, асабліва ў Львове, адкуль Руслана родам. Так што сьпявачцы прыйшлося склікаць экстраную прэс-канфэрэнцыю, дзе яна заявіла, што знаходзіцца па-за палітыкай, у нічыіх агітмерапрыемствах удзелу браць ня будзе і нават пагразіла судом абодвум кандыдатам, калі тыя скарыстаюць еейнае імя ў сваіх кампаніях.

Януковіча таксама падтрымалі прадстаўнікі эстраднай тусоўкі, якія, паводле выразу Алега Скрыпкі, «і за Кучму гралі, і за чортаву маму будуць граць». Гэта Ані Лорак, Натальля Магілёўская, Віктар Паўлік. Сярод больш-менш вядомых за межамі краіны — Ірына Білык, група «Грын Грэй» ды «Скрабін». Выступ на акцыях «за Януковіча» апошніх выклікаў абурэньне ва ўкраінскіх музычных прыхільнікаў. Мяркуючы па паведамленьнях на ўкраінскіх інтэрнэтфорумах, лідэр групы Кузьма (той самы, які прасьпяваў з Вольскім песьню «Суседзі») пазбавіўся часткі сваіх прыхільнікаў: «Зарабляньне грошай на такіх акцыях — гэта продаж нашай дзяржавы…» — абураецца сталы прыхільнік «Скрабіна». Цікава, што ў гасьцёўні на афіцыйным сайце групы падобныя паведамленьні адразу ж выдаляюцца.

> Прэзыдэнцкія выбары ва Ўкраіне падзялілі музычную супольнасьць на дзьве часткі. За Януковіча агітуе пераважна расейская поп-тусьня, за Юшчанку — украінскамоўныя рокеры.

Аднак большасьць калег Кузьмы па рок-сцэне занялі супрацьлеглую пазыцыю. Большасьць «генэралаў украінскага року» выступаюць за Юшчанку — «Воплі Відаплясава» (улюбёны гурт гэтага кандыдата ў прэзыдэнты), «Акіян Эльзы», «Плач Ераміі», «Мёртвы певень»,«Мандры», «Танок на майдане Конга», «Тартак». Іх агульная рыса — усе яны сьпяваюць па-ўкраінску.

Улады выкарыстоўваюць знаёмыя захады, каб нашкодзіць гэтым музыкам. Уведзеная негалосная забарона на трансьляцыю іх песень па ТБ, на канцэрце «ВВ» у Кіеве нечакана адрубілі сьвятло — Скрыпка пажадаў тым, хто гэта зрабіў, «вечнага энурэзу» і прадоўжыў выступ у цемры. За тое, што падчас выступу «ВВ» у Луганску невядомыя павесілі на сцэне расьцяжку «Любім «Воплі Відоплясова»! Верым Януковічу!», Скрыпка падаў на прэм’ера ў суд.

Цікавая акалічнасьць: калі музыкі, што выступаюць у падтрымку кандыдата ад улады, адкрыта не заклікаюць абраць менавіта яго, то «юшчанкаўцы» падтрымліваюць дэмакратычнага кандыдата ня толькі музыкай, але і сваімі прамовамі. Лідэр «ВВ» Алег Скрыпка нават стаўся даверанай асобай Юшчанкі. Тарас Чубай, лідэр «Плачу Ераміі», заявіў, што канцэрты «за Юшчанку» яны граюць бясплатна. Запрошаныя ж поп-сьпевакі, як гэта часта бывае, не валодаюць сытуацыяй. Тэмай для флэш-анімацыі сталася гісторыя, што здарылася на адной з акцый «Веру Януковічу» са сьпеваком Бедросам Кіркоравым. Пасьля свайго выступу той заклікаў галасаваць усіх прысутных… за Юшчанку! Потым ізноў выйшаў на сцэну, прынёс прабачэньні за прыкрую памылку, сказаў, што наш кандыдат — Януковіч і краіна будзе квітнець, калі прэзыдэнтам стане… Юшчанка!

**Сяргей Будкін**

# Украіна за крок ад рэвалюцыі

**Працяг са старонкі 4.**

Украінскі «Зубр» называецца «Пора». Прыхільнікі Віктара Ючшанкі абяцаюць сабраць каля Цэнтравыбаркаму ў ноч выбараў 500 тысяч чалавек. Толькі так можна засьцерагчыся ад падліку галасоў «па-беларуску». Адрозьненьне Ўкраіны ад Беларусі ў тым, што, калі адключаюць сайты незалежных СМІ і незалежнае ТБ, людзі аўтаматычна выходзяць на цэнтральную плошчу, тады як беларус застаецца сядзець перад тэлеэкранам у роспачы ад лічбаў Ярмошынай. «Ня вер і ня бойся», — гэтыя прынцыпы сярэдні ўкраінец запомніў нашмат лепш.

Юшчанка — нармальны эўрапейскі лідэр, спакойны, які адстойвае эўрапейскія вартасьці. «У выпадку ягонай перамогі Расея атрымае цывілізаванага суседа, які эўрапеізуецца, паступова адракаецца гаспадаркі «данецкага», г.зн. крымінальнага, тыпу, і на гэтым фоне будзе выглядаць яўна нявыйгрышным чынам. Або апынецца ў атачэньні краін-ізгояў, перадтваараючыся ў сьветач здаровага сэнсу на стэпавых эўразійскіх прасторах», — так бачыць дылему выбараў над Дняпром расейская «Gazeta.ru». Гэта вынятак сярод расейскіх СМІ, што піяраць «свайго сучага сына» Януковіча.

СНД часам падаецца клюбам махляроў, якія адмаўляюць сваім народам у свабодзе выбару. Калі не лічыць спэцыфічнага выпадку ўзгадаванага Эдуардам Шэварднадзэ Міхаіла Саакашвілі, Юшчанка — першы палітык прынцыпова іншага складу, які мае рэальныя шанцы атрымаць уладу на постсавецкай прасторы. Перамога Юшчанкі азначала б перамогу новых палітычных практык на тэрыторыі СНД. Менавіта таму Пуцін і Лукашэнка пасьпяшаліся падтрымаць Януковіча на сьвяткаваньні 60-годзьдзя вызваленьня Ўкраіны, тэрмінова перанесеным з 6 лістапада на 27 кастрычніка.

Атручваньне Юшчанкі — гэта толькі адзін з подлых спосабаў, якімі старая сыстэма будзе трымацца за ўладу і згрэбеную пад сябе ўласнасьць. Але яе падзеньне непазьбежнае хоць бы таму, што мэты, якія адстойвае Юшчанка, — гістарычна прагрэсіўныя. Гэта свабодная канкурэнцыя ў эканоміцы і палітыцы, свабода нацыянальнага разьвіцьця, перавага права над кланавасьцю. Пытаньне толькі ў тым, ці зможа Юшчанка перамагчы ва Ўкраіне сёньня, ці гэта адбудзецца нашмат пазьней. А таксама адбудзецца гэтая рэвалюцыя электаральным ці вулічным шляхам.

**Мікола Бугай**

Больш пра падзеі ва Ўкраіне на сайце www2.pravda.com.ua.




**Юшчанка — гэта альтэрнатыва ня толькі Януковічу, але й Пуціну, й Лукашэнку, стылю іхнага кіраваньня. Нават зьнявечаны атрутаю, ён іх палохае.**

# Сёньня за Карпатамі

Сяргей Харэўскі

Сёньня беларусы маюць пра Ўкраіну ўсё больш цьмянае ўяўленьне. Не сказаць, каб яно й за савецкімі было яснае: замест тысячагадовай непарыўнай суполнай традыцыі паўстаў савецка-маскоўскі стэрэатып, праз прызму якога ўспрымалася жыцьцё ў УССР. Але досьвед незалежнага існаваньня абедзьвюх дзяржаў ня толькі ня выправіў тых хібных стэрэатыпаў, але й нагрувасьціў іх яшчэ болей. Адно згадаць прызнаньне Лукашэнкі, што ўкраінская — ягоная любімая мова.

Едучы днямі па Заходняй Украіне, я не пасьпяваў зьдзіўляцца, наколькі ўсё тут дынамічна мяняецца й наколькі ўсё тое, што я бачу, безнадзейна не супадае са стэрэатыпамі бальшыні маіх суайчыньнікаў.

Уласна я ехаў у Закарпацьце, чароўны край, што гэтак надрыўна раіла ў свой час адведаць Сафія Ратару. Аднаго разу я ўжо тут бываў, яшчэ за савецкімі часамі. Тады з групаю беларускіх рэстаўратараў мы пераймалі ўкраінскі досьвед кансэрвацыі помнікаў і арганізацыі музэяў драўлянага дойлідства. Дарэчы, у сталіцы Закарпацьця, Вужгарадзе, — адзін з найлепшых скансэнаў Эўропы, дзе сабраны ўнікальныя ўзоры тутэйшага старасьвецкага будаўніцтва.

Гэтым разам мяне ня надта прыцягвала ўжо добра знаная мне экзотыка й насамрэч выдатныя помнікі архітэктуры. Я цікавіўся зьменамі, што адбыліся тут за апошнія паўтара дзясятка гадоў.

Зьмены й сапраўды ўразілі. Ад колішняе савеччыны не засталося й знаку. Затое зьявілася багата вугорскага — мовы, музыкі, рэчаў. Цэнтральны пляц цяпер носіць імя Шандара Пётэфі. Тутсама пастаўлены й зграбны помнічак яму. Справа ў тым, што Вужгарад пэўны час зваўся Унгвар. І спрэчкі вакол яго вяліся паміж вугорцамі, румынамі ды славакамі. А скончыліся яны, ўрэшце, на карысьць… украінцаў у 1944 г. Да сёньня тут украінцы жартуюць, што самы лепшы народ — вугорцы, бо сышлі адсюль у 1944-м. Але вугорцы й самы горшы народ, бо сышлі адны, бязь іх.

Этнічная стракацень і блізкасьць розных межаў адчувальная тут зь першага кроку, як выходзіш са станцыі: адразу абкружае абдойма таксоўшчыкаў, якія пытаюцца, у Вугоршчыну цябе везьці ці ў Славакію. І датуль, і датуль — тузін кілямэтраў. Па тутэйшым тэлебачаньні сёньня ідуць чатыры ўкраінскія каналы, два вугорскія, славацкі ды румынскі. Вугорская, славацкая й румынская мовы гучаць з вуснаў ці не часьцей за ўкраінскую. Зрэшты, і ўкраінская тут — куламеса гуцульскіх дыялектаў, таму злавіць зьмест фраз на вуха зусім няпроста. Тутэйшы люд вельмі выразна адмяжоўвае сябе ад астатніх украінцаў, а перадусім ад галічан. Жарт: найгоршыя людзі — гэта галічане! Чаму? Бо галічане!




**Прагматызм адчуваецца тут паўсюль. Ідзе ён найперш ад тутэйшых кальвінісцкіх традыцый. Аскетычныя бажніцы рэфарматаў са сьпічастымі дахамі вызначаюць дух тутэйшае архітэктуры.**

Тутсама, у Вужгарадзе, ёсьць нават нечуваная, як для Беларусі, рэч — цыганскія школы й адмысловыя праграмы па прафэсійнай падрыхтоўцы для цыганоў. Тутэйшыя цыганы, якіх тут безьліч, зусім цяпер не падобныя да савецкіх — мурзатых. Яны тут цалкам шанаваныя й сацыяльна адаптаваныя грамадзяне, пра якіх я не пачуў нічога кепскага. Нічога благога тут ня скажуць і пра расейцаў, бо тутэйшыя расейцы ў бальшыні сваёй — нашчадкі белае эміграцыі 1920-х гадоў. Яны тут збудавалі сабе апрычоную царкаўку ў чыста маскоўскім кшталце і сваю гімназію. А з тутэйшымі не сыходзяцца й дасюль, як вада з алеем.

Багата добрага гавораць сёньня тут пра жыдоў, якія сталіся ахвярамі Галакосту толькі ў апошнія дні вайны (праз вугорскіх фашыстаў). Ад колішняе найбагацейшае габрэйскае спадчыны тут засталося багата сынагог, у найпрыгажэйшай зь якіх цяпер філярмонія. Закарпатцы кажуць жартам, што дзякуючы менавіта гэтаму вандроўнаму народу хутка расла нацыянальная самасьвядомасьць закарпатцаў, разьвіваўся фальклёр і каапэратыўны рух. А ўдзячныя жыды падаравалі вужгарадцам памяшканьне пад абласную філярмонію. Дарэчы, я аслупянеў, утаропіўшыся ў лукашэнкаўскі сьцяг на былой сынагозе. Высьветлілася, што акурат тымі днямі ў Вужгарадзе праходзіў міжнародны фэст лялечных тэатраў.

Пра Беларусь тут ведаюць сёньня куды меней, чым пра Славаччыну. Наш край проста адсутнічае ў тутэйшай інфармацыйнай прасторы, а таму любыя байкі пра Беларусь успрымаюцца са шчырым зьдзіўленьнем. У адрозьненьне ад Кіева, тут нават журналісты ня ведаюць, што іхны прэм’ер Януковіч — беларус. А як і дазнаюцца, ня ведаюць як рэагаваць. Дзе тая Беларусь? Пэўна, ня блізка… Ну вось, нічога яны ня могуць сказаць пра Лукашэнку. Нічога! Бо кепска ведаюць.

Затое мая спадарожніца — беларуска сталага веку, што воляю лёсу цяпер жыве ва Ўкраіне, жвава рэагуе на факт беларускасьці Януковіча. Насуперак майму спадзеву яна катэгарычна адмаўляецца за яго галасаваць, менавіта праз ягонае паходжаньне. «Хіба яны, беларусы, умеюць жыць па-людзку?» — злосна пытаецца ў мяне зямлячка. Мае права. Толькі што наведала Бацькаўшчыну, каб пахаваць маці. «Буду галасаваць за Юшчанку, бо ў яго, кажуць, жонка — амэрыканка. То яны разам мо зробяць што да лепшага».

Прагматызм адчуваецца тут паўсюль. Ідзе ён найперш ад тутэйшых кальвінісцкіх традыцый. Аскетычныя бажніцы рэфарматаў са сьпічастымі дахамі вызначаюць дух тутэйшае архітэктуры. А вось грамада былога касьцёлу езуітаў, цяперашняга грэка-каталіцкага сабору, глядзіцца пекнай экзотыкай самавітага, ні на што не падобнага кшталту. Пры тым саборы — старасьвецкая ўніяцкая сэмінарыя, што адыграла вялікую ролю ў русінскім нацыянальным руху. Мэмарыяльныя шыльды й помнічкі дзеячам грэка-каталіцкае царквы — сёньня шанаваныя сьвятыні. Дарэчы, у Вужгарадзе за ўсе апошнія гады не збудавалі ніводнага новага храму. Таксама прыкмета здаровага прагматызму. Затое набудавана новых гатэльчыкаў, рэстаранчыкаў, кавярняў, што ніколі не пустуюць.

Смачны гуляш, жыцьцядайны чардаш ад вулічнага музыкі, гандаль сувэнірамі й карцінамі на вуліцах — такі сёньня Вужгарад. Увесь стары горад цалкам адрэстаўраваны, і мне ён найболей нагадаў літоўскую Коўню. Таксама тут гойсае моладзь на роліках і школьнікі шчабечуць па мабільніках. Даўно раскінуліся шыкоўныя газоны і ўклаўся дэкаратыўны бручок. Вырасьлі кварталы прыватных дамоў пад дахоўкаю, у засені духмяных вінаградных гронак, што п’янка-весела аддаюць свой шчодры водар на вечарох. Няма і сьледу ад колішняе базарна-«камковае» ліхаманкі. Усё дыхтоўна і ў меру салідна.

Тутэйшы шматмоўны люд мала турбуюць глябальныя палітычныя праблемы. Інтэлігенцыя наракае, што адзіная кніжка, якую прачыталі ўсе закарпатцы, — «Буквар», але, маўляў, гэта было гэтак даўно, што жвавага абмеркаваньня прачытанага матэрыялу ня выйдзе.

Надвячоркам, шпацыруючы ўздоўж бурапеннае ракі, адкрыў для сябе старасьвецкі батанічны сад. Цалкам вольны ўваход, цнатлівая цішыня ў засені экзатычных расьлінаў, дзе суседзяць і сэквоі, і магноліі. Тут можна ня толькі спакойна пасядзець у зацішку на лаве, але й беспакарана паласавацца паўднёвымі пладамі. Над садам пакрысе гусьцеў цень ад старадаўняга замку. Тутсама міжволі згадалася й тое, што Закарпацьце ганарыцца тым, што ў іх, каля сяла Дубовага, што на Цісе, — цэнтар Эўропы. Зрэшты, самакрытычныя й дасьціпныя закарпатцы самі кажуць: «Вось, апошнім часам той самы Цэнтар паадкрывалі ў сябе ці ня ўсе суседзі. Але мы ж ведаем, чый сапраўдны!»

*Вужгарад—Менск*




**Вулка Вужграду.**

# Сон дэмакратыі: парадаксальная фаза

Віталь Тарас

Апошнім часам беларускія палітыкі ўсьлед за журналістамі сталі ахвотна ўжываць выраз «дэжа вю» («тое, што ўжо было»). Гэты мілагучны францускі выраз выклікае ў памяці галянтны расейскі вершык: «Вы хотите бланманже? Нет, спасибо, — я уже». Што да сытуацыі, якой яна выглядае цяпер у Беларусі, тут хутчэй падыходзіць іншае замежнае слова — «маразм». Яно азначае ў літаральным перакладзе «застой».

Успышка кантраляванай ярасьці ў цэнтры Менску ў першыя дні пасьля рэфэрэндуму яшчэ больш выразна высьветліла карціну застою, ці, лепш сказаць, заняпаду палітычнага жыцьця. Ужо да рэфэрэндуму было ясна, што пасьля яго асноўная крытыка сьвядомай часткі грамадзтва (калі яно яшчэ існуе) абрынецца на апазыцыю, якая гэтую частку грамадзтва прэзэнтуе. Таму апазыцыю, а значыць — саміх сябе, было крыху шкада.

Але шкадаваць ужо позна. Усё, што сапраўды лёгка можна было прадбачыць — нават чалавеку, далёкаму ад палітыкі, — зьдзейсьнілася. Вынікі рэфэрэндуму апазыцыя слушна абвясьціла сфальшаванымі, а самі выбары — недэмакратычнымі. Улада паклапацілася, каб іншых высноў у назіральнікаў, у першую чаргу эўрапейскіх, проста не магло ўзьнікнуць. На гэтым фоне апэляцыя да Захаду з боку апазыцыі выглядае, як заўсёды, двухсэнсоўна. Па-першае, выходзіць, што апазыцыя не давярае заходнім дзяржавам, ня верыць у здольнасьць іх урадаў саміх ацаніць тое, што адбываецца ў Беларусі, ці ў іхную рашучасьць асудзіць парушэньне правоў і свабод з боку беларускіх уладаў.

Але ня гэта галоўнае. Што калі б Захад сапраўды аднойчы зрабіў выгляд, што ніякіх парушэньняў і гвалту ў нас ня бачыць, — як гэта здаралася часам у дачыненьні да СССР, як гэта здараецца сёньня ў дачыненьні, скажам, да Азэрбайджану ці Лівіі ды нават і Расеі? Тады трэба было б спыніць усялякі супрацу дыктатуры? Ці, можа, увогуле дэмакратыя патрэбна толькі Захаду, а не Беларусі?

Фізіёлягі ведаюць такую асаблівасьць чалавечага арганізму — калі чалавек толькі прачынаецца, зусім ціхія гукі, што даносяцца здалёк, успрымаюцца як вельмі моцныя, а гукі над самым вухам (напрыклад, званок будзільніка) можна спачатку й не пачуць. Гэта называецца «парадксальнай фазай сну». Вось ужо колькі год запар вядомыя дзеячы апазыцыі пільна прыслухоўваюцца: што скажа Дзяржэпартамэнт, што скажа Эўразьвяз, Эўрапарлямэнт, ПАРЭ, рабочая група ПА АБСЭ, БДІПЧ, ААН etc. І ня чуюць таго, пра што кажуць суседзі па лесьвічнай пляцоўцы. Прыгожы міт аб тым, што «нас даўно большасьць, толькі ня ўсе пра гэта ведаюць», не працуе. Бо лаяць уладу на кухні — гэта адно, а выйсьці на плошчу, як гэта зрабілі «зубры» і «маладафронтаўцы», — зусім іншае. Што зусім не азначае, быццам народ — быдла. Гэта ўсяго толькі азначае, што апазыцыя дагэтуль не змагла пераканаць і перацягнуць на свой бок бальшыню насельніцтва. Факт застаецца фактам, нягледзячы на тое, што падчас рэфэрэндуму «за», згодна з экзыт-поламі, прагаласавалі менш за палову выбарцаў.

На трэці дзень зьбіваньняў і затрыманьняў удзельнікаў маніфэстацыі пратэсту ў Менску «Пяцёрка-плюс» вуснамі сваіх лідэраў заявіла, што досыць ужо кідаць моладзь пад дручкі амапаўцаў і тым самым прыносіць радасьць садыстам у міліцэйскіх мундзірах. Гэты патас чымсьці нагадвае патас дзяржаўнай прапаганды. Толькі карыстаецца яна, вядома, іншымі словамі. Беларускае тэлебачаньне ўдзельнікаў дэманстрацыі запісала ў «нявыхаваных падлеткаў», а амапаўцаў — у іхных «выхавацеляў». Садыстаў сярод іх, што праўда, хапае. Іншыя людзі, відаць, у міліцыянты ідуць нячаста. Але як доўга й сыстэматычна працавала апазыцыя з гэтай катэгорыяй насельніцтва? Некалі, здаецца, спрабавала працаваць, але потым кінула. Занадта цяжкая гэта справа — агітаваць несумленных міліцыянтаў, былых вясковых хлопцаў. Куды прасьцей працаваць са сталічнай моладзьдзю: падняслі запалку — успыхне. Толькі ці доўга будзе гарэць такі агонь?

Тых, хто падносіць запалкі, гэтае пытаньне, здаецца, ня надта турбуе. Яны больш заклапочаныя тым, каб захаваць статус жрацоў, якім дазволена быць адзінымі захавальнікамі ахвярнага агню.

Можна напісаць, напрыклад, у рэпартажы на папулярным інфармацыйным сайце, быццам ніводзін лідэр ніводнай апазыцыйнай партыі не асьмеліўся прыйсьці на Кастрычніцкую плошчу падтрымаць акцыю, зладжаную кааліцыяй «Свабодная Беларусь», «Зубром» і «Маладым фронтам». А калі наступным днём «незаўважанага» палітыка Лябедзьку па-зьверску паб'юць амапаўцы, аўтары сайту, вядома, ня стануць прасіць у яго прабачэньня за «недакладнасьць». Яго проста запішуць у актыў «сваёй» арганізацыі, як запісваюцца ў актыў усе ахвяры рэжыму, незалежна ад іх партыйнай прыналежнасьці. Так бы мовіць, плюралізм у дзеяньні.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Колькі год запар апазыцыя пільна сочыць: што скажа Дзярждэп, што скажа Эўразьвяз, Эўрапарлямэнт, ПАРЭ, рабочая група ПА АБСЭ, БДІПЧ, ААН etc. І ня чуюць таго, пра што кажуць суседзі па лесьвічнай пляцоўцы. Справа тут і ў мэтах, і ў мэтадах.

Калі няма грамадзкай супольнасьці, няма сярэдняй клясы ў грамадзтве, няма «думаючай меншасьці» (а ёсьць толькі адзінкі, у якіх захавалася патрэба думаць), тады ўлада і апазыцыя ператвараюцца ў свайго роду спалучаныя сасуды.

Усе заганы, пашыраныя на ўсіх ступенях уладнае вэртыкалі, — прага ўлады, хцівасьць, фанабэрыя, амаралізм — усё гэта лёгка і незаўважна пераліваецца ў асяродзьдзе апазыцыі. Пры ўсеагульнай адсутнасьці маральных бар'ераў пераход з уладаў у апазыцыю робіцца пашыранай зьявай, прыкладаў чаго мы мелі за апошнія гады ажно зашмат. Пераход з апазыцыі ва ўладу адбываецца радзей, чаму таксама ёсьць тлумачэньне — карыта льготаў і прывілей для васалаў не гумовае, месца ля яго трэба заслужыць. Асаблівай заслугай лічацца крайні цынізм і непераборлівасьць у атрыманьні матэрыяльных даброт, праяўленыя падчас апазыцыйнай дзейнасьці. Але не пра такіх людзей размова.

Некалькі год таму на адным з апазыцыйных сайтаў зьявіўся пасквіль на прэзыдэнта. Там упершыню, відаць, згадвалася вэрсія яго цыганскага паходжаньня. Пры гэтым рабіўся празрысты намёк, што справа можа быць яшчэ горшай — кіраўнік дзяржавы насамрэч можа быць напалову габрэем. Мне давялося тады гутарыць з адным апазыцыянэрам, у якога я пацікавіўся меркаваньнем наконт відавочна гнюснай публікацыі. І той пачаў даводзіць, што прэзыдэнт Беларусі карыстаецца настолькі амаральнымі мэтадамі ў барацьбе з дэмакратамі, узводзіць такі жудасны паклёп «на нас», што зусім апраўдана рабіць у адказ нешта падобнае. Паколькі, на думку суразмоўніка, у народзе пашыраны антысэмітызм, трэба выкарыстаць гэта ў сваіх мэтах.

У свой час генэральны пракурор СССР Андрэй Вышынскі ці нехта іншы са сталінскіх памагатых прыдумаў апраўданьне катаваньням у савецкіх турмах. Усяму сьвету вядома, што камуністаў у капіталістычных засьценках бязьлітасна мардуюць і забіваюць. Таму савецкія камуністы маюць поўнае права на клясавую помсту ад імя савецкай дзяржавы. І савецкія сьледчыя ня толькі маюць маральнае права — яны проста абавязаны ўсімі спосабамі, у тым ліку фізічнымі, здабываць паказаньні «ворагаў народу», якія працуюць на міжнародны імпэрыялізм. (У сваім азначэньні апазыцыі як «агентаў уплыву», як бачым, Лукашэнка недалёка адышоў ад Вышынскага.)

Яшчэ раней пра нейкую асаблівую пралетарскую мараль казаў Ленін.

Чымсьці падобным замест маралі, падаецца, карыстаюцца і некаторыя сучасныя рэвалюцыянэры. Не, барані Божа, яны не катуюць і не забіваюць сваіх ворагаў. Іх мэтады больш далікатныя. Распаўсюджваньне зламысных чутак пра апанэнтаў (хай сабе і непацьверджаных), дыскрэдытацыя адных людзей (ці арганізацый) у вачах іншых, сутыканьне іх ілбамі, «заплечная дыпляматыя» — усё гэта эфэктыўна дзейнічала і 70, і 100, і 250 год таму. Толькі сёньня падобнае езуіцтва прыкрываецца ідэяй барацьбы за эўрапейскую дэмакратыю. Барацьбы, у якой, вядома ж, усё дазволена.

Нездарма ў падручніках па гісторыі КПСС адным з галоўных ворагаў марксізму называлі сацыяліста Карла Бэрнштэйна. Асаблівую ярасьць у марксістаў выклікала яго думка «Рух — усё, канчатковая мэта — нішто». Якой дарогай мы рушым, за кім і з кім мы рушым — туды й прыйдзем. Уласна кажучы, ужо прыйшлі. Далей ісьці няма куды.

Сёньняшняя рэчаіснасьць у Беларусі нагадвае карыкатуру ў стылі газэт «Правда» ці «Советская Белоруссия» («Беларусь сегодня») канца 40-х гадоў, дзе ўсе пэрсанажы абавязкова пазначаліся тлумачальнымі надпісамі, накшталт «кат Ціта, агент Уол-Стрыта» альбо «прадажныя журналісты», «нямецкія рэваншысты», «падбрэхічы Вашынгтону» і г.д. Цяпер дыяпазон навешваньня ярлыкоў стаў большы: могуць запісаць і ў «агенты Крамля», і ў «ворагі дэмакратыі». Куды б ты ні пайшоў, што б ні зрабіў, на табе абавязкова паставяць штамп: «наш» — «нянаш», «свой» — «чужы». Такое ўражаньне, што на самой Беларусі нехта ўсёмагутны паставіў пячатку: «у архіў». Толькі ў гэтым пыльным запусьцелым «архіве» жывуць людзі. І глухая ярасьць адчаю, загнаная глыбока ўнутр, іншым разам прарываецца вонкі, на вуліцы. Ды ярасьць хутка згасае, як згасае полымя запалкі ў начной цемры на халодным восеньскім ветры.

***P.S.*** Забыўся сказаць — «парадаксальную фазу» сну чалавек праходзіць ня толькі перад абуджэньнем, але і перад тым, як глыбока заснуць.

## Урыўкі з дакладу ЦРУ, у якіх гаворыцца пра супрацу Беларусі з Хусэйнам

**Працяг са старонкі 2.**

**Генерал Пётар Рагажэўскі** – намесьнік міністра абароны па ўзбраеньнях.

### Матэрыялы, абсталяваньне і паслугі, пастаўленыя зь Беларусі

Захопленыя дакумэнты сьведчаць, што ў сьнежні 2002 г. **прадпрыемства «Балмаралс»** заключыла кантракт 148/2002 з «Ал-Кіндзі Джэнэрал Компані» па дастаўцы электронных кампанэнтаў (для сыстэмы радарнай блякіроўкі) вартасьцю $70,367. Гэты кошт уключаў дастаўку праз Сырыю… у Багдад.

«Белмэталэнэрга» быў замяшаны ў пастаўкі карпусоў і матораў для танкаў Т-72 і мадэрнізацыю ракет проціпаветранай абароны SA-2 і радарных сыстэм.

**Аляксандар Дзегцяроў – яшчэ адзін з найбуйнейшых удзельнікаў незаконнага гандлю.** Дзегцяроў – расейскі спэцыяліст па ракетных сыстэмах наводзеньня і кантролю. Шаўцоў прадставіў Дзегцярова іракскай Камісіі па вайсковай прамысловасьці. Дзегцяроў валодаў беларускімі кампаніямі «**Сыстэмтэк» і «ЭлектрыкГазКом»**, якія мелі кантракты з Іракам праз «Інфабанк» на пастаўку сыстэмаў радарнага кантролю плюс і наводкі для ракет SA-2. Абсталяваньне даставілі праз Сырыю і аплацілі праз яе банкі.

Дзегцяроў рэгулярна наведваў Багдад. Паводле высокапастаўленых і сярэдніх чыноў з Камісіі па вайсковай прамысловасьці, якія мелі непасрэдны доступ да інфармацыі, Дзегцяроў бываў у Іраку кожныя два тыдні. «ЭлектрыкГазКом» падпісаў кантракт з іракскай дзяржаўнай кампаніяй «Аль-Карамах» на вытворчасьць і тэстыроўкі сыстэмаў навядзеньня і кантролю для такіх ракет тыпу «зямля-зямля», як «Аль-Самуд». Гандаль таксама ўключаў продаж гіраскопаў і аксэлеромэтраў… «ЭлектрыкГазКом» меў кантракты і зь дзяржаўнай кампаніяй «Аль-Батані» на пастаўку тэхналёгіі па вытворчасьці для іракскага досьледнага праекту па спадарожніках.

Найважнейшым экспартам зь Беларусі ў Ірак былі радарныя тэхналёгіі й сыстэмы проціпаветранай абароны. Захопленыя дакумэнты й паказаньні іракскага афіцэра сярэдняга рангу з доступам да інфармацыі пацьвярджаюць існаваньне сумеснага беларуска-іракскага праекту (лістапад 2000 г. — сакавік 2003 г.) па ўдасканаленьні P-18 (Mod Spoon Rest), радара раньняга папярэджаньня. Радар выкарысталі ў Цэнтры проціпаветранай абароны Аль-Габан'ях.

«Сыстэмтэк» забясьпечваў дапамогу ў выпрабаваньнях і прамысловых запусках. Доктар Раскоўка (?) быў старэйшай афіцыйнай асобай у «Сыстэмтэк», ён наведваў Ірак кожныя 3—4 месяцы цягам апошніх трох год. Іракцы хацелі набыць сыстэму проціпаветранай абароны С-300. Кантракт быў падпісаны і трэнінг распачаты, але праблемы матэрыяльна-тэхнічнага забесьпячэньня, каб даставіць сыстэму, не прыцягваючы ўвагі міжнароднай супольнасьці, аказаліся непераадольнымі.

Паводле іншых паказаньняў, Беларусь рабіла шмат паставак незаконных тавараў у Ірак. У іх ліку абсталяваньне для танкаў Т-72 і Т-55; «Волга», «Пячора» (SA-3) ды іншыя ракетныя проціпаветраныя сыстэмы; верталёты Мі-17, запчасткі для МіГ-23, -25 і -29 ды для рэактыўных самалётаў Су-25; сыстэмы лазэрнага навядзеньня; валаконная оптыка; інфрачырвоныя элемэнты; глушылкі GPS… Нават перад самай вайной незаконны гандаль Беларусі і Іраку не спыняўся, як паказваюць перахопленыя дакумэнты. Беларусь пастаўляла ПН-5 і ПН-7 прыборы начнога бачаньня для Іраку праз падстаўную кампанію «Аль-Башаір». **За тры месяцы да ваеннага канфлікту прэзыдэнт Лукашэнка праінструктаваў беларускае Міністэрства абароны дазволіць Іраку набыць любое вайсковае абсталяваньне.**

### Аплата з Іраку ў Беларусь

Галоўная крыніца даходу для фінансаваньня незаконнага гандлю з Іракам выявілася ў іракска-сырыйскім гандлёвым пратаколе. Як сьведчаць захопленыя дакумэнты… беларускі ўрад атрымаў ад Ірака каля 114 млн даляраў у якасьці аплаты.

Паводле паказаньняў затрыманага, крытычным фінансавым элемэнтам у гэтым незаконным гандлёвым працэсе адыгрываў «Інфабанк». Беларусь патрабавала аплату 75% ад вартасьці кантрактаў у цьвёрдай валюце перад тым, як тавар дастаўлены. Ірак не пагаджаўся. Таму «Інфабанк» пагадзіўся пакрываць 75% перадаплаты за ганарар памерам 15% ад кошту кожнага кантракту. Адзін з былых кіраўнікоў Камісіі па вайсковай прамысловасьці Іраку лічыць, што перад пачаткам вайны «Інфабанк» меў каля 7 млн іракскіх грошай на сваіх рахунках.

Адзін з кіраўнікоў Камісіі па вайсковай прамысловасьці паведаміў пра тое, як паветраная лінія паміж Багдадам і Менскам была адкрытая летам 2000 г.… на якой працавалі чатыры «Боінгі-747», якія перавозілі… тавары, экспэртаў і афіцыйных асобаў непасрэдна ў Багдад пад прыкрыцьцём гуманітарных місіяў.

**Паводле www.svaboda.org**

# Сакрэт нацыяналіста Фідэля




Тыя, хто лічыць правадыра кубінскай рэвалюцыі адным з апошніх абаронцаў марксізму, памыляюцца. Ён найперш нацыяналіст і абаронца Цэнтральнай Амэрыкі ад сквапных грынга.

«Вечны» камандантэ Фідэль упершыню за 40-гадовую кар'еру выступоўцы спатыкнуўся перад грамадой. Што ж, аднак, дазволіла Кастра пратрымацца так доўга?

Тыя, хто лічыць правадыра кубінскай рэвалюцыі адным з апошніх абаронцаў марксізму-ленінізму, памыляюцца. Ён найперш нацыяналіст. І зразумець яго можна толькі ў кантэксьце кубінскай традыцыі.

Лёс Кубы склаўся так, што тут было мала прыдатных умоў для ўзьнікненьня нацыянальнага кансэрватызму. У гісторыі выспы не было часу, які можна акрэсьліць як залатую пару, а значыць, арыенцір для нацыі. Карэнныя жыхары былі вынішчаны, новае насельніцтва складалася з чужынцаў — белых паноў і іх чорных рабоў. Таму кубінскі нацыяналізм з самага пачатку ўзьнікаў як плынь рэвалюцыйная. Мінулае (калянізацыя і рабства) інтэрпрэтаваласа як першародны грэх, што спарадзіў амаральнае грамадзтва, якое трэба зьнішчыць. Кубінская эліта, аднак, не сьпяшалася рызыкаваць сваім прывольным становішчам, якое грунтавалася на працы нявольнікаў. У выніку Куба апынулася падчас барацьбы амэрыканскіх калёній за незалежнасьць у ролі Вандэі, атрымаўшы за тое ад Гішпаніі сумнеўнае званьне «заўжды вернай выспы». Гэта не магло не садзейнічаць далейшай радыкалізацыі грамадзкай думкі ў краіне.

Агульнапрызнаны настаўнік кубінскага народу Хасэ Марці (чыё імя носяць і пабудаваны Фідэлем гаванскі аэрапорт, і тэлебачаньне кубінскай эміграцыі) так сфармуляваў гістарычнае прызначэньне Кубы:

а) стаць узорам для ўсяго кантынэнту. Пазьбегнуць сацыяльнай несправядлівасьці і дыктатуры;

б) быць абаронцай астатняй Амэрыкі ад сквапных грынга.

Выйшла, аднак, наадварот. Карупцыя і нестабільнасьць у незалежнай Кубе пабілі нават лацінаамэрыканскія паказчыкі. У паўночнага суседа капіявалася ўсё, акрамя дэмакратычных інстытутаў. Сярод бунтоўнай моладзі ўзьнікла перакананьне, што ідэям Апостала Марці здрадзілі і трэба вярнуцца да іх. Правадыром гэтых дысыдэнтаў зрабіўся малады адвакат Кастра. Супрацьстаяньне ЗША натуральна прыводзіць яго ў савецкія абдымкі. Дэкляруючы адначасова адданасьць ідэі сацыялістычнага адзінства і ў той жа час незалежнасьць ад СССР, новы кубінскі рэжым стаў самым надзейным пасрэднікам дзеля перадачы братэрскай дапамогі туды, дзе Масква не хацела сьвяціцца. Самой Кубе эканамічная падтрымка з усходу, аднак, не дапамагла стварыць эфэктыўную эканоміку. І калі Расея перастала купляць кубінскі цукар, усе былі перакананы, што цяпер кубінскай рэвалюцыі канец.

Чаму ж гэтага ня здарылася? Рэвалюцыя на Кубе яшчэ занадта маладая, яшчэ жывыя тыя, хто непасрэдна пацярпеў ад яе тэрору і экспрапрыяцый, працягваецца зьдзек з дысыдэнтаў. Гэта прымушае кубінскіх сілавікоў быць адданымі рэвалюцыйнаму кіраўніцтву. Акрамя таго, трэба аддаць камандантэ належнае. Дадзеная ім хай сабе і абмежаваная эканамічная свабода ўжо спарадзіла клясу багатых — пераважна тых, хто мае адносіны да апэрацый з валютай. Ім таксама ня хочацца рызыкаваць набытым у рынкачнай стыхіі. Аб ёй мяркуюць пераважна па расейскіх навінах.

Некалькі разоў камандантэ абяшчаў аб намерах весьці дыялёг з канструктыўнай часткай эміграцыі. Але ўсё разбуралася праз патрабаваньне апошняй даць ёй эфір на радзіме. Што тычыцца апазіцыі на самой Кубе, то яе цяпер лічаць за лепшае не саджаць (хоць гэтай звычкі ня кінулі), а зьбіваць і выцясьняць з выспы, амаль сілай выштурхоўваючы яе за мяжу.

Ад самага пачатку рэвалюцыя, паводле агульнага меркаваньня, трымалася на камандантэ. Што будзе, калі яго раптам ня стане? Напэўна можна сказаць толькі адно: Кубе яшчэ доўга давядзецца адвыкаць ад дыктатуры.

**Вацлаў Шаблінскі**

# У пошуках новага іміджу

**На мінулым тыдні ў цэнтры ўвагі брытанскіх мэдый была Нямеччына. Дакладней, не сама гэтая краіна, а яе імідж у Брытаніі. Нагодай для супярэчлівых дыскусій сталася агучаная міністрам замежных спраў Нямеччыны Фішэрам у інтэрвію BBC крытыка нібыта неадпаведнага вобразу Нямеччыны на Брытанскіх выспах. У той час як адносіны між краінамі выдатныя, што дэманструе заплянаваны на наступны месяц візыт ангельскай каралевы ў Нямеччыну, гістарычныя стэрэатыпы, на думку Фішэра, перашкаджаюць лепшаму паразуменьню, асабліва маладых брытанцаў і немцаў.**

Інтэрвію такога кшталту перад афіцыйнымі візытамі замежных кіраўнікоў Эўразьвязу сталіся традыцыяй, што дазваляе час ад часу зірнуць на дачыненьні паміж хаўрусьнікамі і акрэсьліць іхныя пэрспэктывы. Незвычайным быў даволі рэзкі тон выказваньняў Фішэра, а таксама ягонае імкненьне ўскласьці ўсю адказнасьць на хібы ў нямецка-брытанскіх стасунках на брытанскі бок. Так, Фішэр абвінаваціў брытанскую прэсу ў звароце да старых стэрэатыпаў, якія з сучаснасьцю нічога супольнага ня маюць. Прыкладам, паводле ягоных слоў, калі нехта хоча ўбачыць, як выконваецца клясычны прускі шыхтовы крок, варта паглядзець брытанскую тэлевізію. У той жа час маладзейшыя пакаленьні немцаў, паводле слоў Фішэра, выхоўваліся не ў старой мілітарысцкай традыцыі, а пры дэмакратыі і таму панятку ня маюць, што такое шыхтоўка.

Афіцыйныя нямецка-брытанскія стасункі знаходзяцца калі не ў бліскучым, дык, прынамсі, у стабільным стане. Намаганьні эліт дзьвюх краін дзеля загойваньня ранаў другое сусьветнае вайны могуць паслужыць прыкладам цывілізаванага падыходу да разьвязваньня гістарычных праблем.

Адным з самых кранальных эпізодаў прымірэньня былых ворагаў быў удзел брытанцаў у адбудове разбуранай падчас вайны Жаночае царквы ў Дрэздэне. Крыж для царкоўнага купалу быў выраблены брытанскім кавалём, бацька якога ўдзельнічаў у беспрэцэдэнтным па сваёй разбуральнасьці авіяналёце хаўрусьнікаў на Дрэздэн у 1945 г. Гмах нямецкага парляманту Бундэстагу быў перабудаваны брытанскім архітэктарам сэрам Норманам Фостэрам. Нягледзячы на гэта, ва ўяўленьнях простых брытанцаў і немцаў пакуль што застаецца месца для недаверу і гістарычных забабонаў. Дзеля справядлівасьці заўважым, што шмат у якіх брытанскіх мэдыях Нямеччына і немцы насамрэч падаюцца іранічна і суб'ектыўна. Шмат у чым гэта зьвязана таксама з жаданьнем брытанцаў захаваць сваё адасобленае становішча ў Эўразьвязе і іхным крытычным стаўленьнем да ўсяго, што паходзіць з кантынэнту.

І ўсё ж цалкам пагадзіцца з Фішэрам цяжка. Цяжка хаця б таму, што імідж Брытаніі ў нямецкіх мэдыях не нашмат лепшы. Там Брытанія падаецца як краіна неўтаймаванага турбакапіталізму, дзе просты чалавек стаецца ахвярай прагных прадпрымальнікаў і можа быць звольнены з працы за лічаныя хвіліны. У спрэчках пра будучыню нямецкае сацыяльнае сыстэмы англасаксонская лібэральная мадэль даўно ператварылася ў страшылку для запалохваньня прызвычаеных да шчодрых дзяржаўных датацый нямецкіх бюргераў. Гэта далёка не спрыяе пазытыўнаму вобразу Брытаніі сярод немцаў. А тут яшчэ дадаліся прынцыповыя адрозьненьні ў замежнапалітычнай арыентацыі дзьвюх краін, бо Брытанія застаецца арыентаванай на Амэрыку, у той час як Нямеччына шукае свае прыярытэты сярод «мультылятэралістаў». У гэтым сьвятле шмат якія немцы разглядаюць Брытанію як здрадніцу эўрапейскіх інтарэсаў.

Па-другое, у самой Нямеччыне, як і ў Брытаніі, тэма другое сусьветнае вайны застаецца на першым пляне. Паводле частаты зьяўленьня на экранах нямецкіх тэлевізараў Адольф Гітлер можа паспрачацца з самымі вядомымі пэрсанажамі масавае культуры. Прыкладам, надоечы атрымала розгалас новая нямецкая кністужка «Der Untergang» («Крах») пра падзеі апошніх дзён Трэцяга Райху ў асабістым бункеры Гітлера ў Бэрліне. Нямецкі бамонд нават цешыцца надзеяй на атрыманьне стужкай прэміі «Оскар». Няцяжка прадбачыць, што міжнародны посьпех кінастужкі толькі ўзмоцніць асацыяваньне сучаснай Нямеччыны з гітлерызмам. Нямецкія мастацтвазнаўцы ўхваляюць фільм як спробу паглядзець на фюрэра з дагэтуль не дасьледаванага боку — як на звычайную асобу. Быццам бы пасьля столькіх фільмаў і літаратурных твораў пра Гітлера ў ягонай асобе яшчэ застаецца нейкая загадкавасьць. Таксама вартае крытыкі ўзгадваньне пра нялюдзкія злачынствы нямецкіх нацыстаў толькі пад самы канец стужкі. Так ці інакш, Нямеччына сама знаходзіцца ў палоне гітлераманіі. Праўда, пытаньні, якія ставяць немцы ў сваіх спробах па-новаму зірнуць на вайну, адрозьніваюцца ад іншых краін. Тут на першым пляне стаіць пакутлівы роздум, як гэта ўсё магло адбыцца і чаму яны пацярпелі паразу, у той час як тыя самыя брытанцы варожаць, што было зь імі, калі б Гітлер перамог.

Што тычыцца брытанскіх стэрэатыпаў пра Нямеччыну, то падаецца, што яны ў значнай ступені палягаюць і ў вельмі абмежаванай цікавасьці брытанцаў да сучаснае Нямеччыны. Таксама ня надта вялікі імпэт праяўляецца брытанцамі да вывучэньня нямецкае мовы. У гэтым сэнсе прапанова Фішэра ўзмацніць студэнцкі абмен паміж дзьвюма краінамі наўрад ці прынясе жаданыя вынікі. Зь нямецкага боку ахвотных вучыцца ў Брытаніі і без таго хапае, а вось брытанцы куды больш цікавяцца эканамічна дынамічнымі заакіянскімі краінамі. Зрэшты, прычыны гэткае абыякавасьці да аблічча сучаснае Нямеччыны за мяжой трэба шукаць у самой гэтай краіне. Пасьляваенная Нямеччына пакуль не знайшла свае ідэнтычнасьці, хаця ўжо амаль што тры пакаленьні заходніх немцаў жывуць пры дэмакратыі. Пошукі новае нямецкае тоеснасьці толькі абцяжарваюцца залішнім канцэнтраваньнем на эпосе нацыянал-сацыялізму. Да таго ж цяперашнія эканамічныя праблемы Нямеччыны падрываюць давер немцаў да свае палітычнай эліты і да Фэдэратыўнае Рэспублікі агулам. Так што вялікую долю крытыкі Фішэр мусіў зьвярнуць на сваю ўласную краіну. Сучасная Нямеччына зможа палепшыць свой імідж за мяжой толькі тады, калі яна стане цікавай для самое сябе.

**Сяржук Вінаградаў**
**siarzhuk.vinahradau@tut.by**

ДЗЯДЫ

**Дзядулю майго звалі Павал. Мне не давялося сустрэцца зь ім. Мы зь ім разьмінуліся на гэтым сьвеце. Ён памёр у лютым 1937 г. Я ж нарадзіўся ў верасьні таго самага году. Усяго некалькі месяцаў разьвялі нас. Але я шмат чуў пра яго ад мамы. Асабліва мяне ўразіў мамін аповед, як хавалі дзядулю.**




# У белым бельлі

...1937 год. Гэты год, як і папярэднія, і наступныя за ім гады, быў жорстка бязбожны на Беларусі. Усялякія праявы набожнасьці былі перад уладамі ў няміласьці, ганіліся, караліся. А дзядуля якраз мой быў моцна набожны. Перад скананьнем сваім наказаў, каб пахавалі яго абавязкова са сьвятаром. Але дзе таго сьвятара было ўзяць тады?! Тады ж усіх іх паразганялі, пассылалі, рассыпалі па сьвеце — каго ў Сібір, каго на Салаўкі. А каторы дзе застаўся, дык прытаіўся, як тая мыша ў камешніку пад венікам. І ўсё ж мой тата выхадзіў перад уладаю дазволу на пахаваньне са сьвятаром. «Колькі ён папахадзіў, — згадвае мама, — каб той дазвол атрымаць! Колькі парогаў абабіў! І ўсё ж выхадзіў! Ня памятаю, дзе ён таго сьвятара дапаў, але прывёз. Чорны быў такі, у чорнай рызе. Ён і адпяваў дзядулю...» Але ня толькі гэта ўразіла мяне... Дзядулю пахавалі ва ўсім белым. На гэта таксама была дзядулева воля!

...Белыя кужэльныя порткі... Белая кужэльная кашуля... Такія ж белыя, з палатна, на нагах ціжэмкі. Усё гэта ён прывёз з Шоўкавічаў. Усё гэта было сьвянцонае. Хоць я таго пахаваньня ніколі ня бачыў і ня мог бачыць, але мамін аповед быў такі выразны, што ён заўсёды стаяў ўваччу, як жывы: труна на покуце, а ў труне ва ўсім белым — мой дзядуля з чорнай абкладной барадой. Гэтак хавалі толькі праведнікаў. А дзядуля мой такім і быў. Ён шмат гадоў лесьнікаваў у шоўкавіцкіх лясах пад Рэчыцай. Змог заашчадзіць нейкую капейку і на гэты капітальчык здолеў збудаваць між Шацілкамі і Жлобінам у мястэчку Мормаль пры чыгунцы на пагорку, які мае загадкавы назоў Жырвонак, паравы млынок — для сябе і для людзей. Але нядоўга ён пакарыстаўся тым млыном. Неўзабаве пасьля нэпу той млынок канфіскавалі, а самому дзядулю і ягонай сям'і пагражала высылка ў Сібір ці яшчэ куды. Дзядуля мусіў хавацца. Хаваўся ў добра знаных ім шоўкавіцкіх лясах. Тулючыся па тых лясах ды хутарах, захварэў невылечна. Вярнуўся ў Мормаль паміраць да сына. Хворага яго ўжо ніхто не чапаў. З Шоўкавічаў ён прывёз усё на сваю сьмерць — белае бельле. Гэта пасьля я даведаўся, што белая вопратка — гэта сымбаль чысьціні, нявіннасьці, сымбаль хрысьціянства. Колісь і хрысьціялі немаўлятак ва ўсім белым. Кожнае немаўлятка мела хрысьціянскую кашульку. І да шлюбу ішлі ва ўсім белым. І ў апошні шлях праводзілі ва ўсім белым. От чаму дзядуля і папрасіў пахаваць яго ва ўсім белым — у белым бельлі.

Кожнага разу, калі я наведваю дзядулеву магілку, мяне кранае гэтая дзядулева воля. Мне і праз зямлю, праз надмагільны курганок бачыцца мой дзядуля ва ўсім белым, як сам Ісус Хрыстос. Нагадаю, гэтую сваю волю дзядуля выказаў у часы беспрасьветнага бязбожжа. Між іншым, пахавалі дзядулю майго на самым заходнім ражку мормальскіх могілак побач з мормальскім сьвятаром Слачэўскім.

**Уладзімер Содаль**

# Палітычныя сьпевы

**Палітыка Джорджа Буша жывіць натхненьне рок-артыстаў — «Faithless», «Sonic Youth», «Bestie Boys», Паці Сьміт. Адкрытая антыбушаўская агітацыя, паэтычныя мэтафары, развагі пра стан сьвету напярэдадні выбараў у ЗША.**

Калі год таму антысадамаўская кааліцыя заатакавала Ірак, музычны шоў-бізнэс скаланула. Абавязак выказацца адчулі найбуйнейшыя зоркі. Чым бліжэй пад Багдад падсоўваліся амэрыканскія войскі, тым больш зьяўлялася песень антываеннай тэматыкі. З пацыфісцкімі дэкляарацыямі выступалі прадстаўнікі самых розных плыняў — ад «R.E.M.», Лэні Кравіца і ню-мэталічнай групы «System Of A Down» да выканаўцаў кантры.

Гэтым апошнім, зрэшты, давялося заплаціць за гэта надта высокую цану. Амэрыканскае асяродзьдзе прыхільнікаў кантры традыцыйна вельмі кансэрватыўнае. Крытыка палітыкі Джорджа Буша-малодшага большасьцю аматараў была прызнана непатрыятычнай і недастойнай. Таму жаночае трыё «Dixie Chicks», каб ня страціць прыхільнікаў, вымушана было шмат тлумачыцца адносна закідаў на адрас прэзыдэнта, якія яно дазволіла сабе на гастролях у Вялікай Брытаніі. Вілі Нэльсан, аўтар антываеннай балады «Whatever Happened To Peace On Earth», нічога тлумачыць не зьбіраўся, таму да сёньня многія амэрыканскія кантры-радыёстанцыі байкатуюць ягоныя песьні.

## Краявід зь вежамі

Вайна ў Іраку мабілізавала нават тых выканаўцаў, якія неахвотна карыстаюцца ў сваёй творчасьці палітычнымі лёзунгамі. Хіп-хоп-трыё «Beastie Boys», якое па-за сцэнай ангажаванае ў разнастайныя палітычныя ініцыятывы, але ў сваіх альбомах імкнецца пазьбягаць адназначных дэкляарацый, гэтым разам запісала кампазыцыю «In A World Gone Mad» адкрыта антыбушаўскага характару. «Спачатку ваюем з тэрорам, цяпер ваюем з Іракам — // Мы падыходзім да рысы, зь якой ня будзе вяртаньня», — рэпавалі «Beasties». Група не абмяжавалася адным творам. На выдадзенай пару месяцаў таму кружэлцы «To The 5 Borougs» поўна палітычных «штучак». Правакуе ўжо вокладка, на якой мы бачым панараму Нью-Ёрку напярэдадні 11 верасьня 2001 г. зь вежамі Сусьветнага гандлёвага цэнтру, якія кідаюцца ў вочы. Усё выглядае так, нібыта «Beasties» хацелі б павярнуць час назад і выкрасьліць некалькі апошніх гадоў з гісторыі. «Мы мусім скінуць Джорджа У.», — агітуюць сьпевакі ў кампазыцыі «That's It That's All».

## Новы парадак

Найвастрэйшую атаку на Буша ўчыніла група «Ministry». Найноўшы альбом легенды індустрыяльнай музыкі «Houses Of The Mole» цалкам «прысьвечаны» кіроўнаму прэзыдэнту ЗША. Кожная кампазыцыя на пласьцінцы мае назву, якая пачынаецца літарай «W»: «Worthless», «Wrong», «Worm». Адзіная песьня, якая выбіваецца з гэтай пасьлядоўнасьці, гэта «No «W». Аранжаваньні забітыя сэмпламі фрагмэнтамі прэзыдэнцкіх прамоў. «Ministry» здаўна не ў ладах зь сямейкай Бушаў. 12 гадоў таму група падобным чынам выступіла супраць Буша-старэйшага, запісаўшы кампазыцыю «N.W.O.» («New World Order» — «Новы сусьветны парадак»).

Паці Сьміт прысьвяціла апошнім часам палітыцы Буша песьню «Radio Baghdad». Гэта адна з наймацнейшых пазыцый яе сьвежавыдадзенага альбому «Trampin». Наймацнейшых у музычным пляне, бо тэкст гэтай кампазыцыі працягласьцю ў дзесяць зь лішкам хвілін, поўны сьлёзных апісаньняў пакутніцкага Багдаду і экскурсаў у гісторыю гораду, выглядае наіўнавата. «Багдад, цэнтар сьвету, спалены горад, — заводзіць Паці. — Вы ідзяце сюды, каб абакрасьці калыску цывілізацыі».

Куды цікавей глядзіцца зьмешчаная на новай, вельмі ўдалай пласьцінцы «Nurse» авангарднай групы «Sonic Youth» песьня «Peace Attack», сьціплы і сьцісты тэкст якой атакуе Буша не такім прымітыўным спосабам.

## «Halliburton» масавай сьвядомасьці

Найбольшае ўражаньне робіць брытанская група «Faithless». Ужо вокладка яе новай пласьцінкі «No Roots», зь якой паглядаюць дзеці (ірацкія? аўганскія?), не пакідае сумненьняў адносна тэматыкі. «Mass Destruction», першая песьня альбому, уражвае. Група апавядае ў ёй пра вайну, убачаную вачыма дзіцяці, бацька якога пайшоў на фронт. У прыпеве, аднак, пачынаецца гульня слоў, якімі бамбардуюць нас апошнімі часамі са СМІ: «Зброя далёкага радыюсу дзеяньня, бомбы самагубцаў, // нікчэмны розум — вось зброя масавага зьнішчэньня. // «Soaraway Sun», «BBC One», // дэзінфармацыя — вось зброя масавага зьнішчэньня. // Ня можаш быць каўказцам ці бедным азіятам. // Расізм — вось зброя масавага зьнішчэньня. // Інфляцыя, глябалізацыя, // страх — вось зброя масавага зьнішчэньня. // «Halliburton», «Enron» і so on, / / хцівасьць — вось зброя масавага зьнішчэньня. // Трэба знайсьці сьмеласьць перамагчы, // бязьдзейнасьць — вось зброя масавага зьнішчэньня». Канфлікт у Іраку перастае быць проста канфліктам у Іраку і робіцца мэтафарай сучаснага сьвету. Вайна вядзецца на ўсіх франтах і неабавязкова толькі дзьвюма варожымі арміямі.

## Беларускія канвэнцыі

На гэтым фоне нечакана блякла выглядае айчынны палітычны рок. Рэдкія рэпавыя тэксты — тыповы вынятак. Абавязковы ў многіх рэп-тэкстах падзел на «нас» і «іх» рэдка зьяўляецца праявай сапраўднага канфлікту, а ўсё часьцей становіцца вынікам абавязковай для хіп-хопу традыцыі. Сапраўднае ж антываеннае песьні ў краіне, кіраўніцтва якой таксама выступае з усё больш ваяўнічымі заявамі, за апошні год не прагучала.

**Сяргей Мікулевіч**
з выкарыстаньнем матэрыялаў gazeta.pl




**Стась Пачобут, лідэр гарадзенскага гурту «Deviation», прызэру «Басовішча» й адной зь нешматлікіх вядомых антыглябалісцкіх камандаў Беларусі.**

# Чаму ня пішуцца песьні пра Буша?

Беларускія музыканты ня лічаць, што выконваць песьні пратэсту супраць бушаўскай палітыкі — справа вартая. «Заўважце, што падобныя песьні-маніфэсты ня надта пашыраны сярод славян, бо мы маем зусім адрозны мэнталітэт ад астатніх народаў. У нашых песьнях усё больш завуаляванa, па-мойму, проста біць фразамі ў лоб ня варта. Я з задавальненьнем, у першых шэрагах, вазьму ўдзел у антыбушаўскай акцыі, калі такая будзе ладзіцца, але ж песень пад яе пісаць ня буду», — кажа лідэр групы «Нэйра Дзюбель» **Аляксандар Кулінковіч**.

«Безумоўна, на чужы боль трэба адгукацца, але, каб удаўся такі твор, неабходна, каб адпаведны настрой меў паэт, кампазытар і выканаўца. Гэтага дасягнуць цяжка, тым больш што тая праблема нас ня надта кранае», — кажа **Генадзь Бураўкін**, на вершы якога быў створаны не адзін хіт.

«У нашай краіне ёсьць чалавек, значна горшы за Буша. Рабіць шаржы на амэрыканскага кіраўніка і баяцца сказаць слова пра таго, хто тут праводзіць ганебную палітыку, — гэта прымета дрэннага густу», — зазначае **Піт Паўлаў**.

«Невялікую долю песень антыбушаўскай скіраванасьці можна растлумачыць тым, што ў нас палітычная актыўнасьць ніжэйшая, чым у разьвітых краінах Эўропы і ў Амэрыцы, а ў поп-музыцы сацыяльная тэматыка — наагул зьява рэдкая», — мяркуе **Юры Саваш**. Прадусара і аўтара тэкстаў да песень Ірыны Дарафеевай больш непакоіць тое, што моладзь губляе свае карані. Сп.Саваш недаўна напісаў песьню «Пульс маіх хвілін», дзе заклікае маладых людзей зьвярнуцца да сваіх вытокаў, не забывацца на сваю радзіму.

«Сьпяваць нейкія антыпэрсанальныя песьні — справа няўдзячная, бо пэрсона адыходзіць, а зьява застаецца», — лічыць **Аляксандар Памідораў**.

Зь імі пагаджаецца **Слава Корань**: «Антыбушаўскіх песень сьпяваць ня буду, бо трэба ведаць праблему знутры, недарэчна крычаць на кожным завугольлі пра тое, што ты пачуў ад кагосьці. Пацыфісцкія творы — іншая рэч».

**Сяргей Будкін**

ДЫСКАГРАФІЯ

## Civilization




Група «Pulsar». (р)
«Pulsar»/»Союз», 2004.

Во як! Ня надта вядомая ў сябе на радзіме берасьцейская група, якая існуе два з паловаю гады, ня толькі выдала пасьля міні-альбому «Солнце бессмертных» першы поўнафарматны альбом, але і зацікавіла сваёй музыкай расейскае выдавецтва «Союз».

Праўду кажучы, зьмест альбому даволі дзіўны: у ім зьмешчаны 4 трэкі на ангельскай мове ды 5 у якасьці бонусаў (?) — на расейскай. Тым ня менш, слухаецца гэта вельмі добра: зладжаная ігра, даволі выразныя мэлёды Андрэя Бантыша і Юр'я Колычава, упэўнены голас вакаліста Сяргея Філіпава, багатае, насычанае агульнае гучаньне. У аснове стылістыкі — клясычны мэтал-рок, увасоблены паводле ўсіх правілаў. Што найбольш каштоўнае — клявішныя ня блытаюцца пад нагамі, а сапраўды ствараюць музыку. Загалоўная песьня балядная пляну «Eternity» — без пытаньняў!

Крыху горш з расейскамоўным рэпэртуарам. Музыка ў цэлым такая ж, а вось тэксты не выходзяць за рамкі дастаткова галаслоўных праклямацый, тыповых для гэтага гатунку музыкі. Да таго ж інструмэнтальны «Пегас» — быццам працяг «Солнца бессмертных», не нашмат адрозьніваецца й «Орден креста». Вылучу нахай і крыху сьлязьлівую, але няблага вырашаную на аснове амаль акустычнага гучаньня баляду «Моя любовь, моя печаль». Праўда, зноў жа тэкст… Быццам узяты ў сябра аднаго зь літаб'яднаньняў пры нейкім мэталюргічным заводзе.

Але ў цэлым дыск будзе цікавы для аматараў мэталічнай музыкі. І — на здароўе!

**Імпульсіўны СЛУХАЧ**

## Другая дарога



Група «Slang». (р)
«Slang», 2004.

Яшчэ адзін дэбютны дыск калектыву, вядомасьць якога таксама ня надта шырокая — хоць лідэр групы Аляксандар Насковіч пэўны час выступаў у складзе групы «Flat», басіст Павал Ткачоў іграў у блюзавай групе «Spoonfull», барабаншчык Андрэй Шабронаў выступаў у розных калектывах, а ў запісе альбому паўдзельнічалі ў якасьці спэцыяльна запрошаных басіст Руслан Праўда (!), Сьвет (губны гармонік, фартэпіяна), Кастусь Гарачы (клявішныя). Музыка — А.Насковіча. Тэксты — розных аўтараў, і зусім не дурныя, не галаслоўныя. Стыль — клясычны расейскамоўны хард-рок.

Нечым гэтая музыка з надзвычай яскравым вакалам Сяргея Федарэнкі нагадала мне тое, што ў свой час рабіла група «Сузор'е». Музыканты і не імкнуцца зрабіць у гэтай стылістыцы нейкія рэвалюцыйныя адкрыцьці. Яны проста няўхільна і пісьменна трымаюцца традыцыі, адчуўшы безумоўную падтрымку і поўнае разуменьне з боку гукарэжысэра Аляксея Зайцава. Была б у нас якая сапраўдная рокавая FM-станцыя — не адна зь песень гэтага альбому ратаявалася б са смакам і доўга. «Другая весна», «Рядом», «Я буду ждать тебя»… Сьпіс можна сьмела працягваць. Магчыма, адзіная заўвага: С.Федарэнка ўсё ж часам залішне, як герой-ліхадзей нейкага мульціка, фарсуе голас і на гэтым траціць у натуральнасьці.

Ёсьць у альбоме і два цалкам шыкоўныя інструмэнтальныя гіты: «Гойда-гойда» і «Блюз ракі». Першы — нешта накшталт стылізацыі хвацкай народнай папеўкі, другі — прасякнуты пінк-флойдаўскім настроем надзвычай мэлядычны, выразны твор.

Дадам да ўсяго яшчэ й шыкоўны, рэдкі, багаты для Беларусі дызайн альбому.

Але вось якая дзікая сытуацыя: абодва адзначаныя тут дыскі выдадзеныя музыкантамі самастойна. Гэта ад нядаўняга часу азначае, што шанцаў трапіць ім у музычныя крамы амаль няма. Набыць згаданыя дыскі можна будзе хіба падчас канцэртаў, але й зь імі самі ведаеце якая сытуацыя. Кола, адным словам. Не зачараванае. Тупое такое кола…

**Слэнгануты СЛУХАЧ**

## Старажытная музыка

Канцэрт гурту старадаўняй музыкі «Lituus» адбудзецца 29 кастрычніка (пятніца) а 19.00 у залі «Дому літаратара» (вул.Фрунзэ, 5). У праграме — эўрапейская танцавальная музыка XII—XVII ст., беларуская музыка эпохі Рэнэсансу й барока — «Полацкі сшытак», «Віленскі сшытак». Тэл. для даведак 649-08-88, 616-84-90.

## «Будэкспа. Восень-2004»

**Да 29 кастрычніка** ў выставачным павільёне на вул. Янкі Купалы, 27 працуе Першая спэцыялізаваная выстава «Будэкспа. Восень-2004».

## Ніцшэ. Музыка і паэзія

**30 кастрычніка** ў Домемузэі Ваньковічаў (вул.Інтэрнацыянальная, 33а) адбудзецца мастацкая акцыя «Ніцшэ. Музыка і паэзія», прысьвечаная 160-годзьдзю Фрыдрыха Ніцшэ. У праграме — жывое выкананьне музыкі Фрыдрыха Ніцшэ, а таксама ягоныя вершы. Пачатак а 15.30. Плата за ўваход сымбалічная.

## Фотамантажы

**Да 20 лістапада** ў Доме фота (вул.Мясьнікова, 78) працуе выстава работ Уладзімера Качана. Экспазыцыя цалкам складаецца зь лічбавых фотамантажоў, экспэрымэнтаў з выяўленчымі магчымасьцямі мікшаваньня відарысаў. Уваход вольны.

## «Зямля і людзі»

У Нацыянальным мастацкім музэі **да 20 лістапада** працуе выстава жывапісу Марціроса Сар'яна «Зямля і людзі».

## Аўтарская песьня

**З 29 да 31 кастрычніка** ў Віцебску адбудзецца фэстываль аўтарскай песьні «Акторства старога гораду». Т.: (0212) 22-34-97.

## Тэатры

### Заля камэрнай музыкі

**4** (чц) — канцэрт камэрнай музыкі.
**5** (пт) — Вольга Запольская (фартэпіяна) і Алена Сапроненка (віялянчэль).

### Тэатар беларускай драматургіі

**30** (сб) — «П'емонцкі зьвер».
**31** (ндз), **3** (ср), **5** (пт) — «Містэр Розыгрыш».
**2** (аўт) — «Чарнобыльская малітва».
**4** (чц) — «Чорны квадрат».
**6** (сб) — «Жанчыны Бэргмана».

### Музычны тэатар

**2** (аўт), **3** (ср) — «Арфэй і Эўрыдыка».
**4** (чц) — «Даратэя».
**5** (пт) — «Каралева чардашу».
**6** (сб) — «Кажан».

### Опэра

**30** (сб) — «Багема».
**31** (ндз) — «Травіята».
**4** (чц) — «Яўген Анегін».
**6** (сб) — «Вечар старадаўняга рамансу».

### Тэатар ім Янкі Купалы

**30** (сб) — «Дзіўная місіс Сэвідж».
**31** (ндз) — «Паўлінка».

### Балет

**29** (пт) — «Спартак».
**31** (ндз), **2** (аўт), **3** (ср) — «Марная перасьцярога».
**5** (пт) — «Макбэт», «Балеро».

### Драматычны тэатар імя Горкага

**30** (сб), **31** (ндз) — «Сунічная паляна».

### Тэатар эстрады

**30** (сб) — «Клоўны і лялькі».
**31** (ндз) — «Уся справа ў капелюшы».

### Моладзевы тэатар

**30** (сб) — «Шалёны дзень, або Вясельле Фігаро».
**31** (ндз) — «Акадэмія сьмеху».

## Клюбнае жыцьцё

**Bronx** (288–10–61, «Velcom»: 103 і 105)
**28** (чц), 22.00 — dj Dust.
**29** (пт), 22.00 — канцэрт: Аляксей Барышаў & Blackmailers Blues Band.
**30** (сб), 23.00 — «Halloween»: dj Michel Quazar (Moscow), dj Dasha Pushkina.

**Белая Вежа** (284–69–22, 239–16–00)
**28** (чц), 22.00 — «White Tower Party»: dj Dee, dj Top, dj Bergamo.
**29** (пт), 22.00 — дыскатэка: dj Міхель.
**30** (сб), 22.00 — dj Міхель.
**31** (ндз), 22.00 — дыскатэка «Europop»: dj Alex.

**Гудвін** (226–13–06)
**28** (чц), 21.00 — жывая музыка: джаз-трыё «NC».
**29** (пт), 21.00 — жывая музыка: Аркадзь Эскін і ягоны джаз-квартэт, з 23.00 — вечар пародый з удзелам салістаў Кіеўскага тэатру пародый.
**30** (сб), 21.00 — жывая музыка: гурт «Мадэра Хард Блюз».
**30** (сб), 23.00 — «Хэлоўін». Калі ў вас слабыя нэрвы, заставайцеся дома. У касьцюмах — уваход бясплатны.
**31** (ндз), 21.00 — жывая музыка: «P.S.Jazz».
**31**(ндз), 23.00 — дыскатэка.

**Бліндаж** (219–00–10, 671–58–65)
**28** (чц), 23.00 — resident dj Egor.
**30** (сб), 23.00 — resident dj Egor.
**31** (ндз), 23.00 — resident dj Egor.

**X-Ray** (223–93–55)
**29** (пт), 22.00 — dj Grizzly.
**30** (сб), 22.00 — «Rough Halloween»: dj Da Vinchi (Moscow), dj Noche.

## Менская кінаафіша з 29 да 31 кастрычніка

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Адкрытае мора»*** (прэм'ера): **29** (пт) 16.00, 17.40, 19.20, 21.00; **30, 31** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.00, 17.40, 19.20, 21.00.
«Паляўнічыя на розум»***: **29—31** (пт—сб) 16.30, 20.30.
«Эўратур»***: **29** (пт) 18.30; **30, 31** (сб, ндз) 14.30, 18.30.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Хронікі Рыдыка»: **29** (пт) 14.00, 18.30 (іл); **30, 31** (сб, ндз) 14.00, 18.30.
«Тата»: **22** (пт) 16.30 (іл); **30, 31** (сб, ндз) 16.30.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Дзевяць ярдаў-2»: **29** (пт) 18.00 (іл); **30, 31** (сб, ндз) 18.00.
«Паляўнічыя на розум»***: **29, 30** (пт, сб) 20.00; **31** (ндз) 20.00 (іл).

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Пярэпалах у інтэрнаце»*** (прэм'ера): **29** (пт) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00; **30, 31** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)
«Пярэпалах у інтэрнаце»*** (прэм'ера): **29** (пт) 17.00, 19.00 (пд), 21.00 (пд); **30, 31** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00 (пд), 21.00 (пд).

**«Мір»** (284-37-71)
«Хронікі Рыдыка»: **29** (пт) 16.00, 18.10, 20.30; **30, 31** (сб, ндз) 16.00 (іл), 18.10, 20.30.
«Дзевяць ярдаў-2»: **29—31** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 21.00.

**«Перамога»** (223-77-66)
«Шлюха»**** (прэм'ера): **29—31** (пт—ндз) 21.00.
«Хронікі Рыдыка»: **29** (пт) 14.00; **30, 31** (сб, ндз) 18.40.
«Кіроўца для Веры»***: **30, 31** (сб, ндз) 16.10 (іл).
«Эльчына мара» (дакумэнтальны фільм, прэм'ера): **29** (пт) 18.00.

**«Піянер»** (227-64-87)
«Шырокім крокам»***: **29—31** (пт—ндз) 17.00, 21.00.
«Гульні матылькоў»: **29—31** (пт—ндз) 15.00, 19.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Адкрытае мора»*** (прэм'ера): **29** (пт) 13.20, 17.30, 19.10 21.00; **30, 31** (сб, ндз) 13.20 (іл), 17.30, 19.10, 21.00.
«Прынц і я»: **29—31** (пт—ндз) 11.00, 15.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
(пд) — падоўжаны сэанс
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не допускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

30 кастрычніка 19.00
Дом літаратара
Вул. Фрунзэ, 5 (пл. Перамогі)
КАСЯ КАМОЦКАЯ
(Новае Неба)
У канцэрце бярэ ўдзел
Алесь Камоцкі
Кошт 7000

## Для дзяцей

### Тэатар юнага гледача

**30** (сб), **31** (ндз), **1** (пн) — «Папялушка».
**2** (аўт) — «Каліф-шавец».
**3** (ср) — «Сястра мая Русалачка».
**4** (чц) — «Маленькі лорд Фаўнтлерой».
**5** (пт). **7** (ндз) — «Паліяна».
**6** (сб) — «Дзень нараджэньня ката Леапольда».

### Тэатар беларускай драматургіі

**30** (сб), **31** (ндз), **2** (аўт) — «Хрустальны туфлік».
**5** (пт), **6** (сб) —«Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».

### Опэра

**6** (сб) — «Чароўная музыка».

### Музычны тэатар

**6** (сб) — «Бураціна.by».

### Клюб «Гудвін» (226–13–06)

**30** (сб), 12.00—15.00 — дзіцячая праграма.
**31** (ндз), 12.00—15.00 — «Хэлоўін для дзяцей». Не палахліўцы ў касьцюмах праходзяць бясплатна.

### Кіно

**«Аўрора»**
«У пошуках Нэма»: **29** (пт) 14.30; **30, 31** (сб, ндз) 12.30.
**«Берасьце»**
«Гуляй як Бэкхем»: **30, 31** (сб, ндз) 11.50.
**«Дружба»**
«Як даць рады бацьку»: **29** (пт) 12.00, 14.00; **30, 31** (ндз) 11.00, 13.00.
**«Мір»**
«Атлянтыда: страчаная імпэрыя»: **30, 31** (сб, ндз) 12.00.
«Я Цэзар» (прэм'ера): **30, 31** (сб, ндз) 14.00.
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **30, 31** (сб, ндз) 13.00, 15.00.
**«Піянер»**
Праграма фільмаў пра А.С.Пушкіна: **29** (пт) 11.00.
«Гонар маю»: **29** (пт) 13.00.
«Чароўны востраў»: **30, 31** (сб, ндз) 10.30, 13.20.
«Шрэк»: **30, 31** (сб, ндз) 11.40.

КІНО Ў МЕНСКУ

# Акулы ніяк не нажруцца

## Сямейная драма ў моры



WWW.MOVIEWEB.COM

«Адкрытае мора» («Open Water»)
ЗША, 2003, каляровы, 79 хв.
**Жанр**: драма, фільм жахаў
**Адзнака:** 4,5 (з 10)

З часоў Стывэна Сьпілбэрга кінэматаграфічныя сківіцы акулы не сыходзяць з экранаў. Малады рэжысэр Крыс Кентыс прапанаваў новы погляд на абгрызеную тэму.

У карціне «Адкрытае мора» спачатку ўсё разьвіваецца стандартна. Сямейная пара едзе на адпачынак на цёплыя выспы. Нядбайныя экскурсаводы забываюць сямейную пару падводнікаў-нэафітаў у адкрытым моры. А далей пачынаецца самае цікавае. Два чалавекі — і адкрытае мора. Сужэнцы сварацца, а ў вадзе чакае пагроза.

Крытыкі параўноўвалі «Адкрытае мора» з гібрыдам «Сківіцаў» і «Ведзьмы з Блэр». У гэтым малабюджэтным, але пасьпяховым фільме Крыс Кентыс выступіў і рэжысэрам, і сцэнарыстам, і апэратарам, і мантажнікам. Але моцны прыём «мінімалізму» скарыстаны далёка не напоўніцу. Не пашэнціла і з акторскай гульнёй. І калі Бланшард Раян (у ролі Сьюзан) хоць неяк спрабуе разыграць ролю, то Дэніэл Трэвіс (у ролі Дэніэла), які засьвяціўся раней у эпізодзе «Сэксу ў вялікім горадзе», пакідае свайго героя плоскім. Але нельга не адзначыць аднаго надзвычай кінэматаграфічнага эпізоду. Гэта эпізод навальніцы, калі экран то асьвятляецца, то пагружаецца ў цемру, мы чуем крыкі і хрыпы герояў — і адзін зь іх… Гэта вы пабачыце.

Тытры падкрэсьліваюць, што фільм зроблены на падставе рэальнага факту. На жаль, фільм так і ня выйшаў за межы прыватнай гісторыі. Ён падаецца найбольей карысным для вандроўнікаў, каб тыя не забывалі, што нядобрыя турыстычныя фірмы здольныя пакінуць іх на пракорм акулам.

**Андрэй Расінскі**

## ● НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ ●

**Мароз У. Менск старадаўні і малады** / Маст. В.Мішчанка. — 3-е выд., са зьмян. — Менск: Міжнар. цэнтар культуры кнігі, 2004. — 160 с. — (Існасьць Беларусі). 3000 ас.

Аўтарская ўвага не абмінула ніводнага з найбольш прыкметных аб'ектаў сталіцы. Ілюстрацыі й тэкставы матэрыял дазваляюць прасачыць гісторыю асноўных вуліц і плошчаў Менску, зьмяненьні іх назваў і архітэктурнага вобліку. Новае выданьне альбому ўжо зьмяшчае інфармацыю пра апошнюю паводле часу пабудовы менскую «візытоўку» — «звышсучасны» будынак чыгуначнага вакзалу. Цана 24050 руб.

**Някляеў У. Так:** Кніга паэзіі. — Менск: Выд-ц В.Хурсік, 2004. — 232 с. 2000 ас.

Паводле думкі Р.Барадуліна, гэтая кніга — «эпічная спроба позірку па той бок вечнасьці». Тры разьдзелы зборніка — «Прысьнілася, што ёсьць на сьвеце Бог», «Кы-гы», «Айчына. А чаму?» — зьмяшчаюць, адпаведна, вершы, «сюжэты» й паэмы («ПаляНэз» ды «Ложак для пчалы»). Усё, што ўвайшло ў выданьне, было створана аўтарам за пяць гадоў жыцьця па-за межамі Беларусі — у Польшчы й Фінляндыі. У «Акадэмкнізе» цана 9200 руб.

**Хімічны слоўнік навучэнца:** Дапам. для вучняў / В.Карчагін, В.Макарэўскі й інш. — Менск: Народная асьвета, 2003. — 287 с.: іл. 1000 ас.

Цікаўныя школьнікі даведаюцца, што тояць у сабе загадкавыя назвы «аксыдаваньне», «вінілхлярыд», «катыяніты», «фэрмэнты», «ядравыя рэакцыі» ды інш. Цана ў «Кнігарні пісьменьніка» 26310 руб.

**Килбас А. Культура привилегированного сословия в Беларуси (XIV—XVI вв.).** — Минск: УП «Технопринт», 2004. — 168 с. 100 ас.

Паляваньні, гульня ў шахматы й шашкі («варцабы»), вяленая гусь, сыр і яшчэ колькі неабыякіх страў на стале — дасьледчык піша пра тое, у якіх умовах жылі, як харчаваліся й апраналіся, чаму вучылі дзяцей і што лічылі за свой галоўны абавязак беларускія баяры (ад слова «бой»). У «Акадэмічнай кнізе» цана 8100 руб.

**Лукашевич В. В лесах под Гродзянкой: Воспоминания партизанки.** — Минск: Изд-во В. Хурсик, 2004. — 136 с. 200 ас.

**Лысенко П. Древний Туров** / Нац. Академия наук Беларуси; Ин-т истории. — Минск: Беларуская навука, 2004. — 180 с.: ил. 700 ас.

На аснове летапісных зьвестак і шматгадовых уласных археалягічных дасьледаваньняў навуковец падрабязна апісвае старажытнае гарадзішча Турава, забудову гораду й заняткі мясцовага насельніцтва. Цана 12050 руб.

Поболь Л. **Древности Туровщины**. — Минск: Беларуская навука, 2004. — 143 с. 700 ас.

На аснове ўласных раскопак і архіўных зьвестак дасьледчык склаў поўны звод археалягічных помнікаў Тураўскага міжрэчча Прыпяці—Сьцьвігі. Першае выданьне манаграфіі выходзіла ў 1969 г. У «Кнігарні пісьменьніка» цана 5980 руб.

**Путеводитель по городам и районным центрам Республики Беларусь** / Сост. А.Варивончик и др. — Минск: ООО «Харвест», 2004. — 448 с.: ил. 11750 ас.

Упершыню пад адною вокладкаю друкуюцца схематычныя пляны ўсіх значных населеных пунктаў Беларусі — 108 гарадоў і 26 раённых цэнтраў ды мястэчак. Да кожнага зь селішчаў падаецца кароткі гісторыка-эканамічны нарыс — лічбы, назвы, даты, факты з энцыкляпэдыі. У даведніку ўпершыню публікуюцца ўсе зацьверджаныя гербы гарадоў. Значную частку аб'ёму займае рэклямная інфармацыя аб мясцовых прадпрыемствах. Цана 27690 руб.

Котов А. **Беларусь в период второй мировой и великой отечественной войны (1939—1941): Хронолог. справочник.** — Минск: Энциклопедикс, 2004. — 40 с. 3000 ас.

**Тацяна Вабішчэвіч**

Францыаза Саган

# Дзень добры,

Ранішняе абуджэньне было пакутным, напэўна таму, што напярэдадні я перапіла віскі. Я прачнулася, лежачы ўпоперак ложка, упоцемку, зь непрыемным прысмакам у роце, уся агідна потная. Праз шчыліны ў аканіцах тачыўся сонечны прамень, у ім густой палоскай узьнімаліся пылінкі. Не хацелася ні ўставаць, ні заставацца ў пасьцелі. Зьнячэўку мне падумалася, як запачуваюць сябе бацька і Ан, калі Эльза вернецца сёньня раніцай. Я намагалася думаць пра іх, а заразом спрабавала ўстаць, але марна. Нарэшце я перасіліла сябе — і, панурая, няшчасная, апынулася на халодных плітках падлогі. Люстэрка выяўляла мой панылы адбітак, я ўважліва ўглядалася ў яго: зрэнкі расшыраныя, рот апухлы, гэты чужы твар — мой… Няўжо я магу адчуваць сябе слабай, вартай жалю толькі праз гэтыя вось вусны, адыначаныя рысы толькі таму, што я адвольна ўшчэмлена ў гэтыя агідныя рамкі? Але калі я насамрэч ушчэмленая ў гэтыя рамкі, чаму мяне мусова ў тым пераконваць такім бязьлітасным і гнятлівым для мяне чынам? Я адчувала насалоду, што пагарджаю сабой, ненавіджу свой злы твар, прымарнелы і скомшаны пасьля разгуляю. Я стала глуха паўтараць слова «разгуляй», глядзячы сабе ў вочы, і раптам заўважыла, што ўсьміхаюся. Ну й праўда, вось дык разгуляй: некалькі няшчасных чарак, аплявуха і сьлёзы. Я пачысьціла зубы і сышла ўніз.

Бацька і Ан ужо сядзелі поруч на тэрасе, перад імі стаяла таца зь лёгкім сьняданкам. Я безуважна паздароўкалася, села насупроць. Ад сарамяжлівасьці я не адважвалася на іх глядзець, аднак іхняе маўчаньне змусіла мяне ўзьняць вочы. Твар Ан зьлёгку асунуўся — гэта быў адзіны сьлед ночы любові. Абое шчасьліва ўсьміхаліся. Гэта зрабіла на мяне ўражаньне: шчасьце заўсёды было ў маіх вачах зарукай рацыі і ўдачы.

— Добра спала? — спытаўся бацька.

— Так сабе, — адказала я. — Я ўчора перапіла віскі.

Я наліла сабе кавы, з асалодай адглынула, але зразу ж адставіла кубачак. Было нешта асаблівае ў іхнім маўчаньні, нейкае вычэкваньне, ад якога мне стала ніякавата. Я была занадта стомленая, каб доўга трываць яго.

— Што адбываецца? У вас абаіх гэткі загадкавы выгляд.

Бацька ўдавана спакойным рухам запаліў цыгарэту. Ан паглядзела на мяне зь неспадзяваным замяшаньнем.

— Я хацела б аб нечым папрасіць вас, — нарэшце сказала яна. Я прыгатавалася да найгоршага.

— Зноў нешта перадаць Эльзе?

Яна адвярнулася, яшчэ раз паглядзела на бацьку:

— Ваш бацька і я… мы хацелі б пабрацца, — сказала яна.

Я пільна паглядзела на яе, потым на бацьку. Я чакала ад яго хоць якога знаку, позірку, які абурыў бы, але заразом і супакоіў бы мяне. Ён разглядваў свае рукі. «Быць таго ня можа», — падумала я, але ўжо ведала, што гэта праўда.

— Вельмі добрая думка, — сказала я, каб выйграць час.

Я не магла ацяміцца: бацька, які заўсёды быў гэткім упартым праціўнікам шлюбу, усякіх ланцугоў, за адну ноч рашыўся… Гэта перавярочвала ўсё наша жыцьцё. Мы збаўляліся сваёй незалежнасьці. Я раптам уявіла сабе наша жыцьцё ўтраіх, жыцьцё, неспадзявана ўпарадкаванае розумам, вытанчанасьцю Ан, тое жыцьцё, якое на зайздрасьць мне, вяла яна сама. Інтэлігенцыя, тактоўныя сябры, шчасьлівыя спакойныя вечары… Я раптам адчула пагарду да тлумных застоліцаў, паўднёваамэрыканцаў ды ўсякіх эльзаў. Пачуцьцё перавагі і гонару нахлынула на мяне.

— Вельмі, вельмі добрая думка, — паўтарыла я і ўсьміхнулася ім.

— Я ведаў, што ты ўзрадуешся, кацянятка, — сказаў бацька.

Ён расслабіўся, разьвесяліўся. Мякка адценены любоўнаю стомаю твар Ан быў гэткім адкрытым, гэткім пяшчотным, якім я яго ніколі ня бачыла.

— Хадзі сюды, кацянятка, — сказаў бацька.

Ён працягнуў мне абедзьве рукі, прыхінуў мяне да сябе, да яе. Я прыкленчыла перад імі, яны з усхваляваным замілаваньнем глядзелі на мяне, гладзілі мяне па галаве. А я — я не магла збавіцца ад думак, што ў гэты самы момант, магчыма, мяняецца ўсё маё жыцьцё, але што я для іх насамрэч усяго толькі кацяня, маленькі адданы зьвярок. Я адчувала, што яны дзесь нада мною, што іх лучыць мінулае, будучае, повязі, якія няведамныя мне і ад якіх я вольная. Я наўмысна заплюшчыла вочы, паклала галаву ім на калені, засьмяялася разам зь імі, зноў увайшла ў сваю ролю. Зрэшты, а чаму б мне і ня быць шчасьлівай? Ан проста цуд, ёй не ўласьцівыя ніякія дробязныя памкненьні. Яна будзе кіраваць мною, здыме зь мяне цяжар адказнасьці за мае ўчынкі, што б ні здарылася, дапаможа выбрацца на правільную дарогу. Я стануся самой дасканаласьцю, а заразом і мой бацька.

Бацька ўстаў і пайшоў па бутэльку шампанскага. Мне раптам стала брыдка. Ён шчасьлівы, і гэта, вядома, галоўнае, але я ўжо столькі разоў бачыла яго шчасьлівым праз жанчыну…

— Я крыху пабойвалася вас, — сказала Ан.

— Чаму? — спыталася я.

Паслухаць яе, дык я сваёй забаронай змагла б перашкодзіць дваім дарослым людзям пажаніцца.

— Я баялася, што вы мяне баіцеся, — сказала яна і засьмяялася.

Я таксама засьмяялася, бо я насамрэч яе пабойвалася. Яна давала мне зразумець, што ведала пра тое, і што мой страх дарэмны.

— Вам не здаецца сьмешным, што старыя вырашылі пажаніцца?

— Вы зусім не старыя, — сказала я з усёй належнай перакананасьцю, бо ў гэты момант, вальсуючы, увайшоў бацька з бутэлькай.

Ён сеў побач з Ан, абняў рукой яе за плечы. Яна ўся падалася да яго, і гэты рух змусіў мяне апусьціць вочы. Вось чаму яна і згадзілася пайсьці за яго — дзеля ягонага сьмеху, дзеля гэтай моцнай, выклікаючай давер рукі, дзеля яго жыцьцялюбства, цеплыні, якую ён вылучае. Сорак гадоў, страх перад адзінотай, магчыма, апошнія ўсплёскі пачуцьцёвасьці… Я ніколі ня думала пра Ан як пра жанчыну, а толькі як пра нейкую сутнасьць: бачыла ў ёй упэўненасьць у сабе, дыхтоўнасьць, разважлівасьць і ні ценю пачуцьцёвасьці або слабасьці. Я разумею, як ганарыўся бацька: непрыступная, раўнадушная Ан Лярсан будзе яго жонкай. Ці кахае ён яе, ці здольны кахаць доўга? Ці ёсьць розьніца паміж яго пачуцьцём да яе і тым, якое ён вычуваў да Эльзы? Я заплюшчыла вочы, сонца змарыла мяне. Мы сядзелі на тэрасе ў атмасфэры недагаворак, патайных страхаў і шчасьця.

Усе гэтыя дні Эльза не паказвалася. Тыдзень прамінуў хутка. Сем шчасьлівых, нічым не азмрочаных дзён, толькі сем. Мы складалі мудрагелістыя пляны, як мы абставім кватэру, які ў нас будзе распарадак дня. Мы з бацькам забаўляліся, спрабуючы зрабіць яго шчытным, ускладнёным, зь безадказнасьцю тых, хто ніколі ня ведаў, што такое распарадак. Але няўжо мы верылі ў гэта ўсур'ёз? Няўжо бацька і сапраўды зьбіраўся дзень пры дні вяртацца а палове першай на абед, вячэраць удома і потым нікуды не сыходзіць? Аднак ён весела адракаўся ад сваіх багемных звычак, ухваляў парадак, дыхтоўнае, ладнае жыцьцё буржуазнага кола. Але, напэўна, для яго, як і для мяне, усё гэта былі толькі адвольныя разумаваньні.

Наранку яны выходзілі ў абдымку, зь цёмнымі коламі пад вачыма, дружна сьмяяліся, і, прысягаю, мне хацелася, каб гэта доўжылася ўсё жыцьцё. Увечары мы часта вырушалі на ўзьбярэжжа, каб пасядзець за чарачкай на тэрасе якой-небудзь кавярні. Нас усюды ўспрымалі як звычайную дружную сям'ю, і мне, прывыклай заўжды зьяўляцца адной з бацькам і сустракаць усьмешкі, калючыя або спачувальныя позіркі, падабалася зноў выступаць у адпаведнай майму ўзросту ролі. Вясельле павінна было адбыцца ў Парыжы па вяртаньні.

Бедны Цырыль быў дужа ўражаны нашымі хатнімі пераўтварэньнямі. Але гэта ўзаконенае завяршэньне было яму даспадобы. Мы каталіся зь ім на лодцы, цалаваліся колькі хацелі, і часам, калі ён сваімі вуснамі прыпадаў да маіх, мне прыгадвалася Ан, яе трохі прымяты,



АЛЕНА АДАМЧЫК



**З лістапада будзе сорак дзён ад сьмерці Франсуазы Саган (1935—2004) — сусьветна вядомай францускай пісьменьніцы. Зь яе раманамі «Дзень добры, смутак», «Крыху сонца ў халоднай вадзе», «Ці любіце Вы Брамса?» мільёны людзей атаясамліваюць сваю маладосьць і францускую літаратуру.**

## • НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ •

**Рывкин М., Шульман А. Хроники страшных дней: Трагедия Витебского гетто.** — Витебск: УПП «Витебск. обл. типография», 2004. — 152 с. 300 ас.

**Скобелев Э. Рассказы разных лет.** — Минск: Мастацкая літаратура, 2004. — 343 с. 1000 ас.

Як не бяз гонару адзначае аўтар у прадмове да кнігі, яго «апавяданьні паказваюць на пакутлівы й трагічны шлях, які прайшлі грамадзяне краіны, падманутыя сваімі лідэрамі на самым фатальным адрэзку гісторыі й абдураныя нязводным племенем паразытаў». «Прыгоды Арбузіка й Бябешкі» ў «лепшае» не ўвайшлі — ня той жанр. У «Кнігарні пісьменьніка» цана 12910 руб.

**СМИ и выборы: Гид для белорусского журналиста.** — Санкт-Петербург: Невский простор, 2004. — 104 с. 299 ас.

У форме пытаньняў і адказаў тут падаюцца зьвесткі пра міжнародныя стандарты асьвятленьня выбарчага працэсу, закранаюцца самыя вострыя юрыдычныя й этычныя пытаньні працы журналіста ў беларускіх умовах. Кніга арыентаваная на сёлетнія выбары, але актуальнасьць яе захаваецца й надалей.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# смутак

Урывак з раману ў перакладзе Ніны Мацяш

бледны твар, якім ён бываў наранку, прыгадвалася тая прыпаволенасьць, тая шчасьлівая нядбаласьць, якую надавала яе рухам каханьне, і я зайздросьціла ёй. Пацалункі хутка вычэрпваліся, і калі б Цырыль меней кахаў мяне, без сумневу, на тым тыдні я сталася б ягонай каханкай.

А шостай вечара, вяртаючыся з прагулянкі да выспаў, Цырыль выцягваў лодку на пясчаны бераг. Дарога да дому вяла празь ельнік, і, каб сагрэцца, мы выдумлялі гульні ў індзейцаў, бегі навыперадкі. Ён заўжды даганяў мяне непадалёк ад дому, зь пераможнымі воклічамі налятаў на мяне, валіў на ўсыпаны шыпульлем дол, падмінаў пад сябе, цалаваў. Я і цяпер яшчэ помню смак гэтых задыханых, бясплённых пацалункаў і стукат сэрца Цырыля наўпроці майго сэрца ў суладзьдзі з набеганай хваляй… Раз, два, тры, чатыры — і мяккі шоргат па пяску, раз, два, тры… раз: ён аднаўляў дыханьне, пацалункі рабіліся больш упэўненымі, настойлівейшымі, я пераставала чуць плюскат мора, у вушах аддаваліся толькі хуткія, бесьперапынныя поштурхі маёй уласнай крыві.

Аднойчы ўвечары нас разлучыў голас Ан. У ружаватым прыцемку надвячорка Цырыль, напаўаголены, як і я, ляжаў на мне, і, ясная рэч, гэта магло прывесьці ў замяшаньне Ан. Яна рэзка аклікнула мяне па імені.

Цырыль адным скокам падхапіўся на ногі і, само сабой, зьбянтэжыўся. Я таксама ўстала, але ня гэтак пасьпешліва, і паглядзела на Ан. Яна абярнулася да Цырыля і ціха, бы ня бачачы яго, сказала:

— Спадзяюся, я вас больш не пабачу.

Ён не адказаў, нахіліўся да мяне і, перш чым пайсьці, пацалаваў мяне ў плячо. Гэты жэст уразіў і расчуліў мяне, быццам Цырыль даў мне нейкі зарок. Ан пільна глядзела на мяне ўсё з тым жа сур'ёзным і адстароненым выглядам, нібыта яна думала пра нешта іншае. Гэта раззлавала мяне: калі думае пра нешта іншае, магла б і не гаварыць гэткім тонам. Я чыста зь ветлівасьці з удаванай зьбянтэжанасьцю падышла да яе. Яна безуважна зьняла з маёй шыі шыпулінку і толькі як бы цяпер угледзела мяне. І адразу на яе твары зьявілася тая дзівосная пагардлівасьць, той выраз стомы і неадабрэньня, якія так уразьліва ўпрыгожвалі яе і спавадоўвалі маю боязь.

— Вам належалася б ведаць, што падобныя забавы звычайна заканчваюцца клінікай, — сказала яна.

Яна размаўляла са мной стоячы і ня зводзячы зь мяне вачэй, і мне было страшэнна ніякавата. Яна належала да тых жанчын, якія могуць размаўляць, трымаючыся проста і нерухома, а мне заўсёды патрэбна было разваліцца ў крэсьле, пакручваць якую-небудзь рэч, паліць цыгарэту, пагойдваць нагой і глядзець, як яна гайдаецца…

— Ня трэба перабольшваць, — сказала я і ўсьміхнулася. — Я толькі пацалавалася з Цырылем, наўрад ці гэта прывяло б мяне ў клініку…

— Я прашу вас больш зь ім не сустракацца, — сказала яна гэткім тонам, быццам была ўпэўнена, што я хлушу. — Не пярэчце: вам сямнаццаць гадоў, я цяпер у нейкай ступені адказваю за вас і не дапушчу, каб вы псавалі сабе жыцьцё. Дарэчы, вам неабходна займацца, гэта і зойме ваш вольны час папаўдні.

Яна павярнулася да мяне сьпінай і рушыла да дому сваёй нязмушанай хадою. А я быццам прырасла да зямлі. Яна ведала, што гаварыла: усе мае довады, пярэчаньні яна прыме з тым раўнадушшам, якое горшае ад пагарды, гэтак, быццам я папросту не існавала, быццам я ўсяго толькі нейкая рэч, якую трэба паставіць на месца, а ня тая Сэсыль, якую яна ведае адмалку і караць якую ажно гэтак урэшце ёй і самой магло быць балюча. Уся мая надзея была на бацьку. Ён бы сказаў, як заўсёды: «Што гэта за хлопец, кацянятка? Ці хоць прыгожы ён ды здаровы? Асьцерагайся распусьнікаў, дачушка». Ён павінен быў сказаць нейк гэтак, інакш бывайце, мае вакацыі.

Вячэра прайшла як у кашмарным сьне. Ан і ў галаву не прыйшло прапанаваць мне: «Я ня стану нічога расказваць бацьку, я не падшаптуха, але вы павінны паабяцаць мне, што будзеце старанна займацца». Падобныя разрахункі былі ёй чужыя. Я і радавалася, і злавалася на яе за гэта, бо ў процілеглым выпадку ў мяне была б прычына пагарджаць ёю. Яна не зрабіла такой пахібкі, як і ўсіх іншых, і толькі калі падалі другую страву, як бы зьнячэўку ўзгадала пра здарэньне.

— Рэймон, мне хацелася б, каб вы далі сякія-такія разумныя парады вашай дачцэ. Сёньня падвечар я выпадкова засьпела яе ў ельніку з Цырылем, і выглядае на тое, што іхнія ўзаеміны задужа блізкія.

Бацька, бедненькі, паспрабаваў аджартавацца.

— Ая-я-яй, што я чую! І чым жа яны там займаліся?

— Я цалавала яго! — з жарам выгукнула я. — А Ан падумала…

— Я нічога не падумала, — адсекла яна. — Але мяркую, што ёй лепш нейкі час не сустракацца зь ім, а крыху падвучыць філязофію.

— Беднае маё дзіця… — сказаў бацька. — Спадзяюся, ён хоць харошы, твой Цырыль?

— Сэсыль таксама харашуха, — сказала Ан. — Вось чаму я была б вельмі засмучана, калі б зь ёю што здарылася. А пры гэтай поўнай волі, якую яна тут мае, ды ў вечным таварыстве гэтага хлопца, якому няма чаго рабіць, бяды, па-мойму, не пазьбегнуць. А вы ў гэтым сумняваецеся?

Пачуўшы гэтае «А вы ў гэтым сумняваецеся?», я ўзьняла вочы на бацьку, але ён, дарэшты зьбянтэжаны, угнуў галаву,

— Вы, безумоўна, маеце рацыю, — сказаў ён. — Сапраўды, табе трэба было б трошкі пазаймацца, Сэсыль. Ты ж ня хочаш праваліцца па філязофіі?

— Мне ўсё роўна! — буркнула я.

Ён глянуў на мяне і зразу ж адвёў вочы. Гэта была мая поўная параза. Я разумела, што бесклапотнасьць — адзінае пачуцьцё, якое было зьместам нашага жыцьця, — не валодала аргумэнтамі дзеля самаабароны.

— Ну вось што, — сказала Ан, злавіўшы маю руку над сталом, — вы адмовіцеся ад вашай ролі лясной дзікункі дзеля ролі ўзорнай вучаніцы, але ўсяго толькі на адзін месяц, толькі на месяц, гэта ж зусім ня страшна, праўда?

Яна і ён глядзелі на мяне з усьмешкай: у гэтых варунках спрачацца было бескарысна. Я асьцярожна вызваліла руку:

— Не, — сказала я, — нават вельмі страшна.

Я сказала гэта так ціха, што яны не пачулі, а магчыма, не захацелі пачуць. Наступным ранкам я сядзела над фразай Бэргсана; мне спатрэбілася некалькі хвілін, каб зразумець яе: «Як бы разнародна ні выглядалі на першы погляд факты і іх прычыны, і хоць па правілах паводзінаў нельга зьмяркаваць пра сутнасьць рэчаў, мы заўсёды чэрпаем сілы дзеля любові да чалавецтва толькі зь непарыўнай сувязі з зыходным прынцыпам чалавечага роду». Я паўтарала і паўтарала гэтую фразу, спачатку паціху, потым уголас. Я ўважліва ўзіралася ў яе, ашчаперыўшы галаву рукамі. Нарэшце, я яе зразумела, але адчула сябе гэткай жа халоднай і бездапаможнай, як калі прачытала яе ў першы раз. Прадаўжаць я не магла: я ўзіралася ў наступныя радкі зранейшай стараннасьцю і гатоўнасьцю, і тут раптам бы нейкі віхор узьвіўся ўва мне і шпурнуў мяне на ложак. Я падумала пра Цырыля, які чакаў мяне ў залацістай затоцы, пра мяккае пагойдваньне лодкі, пра смак нашых пацалункаў і — пра Ан. Падумала пра яе гэтак, што ажно села на ложку з моцным стукатам сэрца, даводзячы сабе, што гэта глупотна і пачварна, што я папросту лянівае і сьпешчанае дзяўчо і не павінна дазваляць сабе думаць гэтак. Але проці маёй волі мне лезьлі ў галаву думкі, думкі пра тое, што яна шкодная і небясьпечная, і што яе трэба прыбраць з нашай дарогі. Я ўзгадала сьнеданьне, якое толькі што адбылося і цягам якога я не растуліла вуснаў. Уболеная, прымернелая ад крыўды, адчуваючы, што я брыджуся самой сябе, што мае пераржываньні смешныя… Так, менавіта ў гэтым я і зьвінавачвала Ан: яна замінала мне любіць саму сябе. Ад прыроды створаная дзеля шчасьця, уцехі, бесклапотнасьці, я праз яе ўступала ў сьвет згрызот і нячыстага сумленьня і, ня звыклая да самааналізу, безнадзейна заблудзілася ў ім. А што яна магла прапанаваць мне наўзамен? Я ўзважвала яе сілу: захацела займець майго бацьку — і займела; яшчэ трошкі — і яна пераробіць нас у мужа і падчарку Ан Лярсан.То бок у цывілізаваных, добра выхаваных і шчасьлівых людзей. А яна і насамрэч магла даць нам шчасьце: я прадчувала, зь якой лёгкасьцю нашы мянлівыя натуры паддадуцца спакусе апынуцца ў пэўных рамках і скласьці зь сябе ўсякую адказнасьць. Яна мела занадта моцны ўплыў на нас. Я ўжо страчвала бацьку: яго зьбянтэжаны, адвернуты ад мяне твар за сталом мучыў, перасьледаваў мяне. Я амаль са сьлязьмі ўспамінала пра наша ранейшае хаўрусаваньне, пра тое, як мы сьмяяліся, вяртаючыся пад ранак у машыне па сьвітальных вуліцах Парыжу. Усяму гэтаму настаў канец. Ан і мяне прыбярэ да рук, будзе круціць і распараджацца мною. І я нават не адчую сябе няшчаснай: яна будзе дзейнічаць разумна, з дапамогай іроніі ды ласкі, і я не змагу, а праз паўгоду ўжо нават і не захачу ёй супраціўляцца.

Не, я павінна была страпянуцца, вярнуць бацьку і наша ранейшае жыцьцё. Якімі вабнотнымі падаліся мне раптам два прамінулыя гады, вясёлыя і блажныя, гэтыя два гады, ад якіх зусім нядаўна я гатовая была адрачыся… Мець права думаць што хочаш, думаць блага або наагул амаль ня думаць, права жыць, як табе падабаецца, быць такой, як табе падабаецца. Не магу сказаць «быць самой сабой», таму што я ўсяго толькі падатлівая гліна, але мець права адпрэчваць навязаную табе форму.

Я разумею, што перамену майго настрою можна растлумачыць складанымі матывамі, што можна прыпісаць мне велягурыстыя комплексы — казіродную любоў да бацькі або хваравітую жарсьць да Ан. Але ж я ведаю рэальныя прычыны: сьпёка, Бэргсан, Цырыль ці, прынамсі, адсутнасьць Цырыля. Да самага вечара я разважала пра гэта, зьведала ўсе ступені цяжкага настрою, спавадаванага адным адкрыцьцем: што мы ва ўладзе Ан. Я не прывыкла да доўгіх роздумаў, гэта раздражняла мяне. За сталом, як і раніцай, я не растульвала рота. Бацька адчуў сябе абавязаным пажартаваць:

— Люблю моладзь за жвавасьць і гаманлівасьць.

Я працяла яго вострым, бязьлітасным позіркам. Што праўда, то праўда, ён любіў моладзь, і з кім жа, як ня зь ім, я балбатала? Мы балбаталі пра ўсё: пра каханьне, пра сьмерць, пра музыку. Але ён пакінуў мяне, ён сам мяне абяззброіў. Я глядзела на яго і думала: «Ты ўжо ня любіш мяне так, як раней, ты здраджваеш мне». Я спрабавала бяз слоў давесьці гэта да ягонага ведама: я перажывала самую сапраўдную драму. Ён таксама паглядзеў на мяне і раптам занепакоіўся, магчыма, зразумеўшы, што гэта ўжо не гульня і што наша згода ў небясьпецы. Ён зьнерухомеў у нямой запытальнасьці. Ан павярнулася да мяне:

— Вы кепска выглядаеце, я ўжо шкадую, што прымусіла вас займацца.

Я не адказала, я замоцна ненавідзела саму сябе за тое, што раздзьмухваю драматычны канфлікт, але спыніцца ўжо не магла. Мы павячэралі. На тэрасе, у сьветлым прастакутніку, створаным акном сталовай, я ўбачыла, як рука Ан, тонкая, тропатная рука хіснулася, знайшла руку бацькі. Я падумала пра Цырыля, мне хацелася, каб ён прыхінуў мяне да сябе на гэтай тэрасе, поўнай цыкадаў і месяцовага сьвятла. Мне хацелася, каб мяне прылашчылі, суцешылі, памірылі з самой сабою. Бацька і Ан маўчалі: у іх наперадзе была ноч любові, а ў мяне — Бэргсан. Я паспрабавала заплакаць, пашкадаваць саму сябе, але марна. Я ўжо шкадавала не сябе, а Ан, быццам ужо загодзь ведала, што перамога будзе мая.

**Пераклад з францускай**

Аляксандар Ворвуль



# Слоўнік скептыка

**Даброты** — нешта незаконнае, альбо амаральнае, альбо вядзе да атлусьценьня.

**Даішнік** — чалавек, які ня можа спакойна глядзець «Формулу-1».

**Далікатнасьць** — розьніца паміж тым, што вы кажаце, і тым, што вы хочаце сказаць.

**Дальтонік** — чалавек, які мае права пераходзіць вуліцу як на зялёнае, так і на чырвонае сьвятло.

**Дамова** — пагадненьне, якое выконвае той, у каго меней гармат.

**Дамова пісьмовая** — сьпіс прычын, зь якіх бакі не давяраюць адзін адному.

**Дапамога гуманітарная** — грошы, якія бяруцца ў бедных багатай краіны і аддаюцца багатым у беднай.

**Дараваньне** — крыўда ў стане пагарды.

**Дарвін** — чалавек, які растлумачыў прычыну нашых ідыёцкіх учынкаў.

**Даросласьць** — гэта калі памперсы пачынаюць ціснуць сьпераду.

**Дасьведчанасьць** — тое, што замінае атрымаць ранейшую асалоду ад таго самага глупства.

**Дасканаласьць** — чалавек падчас запаўненьня анкеты на працу.

**Дасьледаваньне** — плягіят многіх аўтараў.

**Джэнтльмэн** — аслабелы донжуан.

**Дзень сьвятога Валянціна** — ноч Івана Купалы для дзяцей і падлеткаў.

**Дзеўчына** — істота, якая сьмяецца, калі можа, і плача, калі хоча.

**Дзіцё** — працэнт па ўкладзе ў банк спэрмы.

**Дзіцё сумленнае** — дзіцё, якое любіць ня тату з мамай, а трубачкі з крэмам.

**Дзяцінства** — час, калі кашмары прыходзяць толькі ў сьне.

**Дойлідства** — гэта калі зрабіць рукамі прасьцей, чым сказаць словамі.

**Досьвед жыцьцёвы** — маса ведаў пра тое, як ня трэба сябе весьці ў сытуацыях, якія ўжо не паўторацца.

**Дрэннае** — добра забытае добрае.

**Дылетант** — чалавек, які атрымлівае асалоду ад таго, чаго рабіць ня ўмее.

Дылетантызм — тармазная вадкасьць прагрэсу.

**Дыпляматыя** — мастацтва паўтараць «добры сабачка», пакуль ня знойдзеш палку.

**Дыспэтчэр** — чалавек, які сядае тады, калі не сядае самалёт.

**Дыханьне штучнае** — дыханьне, почасту неабходнае пасьля адкрыцьця другога дыханьня.

**Дэмакрат** — дэманстрацыйная вэрсія бюракрата.

**Дэмакратыя** — гарантыя таго, што кіраваць вамі будуць ня лепей, чым вы таго заслугоўваеце.

**Дэмакратыя з элемэнтамі дыктатуры** — запор з элемэнтамі паносу.

**Д'ябал** — аптыміст, які лічыць, што можа зрабіць людзей яшчэ горшымі.

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Януковіч як беларус

**Беларуская дамінанта на постсавецкай прасторы дасягнула зэніту. Лукашэнка — беларус, Пуцін — зь Піцеру, дзе папулярная прымаўка «Пскоўскія і віцебскія — самыя піцерскія». Януковіч, патэнцыйны прэзыдэнт Украіны, па бацьку — таксама бульбаш.**

У вядомым лісьце ўкраінскіх пісьменьнікаў супраць наданьня расейскай мове ва Ўкраіне дзяржаўнага статусу факт наяўнасьці ў Януковіча беларускіх каранёў (нагадаю, яго дзед зь вескі Янукі з-пад Віцебску) трактуецца як нейкая ўнутраная, амаль генная ўстаноўка на канкрэтныя палітычныя мэтады, галоўным чынам аўтарытарныя. Сам Януковіч наконт сваёй пятай графы ні гу-гу, урадавым СМІ забаронена цытаваць словы Лукашэнкі, што Януковіч «ваабшчэ беларус».

Пэрспэктыва атрымаць ня толькі брата па розуме, але яшчэ і па крыві выглядае для афіцыйнага Менску шматабяцальнай. Самае цікавае, што патэнцыйнае абразаньне Януковіча ў крывічы надае беларускай ідэі новае гучаньне: яна робіцца часткай данецкай. Гістарычна нацыянальная ідэя «данецкіх», або «донаў», швэндалася ў трохкутніку папулярных пэрсанажаў — пасьпяховага прамысłоўца Джона Юза (заснавальніка Юзаўкі-Данецку), шахцёра Стаханава з шахты імя Засядзькі, дзе што ні дзень — аварыя, і, для самых прасунутых, рамантычнага паэта Ўладзімера Сасюры, аўтара нацыяналістычнага шэдэўру «Любіце Ўкраіну». Апошнім часам усіх іх зацьміў вобраз капо мясцовай «коза ностры» — Рыната Ахметава.

Пахан зь берагоў Кальміюсу вырашыў зрабіць з Данецку другую сталіцу Ўкраіны і ў пэрспэктыве нават сьвету. У філязофскім пляне ідэя неабходнасьці новага Рыму падносіцца як рэвізія трагічнай памылкі Пятра Першага, які замест Таганрогу зрабіў сталіцай горад на Няве. Для рэалізацыі сваёй мэты Ахметаў не шкадуе тугрыкаў — гл. склад данецкага «Шахцёра». Зь беларусам Януковічам, які фармальна ўзначальвае групоўку, місія «донаў» аўтаматычна набывае беларускі акцэнт. Рэгіянальны імідж данецкіх (як «гарна» выказаўся адзін украінскі журналіст — «Саюз нажа і адбойнага малатка») цяпер стане іміджам беларусаў. І даўно трэба, а то задаўбаў гэты вобраз лаханутага «пана сахі і касы».

Паняў?!

**Лёлік Ушкін**

КАІСА

# Шурпатыя «Шахматы»

«Шахматы», №3, 2004.

Цягам году ў Менску на беларускай і расейскай мовах выдаецца часопіс «Шахматы». Пачыналася ўсё з парыэтэту дзьвюх моў. У першых трох нумарах 2004 г. беларускую скарыстоўваюць як тую тэхнічку — для афармленьня выпускных зьвестак… Матэрыялы ж друкуюцца ўсьцяж па-расейску. Апошнім часам гэта тлумачыцца неабходнасьцю распаўсюдзіць наклад часопісу за мяжой, бо ў Беларусі яго нібыта мала хто купляе.

Зьмест няроўны. Цікавыя рэпартажы шахматыстаў з замежных спаборніцтваў — і побач разлогія матэрыялы, спампаваныя з шахматных сайтаў. Што да рэдактарскага стылю, яго лепш чым што перадае выраз «Топалов рвал всех под ноль».

Друкуецца багата вострых партый з камэнтарамі — вылучаючца опусы чэмпіёнкі Беларусі сярод дзяўчат Алены Клімец, віцебскага гросмайстра Андрэя Кавалёва. Традыцыйнымі засталіся гістарычныя нарысы Абрама Ройзмана ды займальныя рэфлексіі менскага трэнэра Рыгора Хаюціна пра «паводзіны» шахматных фігур.

Наклад часопісу (350 асобнікаў, а летась быў жа 700) і шурпатая стылістыка набліжаюць яго да самвыдату. Нават пасаж пра «абавязковага супрацоўніка КДБ — дарэчы, вельмі добрага хлопца з фотаапаратам, дзякуючы якому захавалася мноства здымкаў», — які суправаджаў беларускіх шахматыстаў у Польшчы ў 1958 г., успрымаецца з доляй жарту. Затое ў тым самым артыкуле чытач натрапіць на незвычайны эпізод. Аказваецца, кіраўнік шахматнай фэдэрацыі БССР Гаўрыла Верасаў дабіваўся ўдзелу нашай каманды ў Сусьветнай шахматнай алімпіядзе асобна ад савецкай зборнай. Спасылаўся на тое, што Беларусь уваходзіць у ААН, таму — чым яна горшая ў вачох ФІДЭ?

Пасьля зьнікненьня шахматнага дадатку да «Спартовай панорамы» і спыненьня выхаду незалежных «Шахмат-плюс» «Шахматы» робяцца асабліва каштоўным для кріаны выданьнем.

**ВР**

## Як бы вы згулялі?

**М.Кліза — А.Таірава, Менск, 2004 (мэмарыял Верасава).**

**Ход чорных. Як ім падабраць ключы да фартэцыі белага караля?**



Адказ: 1...Се3! (някепска і 1...Сh4) 2. Кс3 Сf2+ 3. Крh1 Кg3+ 4. Крh2 Сg1+ 5. Крg3 Фe3+ і мат.

КРЫЖАВАНКА



**Па гарызанталі:**
**1.** Сто наркамаўскіх пяцігодак. **8.** Маленькая Роза. **9.** Палова небясьпечнай мухі. **10.** Самы жаночы грыб. **11.** Сьнегіры — ня гіры, гэтыя жывёлы — ня сукі. **12.** Апошняя коўдра. **13.** Мудры сябра Маўглі. **14.** Каровін гук. **15.** Атмасфэрны паказьнік галаўнога болю. **16.** Драўляная скура. **18.** Састарэлая літара. **19.** Выспа-адчуваньне. **20.** Прэзыдэнт дзікага племені. **21.** Філязофскі сыпеў. **22.** Японскія шашкі. **24.** Братэрская лямпа. **25.** Заўсёдны вораг мушкецёра. **26.** Абяцаньні кандыдатаў на пасаду. **27.** Паліва для чалавека. **28.** Лайдак на канапе. **29.** Нямецкая вяроўка.

**Па вэртыкалі:**
**1.** Няпростая шырыня (з 1933 г.). **2.** Казахскі, туркмэнскі і ўзбэцкі. **3.** Верш да прэзыдэнта. **4.** Падарунак зьверху. **5.** Тэчка шпіёна. **6.** Расьпілаваны працяжнік. **7.** Прафэсіянал выпіць на халяву. **11.** Сьмешны дзед з Калыханкі. **13.** Вясёлы аповед на сцэне. **16.** Ня наша вайсковае званьне. **17.** Дапросны аркуш. **20.** Агародны зьмяюка. **23.** Шырокая беларуская рыбіна. **25.** Футбольная мэта.

Склаў
**Алесь Крыжанец**



**7 лістапада**

**«Белавеская пушча—Камянец—Ружаны»**

Камянец—Камянецкая Вежа—Сіміяонаўская царква—Белавеская пушча—Музэй прыроды Белавескай пушчы, вальеры—Ружаны.
Кошт вандроўкі: 30000
Т.: 222-88-76

**Шукаю аднадумцаў**
для ўтварэньня беларускага турыстычнага клюбу.
btclub@tut.by

РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар» дзякуе спадарыні N. зь Менску за 500 тысяч рублёў, ахвяраваных на помнік Васілю Быкаву.

**30** кастрычніка



**Мір—Навагрудак**

Раніцай 30 кастрычніка мы запрашаем Вас у **лягер рыцараў**, дзе Вы зможаце ўбачыць двубоі і адчуць сябе вяаром ці чароўнай пані.
**Навагрудак**, дзе на працягу стагодзьдзяў жылі людзі розных веравызнаньняў.
Увечары 30 кастрычніка запрашаем на **габрэйскае сьвята** провадаў суботы, дзе Вы дакранецеся да тысячагадовае габрэйскае традыцыі.
Самыя цікавыя і таемныя скарбы былое сталіцы Вялікага Княства.
Кошт вандроўкі: 35000.
Т.: 222-88-76.

**Запрашаем у падарожжа**

**31 кастрычніка** (нядзеля)
**Полацак—Лагойск.** Цана 20000 руб.

**7 лістапада** (нядзеля)
па маршруце: **Нарач—Паставы—Камаі—Дунілавічы—Лучай—Глыбокае.**
Цана 20000 руб.
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38, 776-24-35 (Павал).

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ВІТАНЬНІ**

**Вольгу і Зьмітра Салошкіных** віншуем з нараджэньнем сына Якуба. Хай расьце волатам на ўсю Беларусь, мудрацом на ўвесь сьвет, цешыць дзядоў і дапамагае бацькам. Сябры

**Брата Аляксандра** і яго жоначку Тацяну шчыра віншую з нараджэньнем дачушкі Настасьсі. Зычу шчасьцейка, здароўечка і рознага іншага дабра (і паболей). Балахонаў

**Віншуем Болачку** з Днем народзінаў. Моцы ў вучобе, упартасьці ў жыцьці! Сябры

**КАНТАКТЫ**

**Студэнтка 5-га курсу** БДУК «Рэжысура фальклёрнага тэатру» шукае месца для пастаноўкі дыплёмнага спэктаклю «Сьвята восеньскага раўнадзенства». Т.: 8-029-761-98-51. Галіна

**Неадкладна** здыму пакой на доўгі тэрмін. Тэлефануйце, калі ласка. Т.: 231-54-63, акрамя суботы і нядзелі. Сумленная дзяўчына Алена

**Пачатак сьв.Літургіі** ў нью-ёрскім катэдральным саборы Сьв.Кірылы Тураўскага кожнае нядзелі а 10-й гадзіне раніцы. Сьвяты ў тыдні, калі не абвешчана інакш, ушаноўваюцца ў найбліжэйшыя нядзелі. Перад пачаткам сьв.Літургіі можна пайсьці да споведзі ці падаць успомныя лісткі за здароўе жывых або супакой прамерлых. Адрас: 401 Atlantic Ave., Brooklyn, N.Y. 11217 (рог Bond Street). Тэл./факс: N.Y. (718) 875-0595, N.J (732) 868-1589. Праезд падземкай цягнікамі «A», «C», «G» да прыпынку «Hoyt-Schermerhorn»

**Праўныя парады** ў эміграцыйных, падатковых ды іншых юрыдычных справах можна атрымаць ад прадстаўніцы адвакацкае фірмы «Pre-Paid Legal Services, Inc» спн. Зоі Вашкевіч па тэлефоне (718) 436-0772 або асабіста ў нядзелю пасьля адправы ў саборы Сьв.Кірылы Тураўскага

**КНІГІ**

**Новыя нумары** «Arche», «Звод помнікаў гісторыі і культуры Беларусі (Берасьцейшчына)», «Лексычны атляс беларускіх народных гаворак» (т.3, 5), «Беларуска-расейскі слоўнік» Байкова і Некрашэвіча, «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі» (т.2, 6, 7), «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» (т.13, 15, 18, 19), іншыя кнігі, відэа, аўдыё, CD, значкі, майкі на Румянцава, 13 (ТБМ) з панядзелка па пятніцу (12.00—18.30). Т.: 8-029-707-40-01

**Кнігаабмен**. Дапамагу знайсьці патрэбную кнігу. Т.: 8-029-753-91-96

**Прадам** CD: «NRM»: «Spravazdača» (з аўтографам Вольскага); «Ulis»: «Падарожжа»; «Стары Ольса»: «Шлях»; «Partyzone»: «Трэба рабіць». Т.:8-029-509-18-23 (Зьміцер)

**Прадаю** CD: «Partyzone»: «Трэба рабіць», «Генэралы айчыннага року». Т.: 8-029-509-18-23, Зьміцер

**ПРАЦА**

**Кіраўнік** фальклёрнага гуртка шукае працу пасьля 14 гадзін. Т.: 8-029-761-98-51. Галіна

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72. Юры

**Ангельская мова:** рэпэтытарства, кантрольныя й пераклады. Зьвяртайцеся на тэл: 216-81-76, 8-029-65-46-07. Раман (МДЛУ, 4 курс)

**Шукаюцца** распаўсюднікі беларускай музычнай прадукцыі (дыскі, касэты, плякаты, значкі, саколкі). Зьвяртайцеся: 241-24-74, 766-24-25; а/с 5, 220085, Менск

**УДАЎ**

**Удава** калюмбійскага (даўжыня 2,5 м, непатрабавальны ў гадаваньні) прадаю. Т.: 274-89-46

**Перадкалядны распродаж кніг:**

Ян Станкевіч. Збор твораў у двух тамох. Т.1 552 с. Т.2. 588 с. Цана 8 тыс. руб.
Ян Станкевіч. Гістарычныя творы. 776 с., цьвёрдая вокладка. 7 тыс. руб.
Андрэй Котлярчук. Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў. 274 с., цьвёрдая вокладка. 2 тыс. руб.
Быць альбо ня быць сярэднеэўрапейцам. Сучаснае польскае мысьленьне. 472 с. 1 тыс. руб.
Беларуска-расейская інтэграцыя. Аналітычныя артыкулы. 424 с. 2 тыс. руб.
Паліталёгія. Асноўны курс. Пер. зь ням. 680 с. 3 тыс. руб.
Мясцовыя выбары ў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі. 296 с. 1 тыс. руб.
**Прапанова дзейнічае да 31 сьнежня.**
Тэлефон (029) 643-57-33, e-mail exlibris@tut.by, паштовы адрас Менск, 220050, п/с 333.

НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Сяргею Б. з Гомеля.** Другой рэцэнзіі на «Музыку-2» ставіць ня будзем.

**Сержуку Г. з Магілёва.** Адну з частак Вашага ліста надрукаваць ня можам. Распаўсюджвайце яе ў выглядзе ўлётак.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, аднаўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| карэктарка | Настасься Мацяш |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам A2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3509. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 27.10.2004.
Замова № 6584.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а